

Л.Г. Дуктава

# Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы XX ст.

Магілёў 2009

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
" МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
імя. А.А. КУЛЯШОВА"

Л.Г. Дуктава

# МАСТАЦКАЯ АНІМАЛІСТЫКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX ст.

МАНАГРАФІЯ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 83.3 (4 Бел)
ББК 821.161.3.09
Д81

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета МДУ імя А.А. Куляшова*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ
*А.І. Бельскі;*
доктар філалагічных навук
*І.В. Саверчанка*

*У мастацкім афармленні выкарыстаны работы А. Азярэц "Першабытнасць", В. Ярош "Каты".*

**Дуктава, Л.Г.**
Д81 Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы XX ст.: манаграфія / Л.Г. Дуктава. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. – 184 с.: іл.

ISBN 978-985-480-546-7

У манаграфіі вызначаны ідэйна-мастацкая роля і значнасць мастацкай анімалістыкі другой паловы XX стагоддзя, выяўлены заканамернасці выкарыстання найбольш распаўсюджаных анімалістычных вобразаў і матываў, разгледжаны іх гістарычна-культурны змест на аснове паглыблення ў міфапаэтычную сутнасць мастацкага мыслення.

Разлічана на літаратуразнаўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў філалагічных факультэтаў, настаўнікаў сярэдніх школ.

**УДК 83.3 (4 Бел)**
**ББК 821.161.3.09**

**ISBN 978-985-480-546-7**

© Дуктава Л.Г., 2009
© УА «МДУ імя А.А. Куляшова», 2009

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# УВОДЗІНЫ

У сучасным айчынным літаратуразнаўстве ўсё часцей ужываюцца тэрміны "анімалізм", "анімалістыка" (ад лац. animal – жывёла). Пры іх выкарыстанні маецца на ўвазе алегарычнае суаднясенне чалавека і жывёлы. Гаворачы пра мастацкае ўвасабленне анімалістычных вобразаў, даследчыкі адзначаюць "прывязанасць" да фальклору, літаратурна-кніжных традыцый, творчае засваенне вопыту сусветнай культуры.

У літаратуры прырода выконвае надзвычай важную эстэтычную функцыю. Яе вобразы раскрываюць светабачанне чалавека, які глыбей узіраецца ў прыродныя таямніцы, каб найперш зразумець самога сябе. З цягам часу, як бы ні мяняліся ўзаемаадносіны грамадства і прыроды, заўсёды адчувалася ўзаемасувязь чалавека са светам фауны.

Анімалістычныя вобразы шырока адлюстраваны ў фальклорных творах усходніх славян: у легендах, валачобных, купальскіх, вясельных песнях, казках, баладах, замовах, пахавальных галашэннях і г. д. Цэлы калейдаскоп вобразаў фауны прадстаўлены ў лепшых помніках старажытнай літаратуры, дзе анімалістычныя матывы звязаны з пейзажам, побытам людзей (напрыклад, "Песня пра зубра" М. Гусоўскага).

Жывёльны эпас бярэ пачатак з казак пра жывёл, у сюжэтах якіх пры дапамозе анімалістычных вобразаў паказаны ўчынкі людзей, іх паводзіны, характары. У казачным эпасе склалася асноўная тыпалогія анімалістычных вобразаў (воўк дурны, самаўпэўнены: "Святы воўк", "П'яны воўк", "Бык і ваўкі", "Лісічка-сястрычка і воўк"; ліса хітрая: "Пра мужыка і лісу", "Лісіца і жораў", "Як ліска мядзведзя са свету зжыла", "Ліса-каталічка"; мядзведзь нязграбны, непаваротлівы: "Мядзведзь на возе"; кот мудры, прадбачлівы: "Коцік з пеўнем і ліска", "Воўк, стары сабака і кот"; певень шчыры: "Ледзяная і лубяная хатка" і г. д.), якая атрымала далейшае развіццё ў мастацкай літаратуры, у першую чаргу, у байках (напрыклад, "Ястраб, лісіца і певень" (1913), "Груган і салавей" (1914) Я. Купалы, "Варона і чыж" (1915) М. Багдановіча і інш.).

Трэба адзначыць, што ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя назіраецца тэндэнцыя да выкарыстання анімалістычных вобразаў. Найбольш часта яны сустракаюцца ў творах на экалагічную тэму, якая ў беларускай літаратуры абазначанага перыяду стаіць побач з чарнобыльскай (аповесць "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько, апавяданне "Львы" І. Пташнікава, вершы "Вячэрняя малітва", "Белы конь" А. Пісьмянкова, верш "Тыя коні не пасвяцца ў травах ружовых", паэма "Чорная быль" С. Законнікава, вершы "Жураўлі", "Пчала", "Ластаўкі" М. Мятліцкага, паэма "Одзіум" Я. Сіпакова, апавяданне "Эвакуацыя" Н. Рыбік і інш.).

У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя шмат твораў, у якіх галоўнымі героямі выступаюць прадстаўнікі фауны. Менавіта на гэтых творах засяроджваюць увагу беларускія крытыкі. Сучасная мастацкая анімалістыка вылучаецца сваім сацыяльным зместам, актуальнай экалагічнай і гуманістычнай накіраванасцю. Творы пра жывёл сведчаць пра якасна новыя ідэйна-творчыя пошукі беларускіх пісьменнікаў. На першы план у сучаснай літаратуры выходзіць адлюстраванне і апісанне не прыгажосці

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жывёльнага свету, а цяжкасцей існавання ўсяго жывога. Паколькі сучасныя пісьменнікі імкнуцца да глыбокага асэнсавання праблем існавання, выжывання жывёльнага свету, то гэта вымагае ад іх (пісьменнікаў) адпаведнага мастацкага ракурсу.

Такім чынам, складваецца разгалінаваная сістэма выяўленчых спосабаў і сродкаў у адлюстраванні жыцця фауны. Мастацкі матэрыял на анімалістычную тэму патрабуе класіфікацыі, літаратуразнаўчай характарыстыкі, філасофска-культуралагічнай заглыбленасці думкі.

Тэрміны "анімалізм", "анімалістыка" выкарыстоўваюць даследчыкі розных дысцыплін.

Па-першае, вучоныя разглядаюць анімалізм як сукупнасць рэлігійных вераванняў і абрадаў, што звязаны з шанаваннем жывёл[1]. Разнастайныя аспекты азначанай навуковай праблемы закраналі як замежныя, так і айчынныя даследчыкі: гісторыкі (А. Гурэвіч, Б. Рыбакоў і інш.), рэлігіязнаўцы (Дж. Фрэзер, С. Токараў і інш.), археолагі (Ю. Шылаў, Б. Фралоў і інш.), псіхолагі (З.Фрэйд, К. Юнг і інш.), этнографы і фалькларысты (А. Афанасьеў, М. Нікольскі, У. Проп, Я. Меляцінскі, А. Баргановіч, М. Нікіфароўскі, А.Сержпутоўскі, А. Ненадавец, І. Крук і інш.), лінгвісты (А. Патабня, Н.Талстой, С.Талстая, В. Маслава і інш.).



Мал. 1. Паляванне на быка. X тысячагоддзе да н. э. Наскальны жывапіс

Па-другое, у мастацтвазнаўстве тэрміны "анімалізм"[2], "анімалістыка", якія разглядаюцца як сінанімічныя тэрміну "анімалістычны жанр", доўгі час выкары-

[1]Іншая назва анімалізму ў гэтым ракурсе – зоалатрыя [Токарев, С.А. Зоолатрия, анимализм / С.А. Токарев // Краткий научно-атеистический словарь / Г.Л. Андреев, А.И. Ардабьев, С.А. Арутюнов [и др.]. – М.: Наука, 1969. – С. 263 – 264].

[2]Упершыню тэрмін "анімалізм" у дачыненні да мастацтва быў выкарыстаны ў адносінах да скульптуры ў 1831 г., калі тры маладыя французскія скульптары Антуан Луі Бары, Хрыстаф Фратэн і Аляксандр Жуйанэ зрабілі выставу фігурак жывёл у Парыжскім мастацкім салоне.

стоўваюцца для характарыстыкі твораў скульптуры, графікі, жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з вывамі жывёл[3]. Семантыка гэтага тэрміна заключаецца ў тым, што ў цэнтры ўвагі мастака знаходзяцца прадстаўнікі фауны. "Мастак-анімаліст надае асноўную ўвагу мастацка-вобразнай характарыстыцы жывёлы, яе звычкам, асяродку, у якім яна існуе"[4]. Трэба таксама заўважыць, што ў выяўленчым мастацтве ў межах анімалістычнага жанру розныя майстры вылучалі сваё кола тэм. Напрыклад, тэма каня з'яўляецца вядучай у творчасці жывапісца М. Свярчкова і скульптара П. Клодта, маўпа адлюстравана ў шэрагу работ В. Ватагіна, карова і авечка знайшлі сваё месца на палотнах Г. Цюгеля, Ф. Марка, Ф. Гойя-і-Лусіентэса, Д. Фатторы, птушкі – адзін з распаўсюджаных вобразаў у работах А. Дзюрэра, Шарля-Франсуа Дабіньі, Касусіка Хакасая, леў прэзентаваны ў шматлікіх работах Дэлакруа, Рэмбранта.



Мал.2. Шымпанзэ Пеця, 1930. В. Ватагін

[3]Першыя выявы жывёл можна прасачыць у наскальным жывапісе палеаліта, яны сведчаць пра вострую назіральнасць мастакоў-паляўнічых. Аналізу першабытных выяў жывёл, даследаванню прычын іх з'яўлення прысвяцілі свае працы Б. Фралоў [Фролов, Б.А. Мотивы первобытного анималистического творчества / Б.А. Фролов // Звери в камне (Первобытное искусство). – Новосибирск: Наука, 1979. – С. 36 – 47], І. Кірылаў [Кирилов, И.И. Предметы изобразительного искусства палеолитического поселения Сохатино IV (Титовская сопка) / И.И. Кирилов // Звери в камне (Первобытное искусство). – Новосибирск: Наука, 1979. – С. 247 – 252] і інш. Наконт ранніх форм мастацтва даследчыца Т. Шамякіна адзначае: "Галоўная праца ў той час – паляванне на жывёлаў. Людзі палеаліту верылі ў існаванне таемных сувязяў паміж чалавекам і жывёлай, а таксама ў магчымасць уздзеяння на жывёлаў з дапамогай магіі. Першыя малюнкі, спевы ды танцы мелі выключна магічны характар. Гэта быў сродак магічнага змянення свету, рэпетыцыя палявання – на духоўным узроўні. Увогуле ёсць думка, што старажытны чалавек праяўляў сябе хутчэй як шукальнік сэнсу, творца мрояў, чым чалавек дзеяння. <...> Пошук сэнсу штурхаў да пазнання – той жа жывёлы. Так узніклі малюнкі старажытных людзей, якія з пэўным правам можна назваць шэдэўрамі сусветнага мастацтва" [Шамякіна, Т. Раннія формы мастацтва / Т. Шамякіна // Родн. слова. – 1996. – № 9. – С. 166 – 167].

[4]Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / рэдкал.: А.Я. Баханькоў і інш.– Мінск: БелСЭ, 1977. – Т. 1: А – В. – С. 119.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Найбольш вядомыя мастакі анімалістычнага жанру ў беларускім выяўленчым мастацтве XIX – XX ст. – гэта С. Богуш-Сестранцэвіч[5], В. Ціхановіч (жывапісныя палотны "Нехта ідзе", "Вячэрні канцэрт", ілюстрацыі да кніг для дзяцей "Беларускія народныя казкі" і інш.), Г. Лойка (графічныя работы "Тыгры", "Леў", "Совы", "Рысі", "Кунічкі" і інш.), М. Беляніцкі (серыя жывапісных работ "Белавежская пушча"[6]).



Мал 3. Рысакі. XIX – пачатак XX стст. С. Богуш-Сестранцэвіч

[5]Як мастак-анімаліст С. Богуш-Сестранцэвіч праявіў сябе яшчэ падчас навучання ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1889 – 1894). У 1890 г. ён атрымаў малы сярэбраны медаль за эцюд каня. Даследчык У. Рынкевіч адзначае: "Асобна трэба падкрэсліць здольнасці С. Богуша- Сестранцэвіча як мастака-анімаліста. Выявы свойскіх і дзікіх жывёл: коней, валоў, сабак, свіней, нават зайцаў і курэй, намаляваныя ва ўдала падгледжаных выпадковых рухах і ракурсах, з'яўляюцца неад'емным і характэрным элементам яго сюжэтных твораў. Адлюстраванню жывёл мастак часта адводзіць цэнтральнае, першапланавае месца, акцэнтуючы ўвагу на іх натуральнай прыгажосці і норавах ("На таргу", "Выпадак"). Часам натуральныя замалёўкі асобных жывёл перарастаюць у самастойныя сюжэтныя кампазіцыі анімалістычнага жанру ("Зграя сабак", "Коні ў стойле"), але ніколі вобразы жывёл не набываюць карыкатурных рысаў, што нагадваюць звычкі людзей. У гэтым жанры мастак моцна трымаўся акадэмічных традыцый, з'яўляючыся творчым пераемнікам выдатных рускіх і польскіх рысавальшчыкаў папярэдніх часоў" [Рынкевіч, У. Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч – "ліцвін па крыві і косці" / У. Рынкевіч // Родн. слова. – 2008. – № 9. – С. 96 – 97].

[6]Жывапісныя работы М. Бяляніцкага серыі "Белавежская пушча" паводле "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" адносяцца да анімалістычнага жанру [Надзімава, І.В. Анімалістычны жанр / І.В. Надзімава, М.С. Міхайлаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск.: БелСЭ, 1984. – Т.1: Акапэла – Габелен. – С. 119], аднак гэтыя ж творы іншыя даследчыкі разглядаюць у межах жанру пейзажу [Дробов, Л.Н. Живопись Советской Белоруссии (1917 – 1975 гг.) / Л.Н. Дробов; под ред. А.С. Лиса. – Минск: Выш. школа, 1979. – С. 174].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 4. Белавежская пушча. Лось. 1958. М. Беляніцкі

Даследчыкі А. Макараў і В. Сергіеўская адзначаюць непапулярнасць анімалістычнага жанру ў сучасным беларускім выяўленчым мастацтве[7].

Па-трэцяе, услед за мастацтвазнаўцамі тэрміны "анімалізм", "анімалістыка" сталі выкарыстоўваць і даследчыкі прыгожага пісьменства пры характарыстыцы літаратурных твораў. Гэтыя тэрміны яшчэ толькі пачынаюць уваходзіць ва ўжытак беларускага літаратуразнаўства. Літаратурныя з'явы, якія імі акрэсліваюцца, вымагаюць сістэмнага вывучэння. Паколькі на сённяшні дзень такой сістэмнасці ў нашым літаратуразнаўстве не існуе, то ў характарыстыках твораў з анімалістычным зместам прысутнічае пэўная супярэчлівасць. Сярод асноўных тэрмінаў, якімі карыстаюцца даследчыкі ў сувязі з акрэсленай праблемай, звяртаюць на сябе ўвагу наступныя: "анімалізм", "анімалістыка", "анімалістычны жанр", "анімалістычная тэма", "анімалістычны псіхалагізм", "анімалістычны вобраз".

---

[7]А. Макараў адзначае занядбаласць анімалістычнага жанру ў беларускім выяўленчым мастацтве ў другой палове XX стагоддзя: "Цяпер жа выявы жывёл – рэдкая з'ява нават у дэкаратыўнай пластыцы. <...> Сярод сучасных беларускіх скульптараў няма ніводнага, хто б спецыялізаваўся ў анімалістыцы. Нават тых, хто зрэдку робіць выявы жывёл ці птушак. <...> у мастакоў да яго *[анімалістычнага жанру – Л.Д.]* фарміруюцца адносіны як да нечага нізкага, другараднага, менш прэстыжнага, чым, скажам, манументальная ці станковая кампазіцыя на злабадзённую тэму" [Макараў, А.П. Першарадныя праблемы "другаснага" жанру, або У абарону анімалістыцы / А.П. Макараў // Мастацтва Беларусі. – 1998. – № 2. – С. 12, 13].

В. Сергіеўская даводзіць: "У сучасным выяўленчым мастацтве анімалістычны жанр (увасабленне жывёл, звяроў, птушак) не самы папулярны. Людзі адышлі ад натуральнай прыроды, іх увага сканцэнтравана на ўласных праблемах, унутраных перажываннях. Гэта яны і нясуць у мастацтва" [Сергіеўская, В. Анімалістыка / В. Сергіеўская // Мастацтва Беларусі. – 1990. – № 8. – С. 26].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тлумачэнне тэрміна "анімалістычны жанр" у "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" вызначаецца відавочнай сэнсавай недакладнасцю. Сцвярджаецца, што гэта "жанр выяўленчага мастацтва і мастацкай літаратуры, які адлюстроўвае жывёльны свет"[8]. Зусім неправамерна адносіць анімалістыку да жанру ў літаратуры, бо ў адрозненне ад выяўленчага мастацтва, дзе жанр вызначаецца на падставе прадмета выяўлення, а часам прадвызначаецца і характарам выяўлення, падмуркам літаратурнага жанру з'яўляецца формаўтваральная і стылеўтваральная сістэма, а не змест. Увогуле рускія, украінскія і беларускія жанролагі ўжо адыходзяць ад ранейшай традыцыі вызначэння жанру ў залежнасці ад зместу твора. Гэта, напрыклад, даказваецца ў даследаваннях А. Макарэвіча[9]. Шэраг тэарэтыкаў літаратуры разглядаюць жанр як структурную адзінку. Так, В. Халізеў адзначае: "Пры разглядзе жанраў неабходна звярнуць увагу на арганізацыю, структуру, форму літаратурных твораў"[10]. В. Рагойша жанрам называе "гістарычна акрэслены, адносна ўстойлівы тып мастацкай формы, дзе структура пэўных фармальных прыкмет (архітэктанічных, вобразных, моўных) выяўляе больш-менш канкрэтны мастацкі сэнс"[11]. Жанр – гэта змястоўна-структурная адзінка, анімалістыка ў літаратурным творы ўплывае не на структурную арганізацыю мастацкага тэксту, а на яго сэнсаўтваральны бок.

Тэрмін "анімалістычная тэма" сустракаецца часцей у расійскім літаратуразнаўстве. У кандыдацкай дысертацыі "Анімалістычная тэма ў сучаснай савецкай прозе і традыцыі рускай класічнай літаратуры" (1990) А. Казлова вылучае пласт мастацкіх твораў, у якіх раскрываецца анімалістычная тэма. Аналізуючы рускую прозу XIX – XX стст., яна прапануе тыпалогію анімалістычных вобразаў, якая грунтуецца на аснове аналізу спосабаў іх пабудовы. Даследчыца вылучае наступныя тыпы вобразаў: жывёла як рэалія прыроды, вобраз-алегорыя, вобраз-сімвал і, нарэшце, псіхалагічны вобраз. Для яго характарыстыкі А. Казлова ўводзіць новы тэрмін – "анімалістычны псіхалагізм"[12]. Да разгляду анімалістычнай тэмы ў сучаснай рускай прозе такса-

[8]Надзімава, І.В. Анімалістычны жанр / І.В. Надзімава, М.С. Міхайлаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск.: БелСЭ, 1984. – Т. 1: Акапэла – Габелен. – С. 119.

[9]Макарэвіч, А.М. Актуальныя праблемы сучаснай беларускай жаналогіі (на прыкладзе характарыстыкі пытання "Раман і яго разнавіднасці" / А.М. Макарэвіч // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук. канф., 11-12 снеж. 2003 г.: тэз. дакл.: у 2 ч. / Магілёўск. дзярж. ун-т; адк. рэд. М.І. Вішнеўскі. – Магілёў, 2004. Ч. 2.– С. 44 – 52.

Макарэвіч, А.М. Сучасныя жанры і іх мадыфікацыі: тэарэтычны аспект / А.М. Макарэвіч // У ракурсе сучаснага асэнсавання: міжкафед. зб. навук. прац. Філалогія / рэдкал.: А.М. Макарэвіч і інш. – Магілёў: Магілёўск. дзярж. ун-т ім. А..А. Куляшова, 2004. – Вып. 2. – С. 5 – 13.

[10]Хализев, В. Е. Теория литературы: учеб. – 2-е изд. / В.Е. Хализев. – М.: Высш. шк., 2000. – С. 321.

[11]Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / В. Рагойша. – Мінск: БелЭн., 2001. — С.123.

[12]Маюцца на ўвазе тыя выпадкі, калі жывёла надзяляецца ў літаратурным творы здольнасцю думаць, разважаць [Козлова, А.Г. Анималистическая тема в современной советской прозе и традиции русской классической литературы: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.01.02 / А.Г. Козлова; Харьк. гос. пед. ин-т. – Харьков, 1990. – 18 с.].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ма звярнуліся А. Смірнова, А. Астапенка. Яны адзначаюць, што анімалістычная тэма мае шматвобразнае ўвасабленне ў сучаснай рускай прозе ў межах наступных напрамкаў: псіхалагічны рэалізм, "фантастычны" рэалізм, міфалагічны рэалізм[13].

Тэрміны "анімалізм" і "анімалістыка" ў сучасным літаратуразнаўстве найбольш распаўсюджаныя. Вонкава даследчыкамі падкрэсліваецца сінанімічнасць дадзеных тэрмінаў, хоць пры больш пільным аналізе гэтых паняццяў можна адзначыць пэўныя адрозненні.

Вядомы расійскі літаратуразнаўца М. Эпштэйн у сваёй працы "Природа, мир, тайник вселенной...: Система пейзажных образов в русской поэзии" (1990) адзначае: "Анімалізм як творча асэнсаваныя і адказныя адносіны чалавека да жывёльнага свету – адзін з найважнейшых рэзерваў і імпульсаў развіцця сучаснага гуманізму, які ўсё больш выходзіць з наіўнай сваёй стадыі "абагаўлення" чалавека – да сталага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння з усімі формамі жыцця на Зямлі"[14].

Адна з дакладных трактовак тэрміна "анімалізм" прысутнічае ва ўкраінскім літаратуразнаўчым слоўніку: "Мастацкае выяўленне жывёл, птушак, раслін і іншага праз прызму чалавечага светаадчування, наданне ім уласцівасцей чалавечага характару"[15].

Такім чынам, характарыстыка "анімалізму" прадугледжвае даследаванне сістэмы, састаўнымі часткамі якой з'яўляюцца асаблівасці светаўспрымання аўтара, яго здольнасць пазнаваць рэчаіснасць, ствараць анімалістычныя вобразы. У гэтым праяўляецца спецыфіка мастацкага пачуцця, калі тое, што пазнаецца чалавекам, паступова пераходзіць у катэгорыю ўспрымаемага, а затым праз прызму свядомасці пісьменніка факусіруецца ў мастацкіх творах літаратуры. Пераканальнымі падаліся нам разважанні А. Макарэвіча пра тое, што прыгожае пісьменства ідзе за правам асобы на індывідуальнае і непаўторнае светаўспрыманне і асэнсаванне праяў гэтага свету: "Пісьменнік, арыентуючыся на мастацкае адлюстраванне пэўнага кшталту грамадскай свядомасці праз паказ свядомасці адпаведных літаратурных герояў, становіцца на шлях пераўвасаблення ўласнай свядомасці. Гэта значыць, што стваральнік пэўнага мастацкага свету ўспрымае прататыпную рэчаіснасць ці мадэлюе яе ў адпаведнасці з патэнцыяльнымі магчымасцямі і жаданнямі сваёй мастацкай фантазіі, якая здольна трансфармаваць Я-свядомасць пісьменніка ў свядомасць мяркуемага літаратурнага героя. Я-свядомасць пісьменніка, часова трансфармуючыся ў Я-свядомасць такога героя, усп-

[13]Смирнова, А.И. *Анималистическая тема в современной русской прозе* / А.И. Смирнова, Е.В. Остапенко // Природа и человек в русской литературе: материалы Всеросийск. науч. конф., 1998 г. / отв. ред. А.И. Смирнова. – Волгоград: Изд-во Волгогр. гос. ун-та, 2000. – С. 120 – 126.

[14]Эпштейн, М.Н. Природа, мир, тайник вселенной...: Система пейзаж. образов в рус. поэзии / М.Н. Эпштейн. – М.: Высш. шк., 1990. – С. 87.

[15]Литературознавчий словник-довідник / Р.Т. Гром'як, Ю.І. Ковалів та ін. – Київ: ВЦ "Академія", 1997. – С. 42.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рымае мадэлюемую для будучага мастацкага твора рэчаіснасць "вачыма" свядомасці ўжо гэтай самай дзеючай асобы"[16].

Што датычыцца тэрміна "анімалістыка", то (па аналогіі з мастацтвазнаўствам) у літаратуразнаўстве ён з'яўляецца найбольш універсальным. Да яго апелююць і даследчыкі анімалістычнай тэмы ў мастацкай літаратуры (А. Казлова), і тыя, хто вывучае спецыфіку адлюстравання ў ёй вобразаў жывёл у кантэксце праблемы анімалізму (М. Эпштэйн), а таксама навукоўцы, якія характарызуюць вобразы жывёльнага свету пры даследаванні пэўнага твора. Адсюль вынікае, што тэрмін "анімалістыка" мае большую сэнсавую аб'ёмнасць у параўнанні з тэрмінам "анімалізм", ён уключае ў сябе як сам "анімалізм", так і сістэму анімалістычных вобразаў і матываў.

У даследаваннях айчынных літаратуразнаўцаў і крытыкаў анімалістыка як мастацкая сістэма прадстаўлена фрагментарна, у асноўным у межах характарыстыкі асобных анімалістычных вобразаў пэўных твораў. Істотныя напрацоўкі ў гэтым кірунку зроблены ў кнігах і артыкулах беларускіх літаратуразнаўцаў М. Арочкі, А. Бельскага, Д. Бугаёва, П.Васючэнкі, У. Гніламёдава, П. Дзюбайлы, Л. Корань (Сіньковай), М.Мішчанчука, Т. Шамякінай, А. Яскевіч.

---

[16]Макарэвіч, А.М. Сучасныя жанры і іх мадыфікацыі: тэарэтычны аспект / А.М. Макарэвіч // У ракурсе сучаснага асэнсавання: міжкафед. зб. навук. прац. / рэдкал.: А.М. Макарэвіч [і інш.] – Магілёў: Магілёўс. дзярж. ун-т ім. А.А. Куляшова, 2004. – Вып. 2. – С. 8.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Раздзел 1

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ АНІМАЛІСТЫКІ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 1.1 Міфапаэтычныя вытокі беларускай літаратурнай анімалістыкі

Са старажытных часоў жывёлы займаюць значнае месца ў практычнай дзейнасці людзей. Невыпадкова гісторыя развіцця культуры пачалася з розных форм зоацэнтрызму: некаторых жывёл на пачатковай стадыі развіцця чалавецтва лічылі свяшчэннымі, уяўлялі іх як асобую іпастась чалавека, ад прадстаўнікоў фауны выводзілі паходжанне калектыву. На змену зоацэнтрызму, які ўзвышаў жывёлу над чалавекам, прыйшоў антрапацэнтрызм, які вылучыў чалавека са свету прыроды і ўзвысіў над гэтым светам; змяніліся адносіны паміж чалавекам і жывёламі. Тым не менш, роля жывёл у духоўным жыцці чалавецтва даволі вялікая. "Калі зоацэнтрызм ёсць стадыя, якая гістарычна перажыла сябе, прайшла этап культураўтварэння, то анімалізму належыць узрастаючая роля ў стварэнні ўмоў для будучай, экалагічна збалансаванай культуры, якая пераадолела згубную аднабаковасць антрапацэнтрызму", – адзначае М. Эпштэйн[17].

Факты шанавання свяшчэнных жывёл, якіх нельга было забіваць і крыўдзіць, добра вядомы ў гісторыі чалавечай культуры, іх можна знайсці ў рэлігіях розных народаў і эпох. Многія даследчыкі адзначаюць, што функцыя прадстаўнікоў фауны ў гісторыі грамадства даволі значная: "Яна вызначаецца роляй, якую адыгрывалі жывёлы на ранняй стадыі развіцця чалавецтва, калі яны яшчэ не адасабляліся з усёй рэзкасцю ад калектыву людзей – ні ў яго сінхранічным стане (уключэнне жывёл у сацыяльную іерархію, размяшчэнне жывёл на вяршыні іерархічнай лесвіцы), ні ў дыяхранічным аспекце (ідэя паходжання пэўнага калектыву ад жывёл або ад жывёльнага продка), ні, нарэшце, антаганічна (уяўленне пра жывёлу як асобую іпастась чалавека)"[18]. Даследаваннем розных аспектаў гэтай праблемы займаліся Дж. Фрэзер ("Золотая ветвь. Исследование магии и религии")[19], А. Гура ("Символика животных в славянской народной традиции")[20], З. Сакалова ("Культ животных в религиях")[21], С. Токараў ("Ранние формы религии")[22] і інш.

---

17Эпштейн, М.Н. Природа, мир, тайник вселенной…: система пейзаж. образов в рус. поэзии / М.Н. Эпштейн. – М.: Высш. шк., 1990. – С. 89.

18Топоров, В.Н. Животные / В.Н. Топоров // Мифы народов мира: энцикл.: в 2 т. / гл. ред. С.А. Токарев. – М.: Сов. энцикл., 1980. – Т. 1: А – К. – С. 440.

19Фрэзер, Д. Золотая ветвь: исслед. магии и религии: пер. с англ. / Д.Д. Фрэзер. – М.: Политиздат, 1986. – 703 с.

20Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. – М.: Индрик, 1997. – 910 с.

21Соколова, З.П. Культ животных в религиях / З.П. Соколова. – М.: Наука, 1972. – 216 с.

22Анімалізм, зоалатрыя (ад лац. animal – жывёла; грэц. zoon – жывёла, latreia – служэнне) – шанаванне жывёлы ў рэлігіях [Токарев, С.А. Зоолатрия, анимализм / С.А. Токарев // Краткий научно-атеистический словарь / Г.Л. Андреев, А.И. Ардабьев, С.А. Арутюнов и др. – М.: Наука, 1969. – С. 263 – 264].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адна з ранніх форм рэлігіі, якая звязана з жывёламі, – татэмізм[23]. Пад ім разумеюць "комплекс вераванняў, абрадаў і рытуалаў у першабытным грамадстве, звязаны з уяўленнем аб роднасці паміж групай людзей (родам, племенем, фратрыяй) і татэмам (пэўным відам жывёл, птушак, раслін, радзей з'явай прыроды і неадушаўлёнымі прадметамі)"[24].

Дадзены тэрмін упершыню быў выкарыстаны Дж. Лонгам у XVIII ст. Вызначэннем спецыфікі татэмізму займаліся выдатныя дзеячы XIX – XX стст.: англійскія этнолагі Э.Тэйлар ("Первобытная культура")[25] і Дж. Фрэзер ("Золотая ветвь")[26], аўстрыйскі псіхааналітык З. Фрэйд ("Тотем и табу")[27]. Асноўнае палажэнне гэтых даследаванняў: татэм – не бажаство, галоўнае ў татэмізме – вера ў роднасць з ім. У кожнага народа свету склалася свая сістэма татэмных продкаў (у вялікай колькасці яны вядомыя ў аўстралійцаў, набор іх татэмных продкаў – літаральна ўся фауна мацерыка).

Па вызначэнні Э. Тэйлара, татэмнае племя падзяляецца на кланы, члены кожнага з якіх звязаны паміж сабой назвамі расліны, жывёлы або прадмета. Часцей за ўсё выбар падае на прадстаўнікоў фауны.

Дж. Фрэзер адзначаў, што, як правіла, членамі сацыяльнай супольнасці, якая насіла імя татэма, забаранялася татэмную жывёлу забіваць і спажываць у харчаванні (акрамя рытуалаў).

Паводле слоў З. Фрэйда, татэмізм уяўляе сабой як рэлігійную, так і сацыяльную сістэму: "З рэлігійнага боку ён выражаецца ў адносінах шанавання і адпаведнасці паміж чалавекам і яго татэмам, з сацыяльнага боку – у абавязках членаў кланаў адзін да аднаго і да іншых плямёнаў"[28]. Вядомымі даследчыкамі татэмізму ў славянскай культуры з'яўляюцца Д. Зяленін[29], А. Залатароў[30],

---

[23]Тэрмін "татэм" утвораны ад слоў "от-отем" або "от-отам", што азначае на мове паўночнаамерыканскіх індзейцаў племені аджыбве "яго род" [Дубянецкі, Э.С. Татэмізм / Э.С. Дубянецкі // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн., 2002. – С. 368].

[24]Дубянецкі, Э.С. Татэмізм / Э.С. Дубянецкі // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 368 – 369.

[25]Тайлор, Э. Первобытная культура: пер. с англ. / Э. Тайлор – М.: Политиздат, 1989. – 573 с.

[26]Фрэзер, Д.Д. Золотая ветвь: Исслед. магии и религии: Пер. с англ. / Д.Д. Фрэзер.– М.: Политиздат, 1986. – 703 с.

[27]Фрейд, З. Остроумие и его отношение к бессознательному: Страх; Тотем и табу / З. Фрейд. – Минск: ООО "Попури", 1998. – 490 с.

[28]Там сама. – С. 432.

[29] Зеленин, Д.К. Избранные труды: очерки по рус. мифологии: Умерш. неестественной смертью и русалки / Д.К. Зеленин. – М.: Индрик, 1995. – 430 с.

[30] Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

С. Токараў[31] і інш. Да разгляду татэмізму звяртаюцца беларускія даследчыкі Э.Дубянецкі[32], Т. Шамякіна[33], М. Піліпенка[34].



Мал. 5. Каза і мядзведзь гультайнічаюць, на музыцы сваёй забаўляюцца

Адгалоскі татэмізму праявіліся ў славянскай культуры ў абрадавым фальклоры, які звязаны з шанаваннем дрэў, птушак, звяроў. На гэта ўказвае Т. Шамякіна ў кнізе "Міфалогія Беларусі": "У беларускіх народных абрадах і сёння мы знаходзім шмат рэшткаў татэмізму: пераапрананне ў звярыныя скуры, жывёльныя маскі, "ваджэнне казы" на Каляды, прысутнасць "духа поля" на дажынках, кажух, на які саджаюць маладых падчас вяселля (раней гэта была скура татэмнай жывёлы)"[35].

Спецыфічнай формай праяўлення татэмізму ў беларусаў з'яўляюцца пераапрананні ў мядзведзя, казу падчас розных свят і абрадаў. Э. Дубянецкі адзначае, што на Беларусі доўгі час захоўвалася язычніцкае свята татэмнага паходжання "Камаедзіца", якое праводзілася вясной ў гонар прабуджэння мядзведзя ад зімовай спячкі. Тады і арганізоўваліся скокі ў вывернутых кажухах, прычым танцавальныя рухі імітавалі паводзіны мядз-

[31]Токарев, С.А. Зоолатрия, анимализм / С.А. Токарев // Краткий научно-атеистический словарь / Г.Л. Андреев, А.И. Ардабьев, С.А. Арутюнов [и др.]. – М.: Наука, 1969. – С. 263 – 264.

Токарев, С.А. Тотемические мифы / С.А. Токарев // Мифы народов мира: энцикл.: в 2 т. / гл. ред. С.А. Токарев. – М.: Сов. энцикл., 1998. – Т. 2: К. – Я. – С. 522 – 523.

[32]Дубянецкі, Э.С. Татэмізм / Э.С. Дубянецкі // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн., 2002. – С. 369.

[33]Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі: нарысы / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 398 с.

[34]Піліпенка, М. Ваўкалак / М. Піліпенка // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 104 – 105.

[35]Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі: нарысы / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 21.

Электронный архив библиотеки ... имени А.А. Кулешова

ведзя[36]. Такі абрад мае даўнюю гісторыю, у асобных беларускіх фальклорных творах адзначаецца, што ў мядзведзяў, буслоў, ваўкоў часам ператвараліся (пераважна па волі Бога) звычайныя людзі. "Татэмізм – гэта не толькі вера ў жывёльнага продка, але і перакананне, што некаторыя члены роду могуць ператварацца ў татэмную жывёлу," – адзначае Т. Шамякіна[37]. Адсюль вера ў пярэваратняў ("фантастычны персанаж народных павер'яў і казак; чалавек, ператвораны ці здольны сам дзівосным чынам ператварацца ў звера, расліну, камень"[38]).

Шэраг твораў вуснай паэтычнай творчасці захоўвае рэшткі татэмізму[39]. Састаўной часткай татэмізму з'яўляюцца міфы-паданні пра фантастыч-



Мал. 6. Дыванок "Алені". 1984. К. Русаковіч. Сацін, салома, аплікацыя. Рухава Старадарожскага раёна

[36]Дубянецкі, Э.С. Татэмізм / Э.С. Дубянецкі // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн., 2002. – С. 369.

[37]Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі: нарысы / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 19.

[38]Лозка, А.Ю. Пярэварацень / А.Ю Лозка // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн., 2002. – С. 310.

[39]"У фальклярыстыцы даўно ўсталявалася думка, што казкі пра жывёл узніклі на аснове дастаткова развітога эстэтычна-мастацкага светаадчування і сваімі каранямі ўваходзяць у <...> эпоху, калі людзі толькі пачыналі асэнсоўваць навакольны свет, рабілі першыя нясмелыя спробы абагульніць свае назіранні і свой працоўна-бытавы вопыт. Напачатку гэты вопыт абагульняўся не казкай, а вельмі далёкімі яе "продкамі" – расказамі, якія не мелі алегарычнага сэнсу і яшчэ не былі слоўным мастацтвам, зразумела, у прамым значэнні гэтага тэрміна. Фальклярысты трымаюцца той думкі, што такія расказы, па-першае, знаходзіліся пад поўным уплывам татэмістычных паняццяў і вераванняў, па-другое, адлюстроўвалі анімалістычны светапогляд людзей, па-трэцяе, былі "заселены" усімі галоўнымі героямі будучых казак пра жывёл. Абагаўленне звера, надзяленне яго рысамі звышнатуральных міфічных істот, вера нашага далёкага продка ў кроўнае сваяцтва з некаторымі прадстаўнікамі жывёльнага царства, суправаджэнне палявання абрадава-магічнымі дзеяннямі – усё гэта існавала і развівалася да таго часу, пакуль чалавек не навучыўся думаць, разважаць і ацэньваць рэчаіснасць казачнымі алегорыямі," – адзначае М.А. Янкоўскі [Янкоўскі, М.А. Паэтыка беларускай народнай прозы / М.А. Янкоўскі. – Мінск: Выш. школа, 1983. – С. 214].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных родапачынальнікаў (паўлюдзей-паўжывёл). Татэмныя міфы з'яўляюцца аднымі з самых старажытных у свеце. Найбольшае распаўсюджанне яны атрымалі сярод народаў Еўразіі і Паўночнай Амерыкі. У гэтых міфах продак, ад якога пачыналася племя, выступае найчасцей у выглядзе ваўка або здольны ў яго ператварацца. На Беларусі да цяперашняга часу бытуюць фальклорныя творы пра пераўвасабленне чалавека ў прадстаўнікоў фауны – мядзведзя, лася, казу, ваўка, аленя[40], птушак.

Напрыклад, у беларускіх баладах даволі пашыраны сюжэт пра дачку, якая ператварылася ў зязюлю[41]. Даследчык Л. Салавей адзначае, што сюжэт пра дачку, якая ператварылася ў зязюлю з'яўляецца характэрным як для беларускай, так і для рускай, украінскай, славацкай, літоўскай вуснапаэтычнай творчасці. "Асобныя матывы, якія ў іншых славян распрацаваны адным сюжэтам, у нас сустракаюцца ў некалькіх сюжэтах.

Напрыклад, матыў ператварэння жанчыны ў зязюльку ўваходзіць у баладныя песні пра жонку, якая вяртаецца з поля зязюлькай, каб паслухаць, што гаворыць пра яе "нялюбы"; пра мілую, якая дазволіла міламу жаніцца з яе роднай сястрой, а потым хоча яго загубіць за здраду; пра жонку, якая праводзіць мужа "ў Русь на вайну", скінуўшыся зязюляй, а дзеці – салаўямі. У вуснапаэтычнай творчасці ўкраінцаў, славакаў, літоўцаў і рускіх гэты матыў знаходзіць рэалізацыю толькі ў першым, асноўным сюжэце пра дачку, якую аддалі замуж далёка, прытым у рускіх творах адносіцца да лірычных пе-



Мал. 7. Фрагмент дэкору посцілкі з матывам зязюлі. XX ст. Н. Якімовіч.

[40]Вучоны-мастацтвазнаўца М.С. Кацар у кнізе "Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка" адзначае, што вобраз аленя з'яўляецца папулярным у народнай мастацкай творчасці, гэта тлумачыцца татэмічнымі каранямі вобраза гэтай жывёлы: "Звычайна два алені размяшчаюцца паабапал дрэва жыцця – сімвалу вечнасці і жыццёвасці, часта каля іх размяшчаюцца зоркі – сімвал чалавека. Відаць, у старажытнасці алені былі татэмам, абярэгам. У сучаснай жа мастацкай творчасці гэта проста дэкаратыўны матыў" [Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар; навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1996. – С. 177].

[41]Баларды: у 2 кн. / уклад. Л.М. Салавей, рэд. В.К. Бандарчык і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – Кн. 1. – С. 35 – 101.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сень"[42]. Мастацтвазнаўца М.С. Кацар слушна кажа: "У народнай свядомасці вобраз зязюлі – гэта сімвал жанчыны ў горы, смутку, жальбе. <...> Не дзіўна, што зязюлю можна бачыць на тканых і вышываных посцілках і ручніках. Калі яна паказана ў спалучэнні з зоркамі – сімваламі дзяцей, значыць твор прысвечаны мацярынскаму гору: ці сын загінуў на вайне, ці нехта з дзяцей памёр. Зязюля разам з букетам абазначае, пэўна, горкую ўдовіну долю ці няшчаснае каханне, разлуку закаханых"[43].



Мал. 8 Ручнік з баладным сюжэтам, XX ст. М. Ермашэнка. Гарадоцкі раён Віцебскай вобласці

Адным з найбольш распаўсюджаных вобразаў-пярэвартняў з'яўляецца вобраз ваўкалака[44]. "У паданнях беларусаў чараўнікі ператваралі ў ваўкалака часцей за ўсё вясельныя групы, якія ў далёкім мінулым азначалі родавыя групы, а род быў сацыяльнай асновай татэмізму. На больш позніх стадыях развіцця грамадства гэты татэмічны абрад пераапранання пераасэнсаваны як магічнае дзеянне чараўніка", – адзначае М. Піліпенка[45].

У архаічным свеце міфалагічнымі ўяўленнямі было прасякнута ўсё жыццё людзей. К. Юнг пры разглядзе пытання функцыі міфалогіі, адзначыў: "Для народаў-міфатворцаў міфалогія з'яўлялася і формай самавыяўлення, і формай мыслення, і формай існавання"[46]. Але спачатку міфы, відаць, не расказваліся, а выяўляліся ў форме рытуалаў, абрадаў. Яшчэ ў дабіблейскія часы чалавек асэнсоўваў сябе і сусвет праз

[42] Салавей, Л.М. Беларуская народная балада / Л.М. Салавей; рэд. К.П. Калашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – С. 78.

[43] Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар; навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1996. – С. 138.

[44] Ваўкалак (ад старaслав. влък – воўк, длакъ – поўсць), "вобраз у старадаўніх павер'ях беларусаў і іншых славянскіх народаў, пярэварацень, чалавек, які дзівосным спосабам набыў на некаторы час аблічча ваўка" [Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі: нарысы / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 104 – 105].

[45] Піліпенка, М. Ваўкалак / М. Піліпенка // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 105.

[46] Юнг, К.Г. Архетип и символ / К.Г. Юнг. - М.: Ренессанс, 1991. – С. 9.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

прызму жывёльнага свету. З прадстаўнікамі фауны людзі суадносілі краіны свету, стыхіі, поры года і інш. Прычым кожны народ або краіна мае сваю сістэму гэтых вобразаў. Так, полымя ў народаў Кітая і Японіі асацыіруецца з Феніксам, у Старажытнай Грэцыі – з драконам[47]. Аналіз такіх сістэм дапамагае асэнсаваць асаблівасці, каларыт, сутнасць светапогляду гэтых народаў, пэўных рэлігій. Яны сведчаць пра асацыятыўнае ўспрыманне, калі анімалістычныя элементы з'яўляліся фіксатарамі асэнсавання розных з'яў рэчаіснасці.



Мал. 9. Цэхавыя гербы магілёўскіх седляроў і шубнікаў (1), злотнікаў (2), зборнікаў (3). XVII ст. Рэканструкцыя А.К. Цітова.

Вусная народная творчасць, моўны матэрыял, старажытная сімволіка з'яўляюцца тымі вытокамі, якія дазваляюць рэканструяваць сувязі жывёл з чалавекам у міфалагічным аспекце. Сведчаннем таму стала шырокае выкарыстанне заамарфных вобразаў у сферы сімволікі (голуб – сімвал міру), эмблематыкі (змяя ў медыцыне), геральдыкі (прадстанікі фауны на гербах), астралогіі (рыбы, авен, цялец, рак, леў, скарпіёў – знакі задыяку) і інш.



Мал. 10. Вільчак заамарфнага характару. *Капыльскі раён Мінскай вобласці*

Згадаем назвы некаторых хвароб (рак, жаба і інш.). Шырока выкарыстоўваюцца назвы прадстаўнікоў фауны ў казках, гульнях[48], памяншальна-ласкальных зваротах. Выраблююцца цацкі ў выглядзе жывёл, якія адыгрываюць важную ролю ў выхаванні дзяцей. Нярэдка такія жывёлы, як кот, конь, певень выступалі ў ролі "будаўнічых ахвяр".

[47]Топоров, В.Н. Животные / В.Н. Топоров // Мифы народов мира: энцикл.: в 2 т. / гл. ред. С.А. Токарев. – М.: Сов. энцикл., 1980. – Т. 1: А – К. – С. 441.

[48]Кухаронак, Т.І. Маскі ў калляднай абраднасці беларусаў / Т.І. Кухаронак – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Гербы населеных пунктаў Брэсцкай вобласці



г. Драгічын



г. Ганцавічы



в. Малеч Бярозаўскага раёна



Брэсцкая вобласць



г.п. Лагішын Пінскага раёна



г. Пружаны



г. Столін

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

"Перад засяленнем гаспадара ў новы дом у ім начуюць жывёлы: у першую ноч певень і курыца, у другую – гусь або кот і котка, у трэцюю – парася, у чацвёртую – авечка, у пятую – карова, у шостую – конь. І толькі на сёмую ноч, калі ўдала прайшлі папярэднія, засяляўся гаспадар. Ідэя такой іерархіі мае агульнаіндаеўрапейскія вытокі", – адзначаюць Л. Дучыц, Я. Сахута[49]. "Нашы продкі верылі, што тая ці іншая жывёліна можа не толькі наклікаць бяду, але і засцерагчы ад яе, абараніць жыллё ад нячыстай сілы. Часам для гэтага было дастаткова схематызаванага адлюстравання жывёлы ці нават часткі яе. Вось і ўрыгожвалі нашы продкі вільчакі сваіх хат конскімі галовамі, каровінымі рагамі, сілуэтамі змей, а сальнічку ці чарпак выразалі ў выглядзе качкі, – адзначае М.С. Кацар. – Не абышлі гэтую тэматыку і ткачыхі. На посцілках, асабліва апошніх дзесяцігоддзяў, мы бачым цэлы звярынец: алені, ільвы, каты, зайцы і інш. На старажытных тканых вырабах з іх пераважна геаметрычнай арнаментыкай матывы жывёл калі і сустракаліся, то моцна стылізаваліся і выконвалі, несумненна, сімвалічную, ахоўную ролю"[50].



Мал. 11. Дэкор ручніка з матывам зайца, XX ст. М. Крукоўская. Мінская вобласць

Міфалагічнае мысленне нясе ў сабе вобразнае асэнсаванне рэчаіснасці. Яно сфарміравалася ў познепершабытным грамадстве, і зразумець яго можна толькі праз міфалогію. Міфалогія складае каларыт культуры, з'яўляецца найвышэйшым праяўленнем сумлення прыроды і духу, што адлюстравана ў вобразным мысленні кожнага народа.

Само па сабе міфалагічнае ўспрыманне свету заўсёды з'яўлялася даволі ўмоўным паняццем, бо нават сам тэрмін "міф" шматзначны. У працах даследчыкаў міф выступае: як від мастацкай творчасці, аналагічны паэзіі, паданне (Я. Мяляцінскі, А. Фрэйдэнберг), як рэгулятар паводзін (Б. Маліноўскі), знакавая сістэма (Р. Барт), як інтэлектуальная дзейнасць (праднавука) (Дж. Фрэзер, Э. Тайлар).

[49]Дучыц, Л. Жывёлы / Л. Дучыц, Я. Сахута // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / склад І. Клімковіч; навук. рэд. С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 171 – 172.

[50]Кацар М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар; навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1996. – С. 78.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Існуе шэраг класіфікацый міфаў, але наўрад ці можна знайсці сярод іх асобна вылучаную анімалістычную групу. Міфы, у полі зроку якіх знаходзяцца жывёлы, калі мець на ўвазе шэраг класіфікацый, могуць быць уключаны ў розныя групы.

Паводле функцыянальнага прынцыпу пабудавана класіфікацыя Э. Тайлара: 1) міфы філасофскія, або тлумачальныя; 2) міфы, якія заснаваны на рэальных, але на перабольшаных апісаннях; 3) міфы, у якіх дзейнічаюць гістарычныя або легендарныя асобы; 4) міфы, якія заснаваны на рэалізацыі фантастычных метафар; 5) міфы, якія былі створаны для распаўсюджання маральных, сацыяльных або палітычных вучэнняў[51].

Я. Меляцінскі выдзяляе наступныя катэгорыі міфаў: этыялагічныя, касмаганічныя, антрапаганічныя, астральныя, салярныя, "блізнечныя", татэмічныя, каляндарныя, гераічныя, эсхаталагічныя[52].

В. Маслава ў кнізе "Уводзіны ў лінгвакультаралогію" (1997) робіць спробу вылучыць міфы пра жывёл у адну з пяці груп сваёй класіфікацыі, якая зроблена на падставе моўнага (фразеалагічнага) матэрыялу, – групу "З'явы прыроды як фактар прыроды, адлюстраваныя ў мове"[53]. У яе ўваходзяць тры падгрупы, адна з якіх мае назву "Птушкі, рыбы і розныя звяры ў культуры і мове". Але трэба адзначыць, што абмежаваць гэтую вялікую тэму (анімалістычную) адной падгрупай, напэўна, цяжка і немагчыма. Аўтар акцэнтуе ўвагу на ўзаемасувязі розных сістэмных груп. Так, у групе "Міфы пра паходжанне Сусвету, зямлі, зорак і іх адлюстраванне ў семантыцы фразеалагізмаў", дзе разглядаюцца касмаганічныя міфы, В. Маслава сярод іншых тэорый будовы сусвету выдзяляе асобна зааморфную мадэль[54].

Беларускія даследчыкі называюць наступныя тыпы міфаў: этыялагічныя (пра паходжанне і ўласцівасці аб'ектаў і з'яў прыроды), антрапагенічныя (пра паходжанне чалавека), этнагенічныя (пра паходжанне роду і яго інстытутаў, асобных народаў), касмаганічныя (пра ўзнікненне сусвету), тэалагічныя (пра багоў) і інш.[55]. Навукоўцы адзначаюць, што найбольш распаўсюджанымі на Беларусі з'яўляюцца міфы этыялагічныя, сярод якіх асобна можна вылучыць пра паходжанне птушак (напрыклад, пра зязюлю, бусла, варону), жывёл (напрыклад, пра сабаку, ваўка). В. Рагойша вызначае розныя віды міфаў: касмаганічныя, антрапагенічныя, тэагенічныя, салярныя, і, нарэшце, этыялагічныя ("пра розныя аб'екты і з'явы прыроды, флору і фауну і інш.")[56].

---

[51]Тайлор, Э. Первобытная культура / Э. Тайлор; пер. с англ. – М.: Политиздат, 1989. – С. 178.

[52]Мифологический словарь / гл. ред. Е.М. Мелетинский. – М.: Сов. энцикл., 1990. – С. 635 – 638.

[53]Маслова, В.А. Введение в лингвокультурологию: учеб. пособие / В.А. Маслова. – М.: Наследие, 1997. – С. 122 – 138.

[54]Там жа, с. 100 – 101.

[55]Салавей, Л.М. Міфалогія / Л.М. Салавей // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн., 2002. – С. 239.

[56]Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / В. Рагойша. – Мінск: БелЭн., 2001. – С. 85.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адной з асаблівасцей беларускай міфалогіі з'яўляецца тое, што ў ёй выяўляецца сінтэз язычніцкага і хрысціянскага пачаткаў. У абедзвюх сістэмах спачатку ўзніклі жывёлы, а потым чалавек. Паводле першага светапогляду, жывёлы ўшаноўваліся. Чалавек стаяў на ніжэйшай ступені лесвіцы, не ўзвышаўся над прыродай, а лічыўся яе адзінкай, часткай цэлага. Паводле Старога Запавета, чалавек – уладар усяго жывога. На першых старонках Бібліі, дзе апавядаецца, што Бог стварыў зямлю, жывёл, чалавека, ёсць наступныя радкі: "И сказал Бог: сотворим человека по образу Нашему [и] по подобию Нашему; и да владычествуют они над рыбами морскими, и над птицами небесными, [и над зверями], и над скотом, и над всеми гадами, пресмыкающими по земле"[57].



Мал. 12. Бусел, каля 1500. А. Дюрер

Элементы міфалагічных уяўленняў захаваліся ў фальлорных творах: у валачобных, купальскіх, вясельных песнях, казках, баладах, замовах, пахавальных галашэннях.

Многія легенды, паданні адлюстраваны ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя, у тым ліку фальклорныя творы пра бусла, які з'яўляецца самым распаўсюджаным арніталагічным вобразам у мастацкай свядомасці беларусаў, пра што сведчаць розныя легенды і паданні этыялагічнага, касмаганічнага характару ("Пра паходжанне бусла", "Пакаранне бусла", "Бусел", "Лясныя манахі").

У розных варыянтах даволі шырока распаўсюджаны тыя легенды і паданні, у якіх расказваецца пра паходжанне бусла. Паводле беларускіх паданняў, бусел – гэта ў мінулым чалавек, хрысціянін, якога Бог ператварыў у птушку за непаслухмянасць. Аднойчы, паддаўшыся цікаўнасці, чалавек заглянуў у мяшок, які Гасподзь даручыў яму кінуць у полымя не развязваючы. З меха вылезлі гады, розная нечысць і распаўзліся па зямлі. Ператварыўшы чалавека ў бусла, Бог прымусіў яго збіраць іх. Гэта легенда адлюстравана ў шэрагу літаратурных твораў Беларусі. Сярод іх –

[57]Библия. Кн. Свящ. Писания Ветхого и Нового Завета. – М.: Междунар. издат. центр правосслав. лит., 1995. – С. 6.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Народная казка пра бацяна" У. Дубоўкі, нарыс "Зямля пад белымі крыламі" У. Караткевіча, аповесць "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В.Казько, апавяданне "Бусел" А. Кажадуба.

У беларускай міфалогіі з буслом звязана ўяўленне пра чысціню, урадлівасць, шчасце. Асаблівасці нацыянальнага асэнсавання гэтага вобраза бяруць пачатак у творах вуснай народнай творчасці. І. Чарота адзначае: "У сістэме народнай вобразатворчасці, а па традыцыі і ў творах літаратуры буслу, відаць, няма роўных"[58].

З даўніх часоў гэтая птушка з'яўляецца сімвалам мудрасці і даўгалецця. У славянскай сімволіцы буслы – святыя птушкі[59], якія ўвасабляюць чысціню, нясуць дабравесце. Такая трактоўка вобраза сустракаецца ў вершы П. Панчанкі:

Буслы да нас вясною зноўку вернуцца,
Як на зямлі прадзюбнецца трава.
Без чалавечай і буслінай вернасці
Няма ні дабрыні, ні хараства
("Буслы, буслы..."[60]).

У творчасці Э. Акуліна вобраз бусла адлюстраваны ў філасофскай лірыцы:

Верасень мярэсціцца ў смузе –
вырай мой – нябліжкі, недалёкі...
Бусел на затомленай назе, –
ідэал жыцця майго высокі.[61]

Гэты арніталагічны вобраз займае галоўнае месца ў беларускім мастацкім адлюстраванні Р. Барадуліна, П. Броўкі, В. Гардзея, С. Грахоўскага, Л. Геніюш, У. Караткевіча і іншых пісьменнікаў. Аб распаўсюджанасці яго ў літаратурнай творчасці сведчаць дадзеныя прадметна-частотнага паказальніка пейзажных тэм і вобразаў беларускай паэзіі, складзенага А. Бельскім. Тут занатавана на-

---

[58]Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці: Беларус. літ. XX стагоддзя ў працэсах нац. самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 123.

[59]Т. Валодзіна і Л.Салавей адзначаюць: "Бусел для беларусаў – святая птушка. Забіць бусла – вялікі грэх. <...> Дачыненні чалавека і бусла – прыклад гарманічнага суіснавання чалавека і дзікай прыроды, якая становіцца свойскай: чалавек дапамагаў буслу будаваць гняздо, ахвяруючы дзеля гэтага старыя колы, бароны, кладучы туды кавалкі жалеза, медзі. За гэта бусел магічным чынам засцерагаў жыллё ад пажару або папярэджваў, што жытло спаліць пярун" [Валодзіна Т., Салавей Л. Бусел, бацян, буська / 2 Т. Валодзіна, Л. Салавей // Беларуская міфалогія: дапам. / уклад. У.А. Васілевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. – С. 52].

[60]Панчанка, П. Збор твораў: у 4 т./ П. Панчанка – Мінск: Маст. літ., 1982. – Т. 3: Вершы (1963 – 1981). – С. 342.

[61]Акулін, Э Крыла анёла: вершы / Э. Акулін – Мінск: ПаліБіг, 2000. – С. 21.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ступная колькасць твораў пра птушак: бусел – 100, журавель – 71, зязюля – 53, жаўранак – 49, салавей – 37, гусі – 35, шпак – 23[62].

Традыцыйна ў беларускай літаратуры вобраз бусла звязаны з Радзімай. Так, у вершы "Буслы" У. Сыракомлі гучыць матыў вернасці і адданасці радзіме:

Я ж тут радзіўся, гдзе гэта хатка,
Шчасця знаў дзянькі нярэдкі:
Ось тут, гдзе выган і сенажатка,
Бывала, косіць касцоў грамадка,
Клякочуць жонка і дзеткі.
<...> Так пажурыўшысь думкаю шчырай,
Бусел, узняўшы паволі,
Паплыў па небе кудысь на вырай
Шукаць і шчасця і долі"[63].

Матыў вяртання на радзіму, які звязаны з гэтай птушкай, прысутнічае ў вершы Я. Купалы "Буслы":

А там, ля касцей залаціцца лярсцёнак,
А надпіс чужой на ім мовай:
"Як вернецца бусел з нязнаных старонак –
Ка мне мілы вернецца ўзнова..."[64].

У лірыцы У. Караткевіча гэтая птушка, як і чалавек, любіць свой родны кут, сваю бацькаўшчыну:

Не ад стомы буслы гінуць над морам:
Настальгія ім сэрца няшчаснае рве.
О, туга па радзіме. Хутчэй. Хутчэй.
Сэрца поўніць узлёт нечуваных мар.
("О мой цудоўны край..."[65]).

Такую ж семантыку мае вобраз бусла і ў апавяданні А. Кажадуба "Бусел". Група тэлевізіёншчыкаў адпраўляецца па родных мясцінах аднаго з калег, Мацкевіча, каб зрабіць перадачу пра родны край. На думку героя, перадача пра Радзіму без кадраў пра бусла не будзе мець належнага ка-

[62]Бельскі, А. Свет ад травы да зор : беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: дапам. для настаўнікаў. / А. Бельскі.– Мінск: Нар. асвета, 1998. – С. 46.

[63]Сыракомля,У. Добрыя весці: паэзія, проза, крытыка / уклад. і камент. У. Мархеля, К. Цвіркі; прадм. К. Цвіркі. – Мінск: Маст. літ., 1993. – С.39.

[64]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады, 1904 – 1907. – С. 42.

[65]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т./ У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 82.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ларыту. Не адразу скончылася послехам камандзіроўка. Бусла напачатку так і не ўдалося зняць: "Мацкевіч змрочна думаў, што нічога зрабіць не ўдалося. <...> "Перадачу пра радзіму захацеў? Каб людзі глядзелі і радаваліся? Пляваццa яны ад тваёй перадачы будуць..."[66] У канцы твора чытач даведваецца, што перадачу ўсё ж такі ўдалося зрабіць паспяхова. "Бусел ляцеў, і ўсім на экране тэлевізара добра бачылася яго вока – чорная пацерка ў белай аздобе"[67].

Вобраз бусла мае шэраг нацыянальных асаблівасцей. Аналізуючы мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў, заўважаем, што ў нашай краіне гэта нацыянальны вобраз[68], прызнаны сімвалам Радзімы, чысціні. У некаторых творах (аповесць "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько) бусел разглядаецца ў якасці татэмнай птушкі, што сімвалізуе паходжанне беларусаў. І. Чарота адзначае, што гэта птушка "з'яўляецца, верагодна, самым характэрным знакам балотнай архетыпікі"[69]. Вобраз такога плана ў літаратуразнаўстве ХХ стагодзя прынята называць архетыпічным.

Тэрмін "архетып" (паходзіць з грэчаскай мовы (apcetupn ад "apch" – "пачатак" і "tupox" – "вобраз") і азначае "першавобраз", "ідэя"), які ўпершыню выкарыстоўваўся ў антычным платанізме (паводле Платона – вобраз), быў уведзены ў шырокі культурны ўжытак швейцарскім псіхааналітыкам і міфолагам К. Юнгам. Асновай яго тэорыі архетыпаў з'явілася тэорыя "калектыўнага падсвядомага", пад якой ён разумеў тую частку падсвядомага, што не з'яўляецца вынікам уласнага вопыту, а атрымана чалавекам у спадчыну ад мінулых пакаленняў[70].

На думку вучонага, само несвядомае пастаянна прадуцыруе некаторыя схемы, "першасныя вобразы"[71]. Гэтыя апрыёрныя схемы ўвасабляюцца ў вобразы, сюжэты і матывы, вар'іруюцца ў розных рэгіёнах, у творчасці самабытных народаў. К. Юнг адзначаў, што архетыпы структурыруюць разуменне чалавекам свету, сябе і іншых людзей; з асаблівай дакладнасцю яны праяўляюцца ў снах, міфічных апавяданнях.

У якасці галоўных міфалагічных архетыпаў або архетыпічных міфалагем К. Юнг выдзеліў наступныя: "аніма" (унутраны вобраз жанчыны ў мужчыне, яго падсвядомая жаночая частка), "анімус" (унутраны вобраз мужчыны ў жанчыне, яе падсвядомая мужчынская частка), "персона" (тое мноства роляў, якія чалавек праігрывае ў суадноснасці з сацыяльнымі патрабаваннямі),

---

[66]Кажадуб, А. Святы калодзеж: апавяданні / А. Кажадуб. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 23.
[67]Там жа, с. 23.
[68]Адзначым, што бусел – "нацыянальная птушка" – тэрмін, які прыпісаны да Германіі.
[69]Чарота, І. Жывёлы балотнага краю / І. Чарота // Родн. слова. – 1994. – № 10. – С. 124.
[70]Юнг, К.Г. Об отношении аналитической психологии к поэтико-художественному творчеству / К.Г. Юнг // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX-XX вв.: трактаты, ст., эссе / Моск. гос. ун-т; сост., общ. ред. Г.К. Косиков. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та , 1987. – С. 100.
[71]Там жа, с. 111.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

"цень" (падсвядомая процілегласць таго, што індывід настойліва сцвярджае ў свядомасці), "самасць" (рэгулюючы цэнтр асобы), мудрэц (персаніфікацыя жыццёвай мудрасці і сталасці)[72]. С. Аверынцаў, аналізуючы аналітычную псіхалогію К. Юнга, слушна даводзіць: "Самасць" – цэнтральны архетып, першавобраз – <...> выкарыстоўвае для сваёй маніфістацыі амаль ці не ўсе астатнія архетыпы, якія групуюцца вакол яго"[73].

У межах генетычнай тэорыі К. Юнг выявіў сувязь архетыпа з міфалогіяй: "Правобраз або архетып ёсць фігура – будзь то дэман, чалавек або падзея, – якія паўтараюцца на працягу гісторыі паўсюль, дзе свабодна дзейнічае фантазія творцы. Адпаведна гэтаму, мы маем тут у першую чаргу міфалагічную фігуру. <...> у пэўным сэнсе яны [*архетыпы – Л. Д.*] з'яўляюцца сфарміраваннем вялікага тыповага вопыту незлічонага шэрагу продкаў: гэта, так бы мовіць, псіхічныя рэшткі перажыванняў аднаго і таго ж тыпу"[74].

Пра еднасць архетыпічнага і міфалагічнага адлюстравання ў мастацкіх творах Я. Меляцінскі зазначыў: "<...> міф стварае якуюсь новую фантастычную рэальнасць, якая парадаксальным чынам успрымаецца носьбітамі пэўнай міфалагічнай традыцыі як першакрыніца і ідэальны правобраз (г. зн. "архетып", але не ў юнгіянскім, а ў самым шырокім сэнсе слова) гэтых жыццёвых форм"[75]. Увядзенне паняцця "архетып" стала штуршком для новага погляду на творы мастацтва. Гэта паняцце пачало выкарыстоўвацца пры аналізе вобразнай сістэмы літаратурных твораў.

Набор архетыпаў абмежаваны; яны ляжаць у аснове мастацкай творчасці і садзейнічаюць унутранаму адзінству чалавечай культуры, ствараюць магчымасць узаемасувязі розных эпох развіцця і ўзаемадапамогі людзей.

Сур'ёзная ўвага да архетыпічнасці ў мастацтве характэрна для сучасных найноўшых даследаванняў сусветнай літаратуры мінулых і цяперашняга стагоддзяў. Архетыпы знаходзяць адлюстраванне ў творчасці самых розных пісьменнікаў, але, зразумела, у трансфармаваным выглядзе. Да высвятлення ролі аўтара пры распрацоўцы пэўнай мастацкай канцэпцыі звярнулася Т. Шамякіна, якая адзначае: "Мастак – чалавек з дзіўнай чуйнасцю якраз да архетыпаў. Той, хто адэкватна архетыпы выяўляе, робіцца геніем на многія стагоддзі, бо гаворыць пра рэчы, важныя і цікавыя для ўсіх"[76].

[72]Юнг, К.Г. Душа и миф. Шесть архетипов / К.Г. Юнг; пер. А. А. Спектор. – Минск: Харвест, 2004. – С. 209 – 337.

[73]Аверинцев, С. "Аналитическая психология" К.Г. Юнга и закономерности творческой фантазии / С. Аверинцев // *Вопр. лит.* – 1970. – № 3. – С. 138.

[74]Юнг, К.Г. Об отношении аналитической психологии к поэтико-художественному творчеству / К.Г. Юнг // *Зарубежная эстетика и теория литературы XIX-XX вв.: трактаты, ст., эссе* / Моск. гос. ун-т; сост., общ. ред. Г.К. Коссикова. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та , 1987. – С. 229.

[75]*Мифологический словарь / гл. ред. Е.М. Мелетинский.* – М.: *Сов. энцикл.*, 1990. – С. 171.

[76]Шамякіна, Т. Мастацкі вобраз ў літаратуры / Т. Шамякіна // Беларуская літаратура, XI – XX стст.: дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А.І. Бельскі, У.І. Кароткі, П.І. Навуменка і інш. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: ТДА "Аверсэв", 2001. – С. 364.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сказанае вышэй дазваляе зрабіць выснову, што пастаяннае ўзаемадзеянне літаратуры і міфалогіі адбываецца непасрэдна, у форме выкарыстання міфа ў мастацкім творы і апасродкавана – праз жывапіс, рытуалы, народныя святы, фальклор, а ў апошні час – праз навуковыя канцэпцыі міфалогіі, эстэтычныя і філасофскія вучэнні.

Важнае значэнне для тэарэтычных і метадалагічных асноў пры разглядзе пытання архетыпаў літаратурнага твора маюць ідэі рускіх вучоных А.Афанасьева, С. Аверынцава, М. Бахціна, Ю. Борава, В. Халізева, В. Якушавай і інш. Па вызначэнні В. Якушавай, архетыпам з'яўляецца абазначэнне найбольш агульных і фундаментальна-значных пачатковых матываў і вобразаў, якія маюць агульначалавечы характар і ляжаць у аснове любых мастацкіх структур: "Архетып, па сутнасці, з'яўляецца не самім вобразам (або матывам), але яго схемай, валодае якасцю універсальнасці, яднаючы мінулае і цяперашняе, агульнае і прыватнае, тое, якое здзейснілася, і тое, што патэнцыяльна можа здзейсніцца. Гэта праяўляецца не толькі ў мастацкай (ад архаічнага рытуалу і міфа да твораў навейшага мастацтва, у тым ліку літаратуры), але і ў звычайнай псіхічнай дзейнасці чалавека (снах, фантазіях)"[77].

Такім чынам, у літаратуразнаўстве існуюць розныя падыходы да вызначэння паняцця "архетып": адны даследчыкі "разумеюць пад ім матывы, вобразы, якія паходзяць з міфаў, рытуалаў", другія "тлумачаць архетып у паэзіі як ідэю, персанаж, аб'ект, выпадак, якія маюць першасныя, універсальныя рысы і выяўляюцца крытыкамі шляхам параўнальнага аналізу з міфамі і рытуаламі"[78]. В. Рагойша пад архетыпам разглядае універсальны сімвалічны матыў, які існуе ў чалавечай падсвядомасці і выяўляецца адначасова ў культуры многіх народаў. Даследчык адзначае: "У літаратуры архетыпы канкрэтызуюцца ў шэрагу арыгінальных вобразаў, паўтараючыся ў розных нацыянальных пісьменствах і ў розныя перыяды. Так, архетып самаахвярнасці чалавека дзеля іншых людзей увасобіўся і ў класічным вобразе Праметэя, і ў вобразе Сотнікава (з аднайменнай аповесці В. Быкава), архетып вясны, адраджэння знайшоў увасабленне і ў славутых казаннях Кірылы Тураўскага (XII ст.), і ў паэзіі Я. Купалы (XX ст.)"[79]. Трактоўку архетыпа пашырае У. Конан: "Архетыпы – гэта не закончаныя вобразы, а толькі іх апрыёрныя схемы, якія, увасабляючыся ў вобразы, сюжэты і матывы, вар'іруюцца ў многіх рэгіёнах, у творчасці самабытных народаў"[80]. Пры вывучэнні архетыпаў выкарыстоўваюць такія паняцці, як міфалагема, архетыпічныя матывы і інш. Але адным з найбольш распаўсюджаных з'яўляецца паняцце "архетып" як схема вобраза. Такія розныя дэфініцыі можна растлумачыць тым, што выза-

---

[77] Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина. – М.: НПК "Интелвак", 2001. – Стб. 60.

[78] Літературознавчий словник-довідник / Р.Т. Гром'як, Ю.І. Ковалів [та ін.]. – Київ: ВЦ "Академія", 1997. – С. 65.

[79] Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / В. Рагойша. – Мінск: БелЭн., 2001. — С. 41.

[80] Конан, У. Архетыпы нашай культуры / У. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 3. – С. 30.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чэнне гэтага тэрміна К. Юнгам таксама вар'іруецца. Я. Меляцінскі, аналізуючы яго тэорыі, адзначыў, што "юнгаўскія архетыпы <...> ўяўляюць сабой пераважна вобразы, персанажы, у лепшым выпадку ролі і ў значна меншай меры сюжэты"[81]. У дадзеным даследаванні пад паняццем "архетып" падразумяваюцца вобразы-універсумы, якія маюць асаблівасці ўстойлівага (у адносінах да адпаведнай культурнай традыцыі) сэнсаўтварэння, спрыяюць развіццю адпаведнага матыву і яго гістарычнай актуалізацыі ў кантэксце рэцэпцыйнага поля.

У беларускім літаратуразнаўстве пакуль што няма адзінай цэласнай канцэптуальнай працы, прысвечанай праблеме функцыянавання архетыпаў у мастацкай літаратуры Беларусі, дзе быў бы сістэматызаваны фактычны матэрыял, улічаны найноўшыя дасягненні ў галіне псіхалогіі, філасофіі і замежнага літаратуразнаўства. Адно з найбольш грунтоўных даследаванняў – праца У. Конана "Архетыпы нашай культуры", у якой ён робіць спробу прэзентацыі сістэмы архетыпаў беларускай культуры, выкарыстоўвае пры гэтым даследаванні айчынных фалькларыстаў. Аўтар выяўляе вытокі фарміравання архетыпаў, далейшае ж іх функцыянаванне ў мастацкай літаратуры Беларусі паказана фрагментарна. Сярод зааморфных элементаў У. Конан даследуе наступныя архетыпы: ваўка, змяі, казы, каня, жабы, мядзведзя, пеўня і інш.

Тэорыя архетыпаў асабліва актуальная пры аналізе літаратурных твораў сучасных аўтараў. У мастацкіх творах прыгожага пісьменства другой паловы XX стагоддзя сустракаюцца тыя ж анімалістычныя вобразы, што ў фальклоры, літаратурных творах беларускай літаратуры XIX стагоддзя, першай паловы XX стагоддзя, – воўк (ваўкалак) ("Ваўкалак" А. Абуховіча, "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" Я. Баршчэўскага, "Воўк", "Ваўкалак" Я. Купалы і "Ваўкалакі" А. Кажадуба, "Воўк" А. Разанава), сабака ("Апісанне папа, што едзе, і сабакі, што брэша" Д. Рудніцкага і "Балада пра сабаку" М. Арочкі, верш "Сабака" А. Глобуса) і іншыя. Неабходнасць звароту даследчыкаў да архетыпаў можна матываваць тым, што ў літаратуры другой паловы XX стагоддзя шматлікія анімалістычныя вобразы з'яўляюцца традыцыйнымі для беларускай культуры ўвогуле. Сімволіка, асноўны сэнс вылучанага вобраза, што знойдзены і ўвасоблены творцам на інтуітыўным узроўні, якраз і ляжыць у аснове такой з'явы, як архетып. Пэўныя вынікі ў даследаванні ролі і функцыянаванні архетыпаў у фальклоры і літаратуры выкладзены ў асобных працах А. Ненадаўца ("За смугою міфа"[82], "Святло таямнічага вогнішча"[83] і інш.), Т. Шамякінай ("Міфалогія Беларусі"[84] і інш.), І. Чароты ("Пошукі спрадвечнай існасці"[85]).

[81] Литературные архетипы и универсалии / Рос. гос. гуманитар. ун-т; под ред. Е.М. Мелетинского. – М., 2001. – С. 74.

[82] Ненадавец, А.М. За смугою міфа / А.М. Ненадавец. – Мінск: Бел. навука, 1999. – 254 с.

[83] Ненадавец, А. М. Святло таямнічага вогнішча / А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларусь, 1993. – 287 с.

[84] Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі: нарысы / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 398 с.

[85] Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці: беларус. літ. XX стагоддзя ў працэсах нац. самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 159 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Анімалістычныя вобразы ў арнаментах











Электрон... библиотеки ...ГУ имени А. А. Кулешова

Такім чынам, для таго каб паўнавартасна разгледзець мастацкую анімалістыку, неабходны зварот да архетыпаў, якія грунтуюцца на міфатворчай аснове. Вобразы прадстаўнікоў фауны складаюць значны пласт культуры беларусаў, фарміраванне гэтых архетыпаў можна заўважыць у творах вуснай народнай творчасці. Прыкладам матываванага выкарыстання значных архетыпічных форм культуры і быту з'яўляюцца творы класікаў беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, К. Чорнага, У. Караткевіча і інш. Мастацкая анімалістыка складае асабліва багаты ідэйна-тэматычны пласт у літаратуры Беларусі другой паловы XX стагоддзя.

Чалавек і свет жывёл знаходзяць адметнае мастацкае адлюстраванне ў творах В. Казько, І. Пташнікава, Я. Сіпакова, В. Карамазава, У. Караткевіча, А. Разанава, Б. Сачанкі, А. Наварыча, Ю. Станкевіча, П. Панчанкі і інш. Персаніфікацыя навакольнага свету, экалагічнай, духоўнай сувязі паміж усім жывым на зямлі сведчыць пра адзінства светабудовы, успрыманне прыроды, якое прасякнута архетыпічнымі сітуацыямі, вобразамі і матывамі.

Мастацкая анімалістыка застаецца сэнсаўтваральным фонам, на якім фарміруюцца моўныя і культурныя стэрэатыпы, паэтычныя вобразы.

Зварот да гісторыка-культурнага зместу архетыпаў дазваляе вытлумачыць выкарыстанне анімалістычных вобразаў у літаратуры.

Гэта паняцце характарызуецца шматзначнасцю. Тэрмін "мастацкі вобраз" у шырокім значэнні разумеюць як спосаб адлюстравання рэчаіснасці: "мастацкі вобраз – індывідуалізаванае абагульненне, якое раскрывае ў індывідуальным і праз індывідуальнае, у канкрэтна-пачуццёвай форме істотнае для шэрагу з'яў"[86]; "У шырокім разуменні вобразам называюць спецыфічную форму адлюстравання і пазнання рэчаіснасці ў мастацтве, у адрозненне ад тых форм адлюстравання, якімі карыстаюцца, з аднаго боку, у навуцы, з іншага – у штодзённа-практычнай сферы чалавечага жыцця"[87]; "мастацкі вобраз, катэгорыя эстэтыкі, якая характарызуе асаблівы, уласцівы толькі мастацтву спосаб асваення і пераўтварэнне рэчаіснасці"[88], "вобраз літаратурны – асобы спосаб эстэтычнага адлюстравання рэчаіснасці ў канкрэтнай, індывідуальна-пачуццёвай форме"[89]. Анімалістычны свет зрабіўся ў многіх творах самакаштоўным аб'ектам мастацкага адлюстравання, пры гэтым жывёла выступае ў ролі галоўнага героя твора (вобраз сабакі Д'жукі ў апавяданні "Львы" І. Пташнікава).

"У вузкім разуменні пад вобразам разглядаюць спецыяльную форму існавання мастацкага твора ў цэлым і ва ўсіх элементах, якія яго

[86] Бугаёў, Д. Спавядальнае слова: літаратурная крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – С. 201.

[87] Галич, О., Назарець, В., Васильєв, Є. Теорія літератури: підруч. / О. Галич, В. Назарець, Є. Васильєв. – Київ: Либідь, 2001. – С. 96.

[88] Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М.: Совет. энцикл., 1987. – С. 252.

[89] Борев, Ю.Б. Эстетика / Ю.Б. Борев. – М.: Политиздат, 1975. – С. 73.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

складаюць"[90] – адзначаюць украінскія даследчыкі. Так, А. Галіч сярод іншых тыпаў вобразаў (вобраз чалавека, вобраз падзеі, вобраз пачуцця, настрою, вобраз прадмета) асобна вылучае анімалістычны. Дадзеная класіфікацыя заснавана на прынцыпе ўзаемадзеяння аб'екта як дыялектычнай еднасці аб'ектыўнага і суб'ектыўнага і суб'екта як аб'ектыўнага адлюстравання жыцця ў суб'ектыўным яго асэнсаванні[91]. Напрыклад, у аповесці "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі можна вылучыць асобна вобраз чалавека і вобраз дзіка.

Такім чынам, у сучасным літаратуразнаўстве існуюць розныя класіфікацыі мастацкіх вобразаў, дзе асобнае месца, як правіла, займаюць анімалістычныя. Вылучэнне анімалістычных вобразаў як асобай сістэмы ці падсістэмы грунтуецца на аснове іх асэнсавання як з канструктыўнага, так і са змястоўнага бакоў. Беларускія даследчыкі А. Бельскі[92], В. Козіч[93] разглядаюць анімалістыку як неад'емную частку вобразнай сістэмы твораў.

Мастацкая анімалістыка практычна не заўважалася ў савецкім літаратуразнаўстве; анімалістычныя вобразы характарызаваліся часцей як другасныя вобразы твора, якія, часцей за ўсё, разглядаліся як адна з састаўных частак пейзажу. "Адной з асноўных прычын гэтага, – зазначае А. Бельскі ў артыкуле "Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі)", – можна лічыць развіццё беларускай літаратуры пераважна ў сацыялагічным аспекце. Сёння літаратуразнаўцы найперш улічваюць спосабы і формы ўласна мастацкага ўвасаблення рэчаіснасці"[94]. Некаторыя літаратуразнаўцы інакш характарызуюць сэнсаўтваральны аспект мастацкіх твораў беларускай літаратуры. Адзначаецца, што мастацкая анімалістыка дапамагала пераадольваць апісальнасць і вучыла пераглядаць больш чым стогадовыя стандарты. Шукаючы ва ўсім падтэкставасць, сімволіку, асацыятыўнасць, літаратуразнаўства выходзіла на вызначэнне архетыпічнасці вобразаў, падкрэсліваючы, што ў шэрагу твораў анімалістычныя вобразы выконваюць не дапаможную, а самастойную функцыю. Так, А. Макарэвіч у манаграфіі "Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст." адзначае: "Алавяданні Я. Коласа з яго "Казак жыцця" ўяўляюць сабой адлюстраванне чалавека не на аснове іншасказання, эзопавай мовы, а на аснове паралеляў, у якіх і аб'екты прыроды, і

[90]Галич, О., Назарець, В., Васильєв, Є. Теорія літератури: підруч. / О. Галич, В. Назарець, Є. Васильєв. – Київ: Либідь, 2001. – С. 96.

[91]Там жа, с 463.

[92]Бельскі, А.І. Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі) / А.І. Бельскі. // Весн. Беларус. дзярж. ун-та: Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2000. – № 2. – С. 28 – 32.

Бельскі, А. Свет ад травы да зор : беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі.– Мінск: Нар. асвета, 1998. – 223 с.

[93]Козіч, В.І. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе / В.І. Козіч. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 96 с.

[94]Бельскі, А.І. Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі) / А.І. Бельскі. // Весн. Беларус. дзярж. ун-та: Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2000. – № 2. – С. 28 – 32.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чалавек з яго апасродкаванай прысутнасцю роўнавялікія"[95]. Такая новая тэндэнцыя ў літаратуразнаўстве садзейнічае аналізу сістэмы анімалістычных вобразаў, якія разглядаюцца ў розных аспектах (рэалістычным, алегарычным, сімвалічным, псіхалагічным і г. д.). Такім чынам, гаворка можа ісці пра анімалізм як спосаб мастацкага пазнання рэчаіснасці праз адлюстраванне свету жывёл. Анімалізм выяўляецца праз імкненне творцы да стварэння гарманічнага свету суб'ектыўнай свядомасці, знаходзіцца ў прамой залежнасці ад архетыпаў, якія абвяшчаюцца інтуітыўным сродкам разумення рэчаіснасці, і міфалогіі, якая вытлумачвае суб'ектыўны свет.

Такім чынам, тэрмін "мастацкая анімалістыка" дапамагае выявіць ідэйна-тэматычны змест многіх твораў пра жывёл, а таксама, маючы сваю спецыфіку, указвае на адрозненне ў выкарыстанні тэрміна "анімалізм" даследчыкамі іншых сумежных дысцыплін. Можна зрабіць выснову:

– мастацкая анімалістыка – своеасаблівая сістэма вобразаў і матываў фауны, якая грунтуецца на пэўных эстэтычных законах і прынцыпах функцыянавання.

– анімалістыка ўключае ў сябе і падсістэму, якая разглядае анімалізм як спосаб мастацкага асэнсавання рэчаіснасці.

## 1.2. Гістарычна-культурная семантыка вобразаў фауны і станаўленне беларускай мастацкай анімалістыкі

Літаратурная анімалістыка ў беларускай літаратуры ў сучасным разуменні гэтага паняцця пачала фарміравацца ў канцы XIX – пачатку XX стст.[96]

[95]Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст.: манагр. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў: Выд-ва Магілёўск. дзярж. ун-та, 1999. – С. 53.

[96]Гэта можна пацвердзіць вывадамі з даследаванняў беларускай паэзіі, драматургіі, агульнага працэсу руху беларускай прозы. У "Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя" (Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, 1999 г.) агульны працэс руху беларускай прозы пачатку XX ст. прадстаўлены ў выглядзе чатырох "праблемна-тэматычных і метадалагічных плыняў або напрамкаў развіцця": "Першы напрамак звязаны з мастацкай апрацоўкай вусна-паэтычнай творчасці, са зваротам да фальклорнай традыцыі беларускай літаратуры <...>. Другі — лірыка-рамантычны напрамак. Ён адлюстроўвае значны крок наперад у засваенні вусна-паэтычнай традыцыі, наблізіўшы яе да сучаснасці і вызначаецца задачамі мастацкага асэнсавання рэчаіснасці, працэсамі паэтызацыі і лірызацыі прозы, няхай яшчэ і ў межах суб'ектыўнасці і ўмоўнасці. Трэці напрамак звязаны з развіццём сентыменталізму ў беларускай літаратуры як пераходнай стадыі ад фальклорнай тардыцыі да рэалізму, да пошуку новых шляхоў і сродкаў для стварэння вобразаў народных герояў, народных характараў у літаратуры. І нарэшце, апошні, чацвёрты накірунак — гэта рэалістычная лінія ў развіцці беларускай прозы <...>" [Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. - Мінск: Беларуская навука, 1999. – Т. 1: 1901-1920 г. / навук. рэд.: І.Я. Навуменка, В.А. Каваленка. - С. 34].

Больш падрабязна гэтыя "метадалагічныя плыні" разглядае А. Макарэвіч, які выдзяляе наступныя: 1) рамантычна-фальклорная, 2) гумарыстычная (фальклорна-гумарыстычная, уласна-гумарыстычная, 3) лірыка-рамантычная, 4) рэалістычная, 5) сатырычная, 6) філасофская, 7) гістарычная, 8) фантастычная [Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст.: манагр. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў: Выд-ва Магілёўск. дзярж. ун-та, 1999. – С. 7]

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і развівалася ў чатырох кірунках: 1) рэалістычны (адлюстраванне ў творах рэальных ўзаемаадносін чалавека з прыродай, дзе жывёлы паўстаюць як канкрэтныя рэаліі); 2) алегарычны кірунак; 3) фантастычны кірунак; 4) псіхалагічны (псіхалагізацыя вобразаў жывёл з мэтай пастаноўкі вострых сацыяльна-маральных праблем жыцця)[97].

*Паводле першага кірунку*, анімалістычныя вобразы, прадстаўленыя ў рэалістычным апісанні, даволі часта сустракаюцца ў сусветнай літаратуры. Іх выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці такія вядомыя пісьменнікі-анімалісты, як В. Біянкі, Э. Сетан-Томсан і іншыя. *Рэалістычны* паказ прадстаўнікоў фауны прысутнічае ў творах паляўнічай тэматыкі. Даволі часта пісьменнікі выкарыстоўваюць вобразы жывёл пры стварэнні падзейнага фона.

Карані паляўнічай тэмы ў літаратуры Беларусі ўзыходзяць да старажытных часоў. У паэме "Песня пра зубра" М. Гусоўскага апавядаецца пра ловы, што з'яўляюцца любімым адпачынкам князя Вітаўта. Зубр у творы – цар беларускіх лясоў і пушчаў. М. Гусоўскі ідэалізуе гэтага звера.

Надзелены незвычайнай сілай, з аднаго боку, зубр – звер міралюбівы, бяскрыўдны, калі яго не зачапіць, не патрывожыць, з другога, – люты, бязлітасны, калі гаворка ідзе пра абарону пры нападзе ворагаў. Аўтар надзяляе зубра адметнымі рысамі: здольнасцю думаць, рэагаваць на дабро і зло.



Мал.13. Зубры, 1956. М. Беляніцкі

[97]Дадзены тэрмін ужываецца як умоўны для абазначэння аднаго з позніх кірункаў, які пачаў фарміравацца толькі ў другой палове XX стагоддзя. Больш падрабязна гэта кірунак будзе разглядацца ў кантэксце 2.1. *Сістэма анімалістычных вобразаў у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Апісанне зубра ў паэме вызначаецца высокім узроўнем мастацкасці:

Водзіцца зубр у дрымучых лясах на землях літоўскіх,
Ён грамадны і ў рост, і ўпапярочкі, і ўздоўж.
Так што калі сканае ад ран, унурыўшы голаў,
Сядуць да трох малайцоў купай адной між рагоў [98].

Разам з тым адзначым, што акрамя праўдзівага апісання знешняга выгляду, паводзін прадстаўнікоў фауны пры рэалістычным апісанні прысутнічаюць і іншыя характарыстыкі вобраза. Вобраз прадстаўніка беларускай фауны зубра з'яўляецца нацыянальным сімвалам Беларусі, мастацкім сведчаннем яе магутнасці і велічы.

Аўтар падрабязна распявядае пра ловы на зубра, сцвярджае, што адолець волата можа не толькі спрытнасць і адвага, але разважлівасць і тонкае веданне звычак звера:

Новы загон не заўсёды кладуць. Старыя загоны
Пасткаю служаць, і там ёсць не адзін праход.
Звер хай у пастку ідзе, закрыць жа праходы няцяжка;
Хай бестурботна затым пасвіцца, рады жыццю.
Гэтак замкнутых зуброў палюем, замкнёныя самі,
І невядома, адкуль выскачыць смерць на цябе.
Тут перад ліхам нічым не паможаш і блізкаму сябру,
Слуг каля пана няма, каб ратаваць ад бяды.
Бацьку не выручыць сын, і бацька не выручыць сына:
Кожны заданне сваё здзейсніць павінен найлепш.
Можаш застацца жывым, а можаш раптоўна загінуць,
Нават нікчэмны пралік шмат будзе вынікаў мець[99].

Яркай старонкай у беларускай літаратуры сталі "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся" Я. Лучыны. У творы гаворка ідзе пра асаблівасці палявання на ласёў, ваўкоў, глушцоў, мядзведзя, паказаны паляўнічыя традыцыі палешукоў. Так, на ласёў ловы ладзяцца на Куццю (вопытны лоўчы Грышка прапанаваў пану ісці на ловы менавіта ў гэты час: "Куцця, паночку, заўтра, трэба ў поле рушыць, // Вялося так спрадвеку"[100]), на глушцоў – пасля Вялікадня ("Хвала Хрысту!" – "Навекі!" – "Пэўна, пан Рыгора // Чакаў ужо і на глушцоў не здоўжыць збораў? // Сяк-так, дзе скокам, бокам, спрыту надтачу – // І тут, да ног увесь сцялюся панічу"[101]). У "Паляўнічых акварэльках з Палесся" раскрыты некаторыя паляўнічыя сак-

[98]Гусоўскі, М. Песня пра зубра. / М. Гусоўскі; пер. з лацін. У. Шатона. – Мінск: Беларус. гуманітар. адукац. культур. цэнтр, 1994. – С. 11.
[99]Там жа, с. 27.
[100]Лучына, Я. Творы: вершы, нарысы, пер., лісты / Я. Лучына; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. – Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 54.
[101]Там жа, с. 70.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэты, адзін з іх – лоўля на глушца. Грышка расказвае, што для гэтага трэба затаіцца ў лесе прыкладна на тым месцы, дзе бывае птушка, потым ціха падабрацца да яе і стрэліць:



Мал. 14. Зубр, 1920-я гг. Л. Бруні

Вось чую зык... выразны...
то ж глушцова песня!..
Няма сумнення!..
Бы падушка, мох у лесе,
Зраблю два крокі асцярожна і далей
Набліжуся настолькі ж як мага цішэй,
З паспехам і трывогай кіраваў да току,
Дыханне стрымліваў сваё на кожным кроку.
<...> Ужо час!..
Прыцэліўся: стрэл грымнуў, дым пайшоў,
Хіснуўся птах, з асіны каменем далоў,
Галіны ломячы, і ў шэры мох аж бухнуў,
За ім ляцяць сукі сухія, пацяруха[102].

Рэалістысныя замалёўкі сцэн палявання раскрываюць спецыфіку кожнага з відаў ловаў. Своечасовае рэагаванне на нечаканае з'яўленне лася – залог поспеху паляўнічага:

Дрыжэў я нібы ў трасцы, прыбліжаўся звер.
Як трапным стрэлам прывітаць яго цяпер?
Змагаўся я з сабой... Рука мая трымцела,
Нарэшце нейкі момант вытрымаў на цэлі...
Пальнуў...
Лось – дыба, павярнуўся, потым скок...
Раздаўся стрэл другі... Памкнуўся лось ўбок,
Хіснуўся... на калені ўпаў нечпадзявана[103].

Дэталёвае апісанне сцэн збору і палявання на звяроў, наяўнасць рэалістычных анімалістычных вобразаў дазваляе характарызаваць зборнік "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся" Я. Лучыны як своеасаблівую беларускую паляўнічую энцыклапедыю.

Што датычыцца *алегарычнага* кірунку, для яго характэрна наяўнасць анімалістычных вобразаў іншасказальнага характару, якія вельмі праўдападобныя, скапіраваныя ў многім з чалавечых паводзінаў і якія маюць характар мастацкага ўвасаблення. Алегарарычнае асэнсаванне анімалістычных вобразаў з'яўляецца самым даўнім сярод іншых спосабаў паказу

[102]Лучына, Я. Творы: Вершы, нарысы, пер., лісты / Я. Лучына; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. – Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 75.

[103]Там жа, с. 64.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэчаіснасці. У. Каяла адзначае: "Менавіта падчас паўсядзённай працоўнай дзейнасці чалавек непасрэдна сутыкаўся з жывёльным светам. Яго анімалістычныя ўяўленні і стварылі ўмовы для з'яўлення жывёльнага эпасу. Пазней, пры дыферынцыяцыі гэтага эпасу, вылучыліся казка пра жывёл і байка"[104]. Даследчык звяртае ўвагу на тое, што развіццё жывёльнага эпасу разгортвалася паводле трох "этапаў": казкі пра жывёл, прытчы і байкі[105]. Вобразы жывёл, якія прадстаўлены ў такіх жанрах, маюць алегарычны характар. Пры дапамозе іх паказаны і ўвасоблены чалавечыя ўчынкі, паводзіны. Паводле гэтых казак, за жывёламі замацаваліся пэўныя характарыстыкі. Створаныя ў іх анімалістычныя вобразы з'яўляюцца алегорыямі на чалавечыя характары, узаемаадносіны паміж людзьмі: казкі "Коцік і пеўнік", "Пра мужыка і лісу".

Вобразы жывёл у сваёй алегарычнай форме знайшлі выкарыстанне ў беларускай байцы: "Ястраб, лісіца і певень" (1913), "Груган і салавей" (1914) Я. Купалы, "Варона і чыж" (1915) М. Багдановіча.

Алегарычныя вобразы жывёл прысутнічаюць у творах Я. Коласа (цыкл апавяданняў "Казкі жыцця"), Ядвігіна Ш. (апавяданні "Павук", "Вяселле", "Сініца") і іншых пісьменнікаў .

Адным з яркіх узораў твораў мастацкай анімалістыкі з'яўляюцца "Казкі жыцця" Я. Коласа, у якіх шырока выкарыстаны анімалістычныя вобразы-сімвалы; вобразы-алегорыі чалавечых характараў. Свет фауны, які паўстае са старонак коласаўскіх твораў, шматлікі і разнастайны. Анімалістычныя вобразы прадстаўлены наступнымі тыпамі: рэаліі прыроды (ваўкі, совы, вароны), алегарычныя вобразы (страказа), вобразы-сімвалы (крумкач – сімвал мудрасці).

Алегарычныя вобразы пчол прадстаўлены ў апавяданні Я. Коласа "Калода пчол". Наяўнасць іх ва ўласнай гаспадарцы здаўна лічылася паказчыкам дабрабыту, пчолы сімвалізавалі добра ўладкаваную гаспадарку. Дарэчы, пчолы непасрэдна не фігуруюць у апавяданні. Рэцыпіент успрымае іх вобраз у кантэксце гутаркі трох гаспадароў, што надумаліся купіць калоду пчол у агульную гаспадарку. Бытавая сцэна, якая разгортваецца вакол набыцця пчалінага вулея, у творы напоўнена добрым гумарам. Алегарычныя навелы, прытчы, навелістычныя казкі, якія складаюць зборнік "Казкі жыцця", уключаюць вялікую колькасць вобразаў фауны. Выбар прадстаўнікоў жывёльнага свету ў кожным з твораў заўсёды не выпадковы, мае сваю матывіроўку і абапіраецца на фальклорна-казачную і літаратурную традыцыі.

У апавяданні "Як птушкі дуб ратавалі" птушыны свет паказаны з двух бакоў. Адны з птушак жадаюць выратаваць дуб. Іншыя ж увасабляюць сабой усё цёмнае, ганебнае – гэта тыя, хто згодны з гібеллю дрэва. Я. Колас у выбары прадстаўнікоў добрых і злых сіл прытрымліваецца славянскай фальклорнай

---

[104]Каяла, У.І. Праблемы станаўлення і развіцця жанру беларускай байкі: аўтарэф. дыс... канд. філал. навук: 10.01.01 / У.І. Каяла; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст, 1997. – С. 7.

[105]Там жа, с. 7 – 8.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

традыцыі: добрыя сілы ўвасабляюць голуб, бусел, а злыя – сарокі, галкі, вароны (яны сімвалізуюць усё дрэннае, нават пачварнае). Невыпадковы тут і выбар дрэва, бо, паводле даследаванняў А. Афанасьева, у фальклорным запасе славян існуе моцная сувязь птушак з дубам.

Пра ўменне змагацца за сваё жыццё і апавяданні "Страказа", "Асінае гняздо". У першым з гэтых твораў маленькая стракозка гіне, бо не здолела супрацьстаяць стыхіям: "Узышоўшае праз некалькі дзён гарачае сонца ўжо не магло ажывіць зусім акалелую стракозку"[106]. Філасофскі вывад пададзены ў канцы гэтага твора: "На свеце вечнага няма нічога. Жыццё мяняецца. Адна яго форма змяняе другую, і так бесперастанку – такі ўжо закон жыцця"[107]. Страказа не змагла разумна ацаніць абставіны, у якіх яна апынулася, загінула з-за сваёй саманадзейнасці і бяздзейнасці. Другі твор – "Асінае гняздо" – мае аптымістычны фінал: скарыстаўшы свае джалы, набраўшыся смеласці, мошкі здолелі супрацьстаяць ненавісным восам. Апавяданне "Асінае гняздо" багатае на вобразы насякомых – гэта і восы, і пчолы, і камары, і мухі, і мошкі, і шэршні. Рашучасць і воля ў дасягненні мэты – рысы, якія з'яўляюцца спадарожнікамі пераможцаў.

Прадаўжаюць маральную тэматыку коласавага цыкла апавяданняў мастацкія творы "Гусі" і "Купальскія светлякі". Выкарыстоўваючы сімвалічныя вобразы гусей, светлякоў, пісьменнік спрабуе разважаць над сэнсам жыцця, магчымасцямі чалавека. У прытчы "Гусі" аўтар асэнсоўвае праблему супрацьстаяння жыццёвым абставінам. У пэўных выпадках (такая думка праводзіцца ў творы), калі быць аптымістам, змагацца да канца, можна адкрыць у сабе новыя магчымасці, якія будуць спрыяць дасягненню канчатковай мэты: "Маўчы! – сказаў гусак, што вёў усю чараду, – без змагання і няўдач нічога не даецца на свеце"[108].

Такім чынам, вобразы жывёл у творах Я. Коласа, паўстаюць не толькі як элементы пейзажных замалёвак, але і з'яўляюцца алегорыямі, сімваламі характараў людзей і сацыяльных абставін.

Анімалістычныя вобразы, якія складаюць *фантастычны* кірунак у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя, маюць міфалагічныя карані, яны ўвасобіліся ў літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзя.

Ужо з класічнай літаратуры выкарыстоўваецца адметны і загадкавы вобраз змяі. Зрэшты, гэтая зааморфная істота прысутнічае амаль ва ўсіх міфалагічных сістэмах. Гісторыка-культурны змест згаданага вобраза шматаспектны. Па-першае, даследчыкі А. Афанасьеў, В. Іваноў, В.Топараў лічылі змея ўвасабленнем пэўных прыродных сіл (міфалагічны падыход). Па-другое, Б. Рыбакоў, В. Проп

[106]Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас – Мінск: Маст. літ., 1973. – Т. 4. Апавяданні 1906 – 1917. – С. 564 – 565.

[107]Там жа, с. 564.

[108]Там жа, с. 501.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

спалучалі эвалюцыю вобраза змяі з падзеямі ў гісторыі чалавецтва (гістарычны падыход). У беларускай літаратуры вобраз змея паўстае ў міфалагічным асэнсаванні ў творчасці М. Багдановіча (верш "Змяіны цар"), А. Разанава ("Танец з вужакамі") і інш.

Верш "Змяіны цар" са зборніка "Вянок" М. Багдановіча не адзіны твор, які паэт прысвяціў міфічнай істоце ("Вадзянік", "Русалка"). У беларускай міфапаэтычнай традыцыі Змяіны цар фігуруе часта пад рознымі назвамі: Змей-Волат, Змей-Страшыдла, Цар-Змей. "Над усімі гадамі ёсць цар. Пад яго асабістым начальствам змеі ідуць на зімовую спячку", – адзначае фальклярыст А. Багдановіч[109]. Паводле беларускіх паданняў, Змяінага цара можна пазнаць па залатых рожках на галаве: "Ён па велічы большы за ўсіх іх, луска яго адлівае серабром і золатам, на галаве яго карона з маленькіх залатых рожак"[110].

Факты такога падання адлюстраваны і ў зборніку фантастычных апавяданняў Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях". Герой адной з гісторый, Сцяпан з апавядання "Вужовая карона", аднойчы сустрэў змяінага цара: "Страчае Сямён такога велізарнага вужа, якога ніколі не бачыў. Той смела поўзае, а на ягонай галаве зіхаціць золата. Сямён раскінуў белую хустку перад ім і ўкленчыў. Вуж скінуў з галавы Карону на хустку і папоўз далей, а за ім іншыя вужы хутка схаваліся за гарою. З радасцю разглядаў Сямён залаты скарб, падобны на два лісцікі, што зрасліся канцамі"[111].

У апавяданні Я. Баршчэўскага герою твора стала шанцаваць на паляванні пасля таго, як ён сустрэў вужовага цара і разаслаў перад ім абрус. Паводле паданняў той, хто сустрэне такую пачвару і рассцеле перад ёй абрус, можа атрымаць дар ад вужовага цара. "А калі ўдасца сустрэць змяіны "вырай", і разаслаць перад Змяіным царом абрус, і пакласці хлеб-соль, і пакланіцца яму да зямлі, то ён, прапаўзаючы цераз абрус, у знак падзякі скіне з галавы адзін залаты ражок. Хто мае такі ражок, той надзелены надзвычайнай мудрасцю і праніклівасцю, так што ў стане ўгадваць чужыя думкі, даваць тлумачэнні, выблытвацца з самых цяжкіх абставінаў"[112].

У творы пераплецены язычніцкія і хрысціянскія погляды, але пры гэтым перамагае хрысціянская пазіцыя. Сямёну стала не шанцаваць на паляванні, калі ён пацалаваў крыж: "І ледзь пацалаваў крыжык, як тут з травы падняў галаву велізарны вуж, нібыта хацеў зірнуць на Марысю. Перапалоханая дзяўчына закрычала. Сямён схапіў камень і выцяў вужа. Той, сыкаючы, схаваўся ў траве. А пасля раптам з'явіўся чорны сабака, загаўкаў і знік. Марыся ад страху

[109] Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этногр. очерк. / А.Е. Богданович – Гродно: Губерн. тип., 1895. – С. 33.

[110] Там жа, с. 33.

[111] Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – С. 123 – 124.

[112] Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этногр. очерк. / А.Е. Богданович – Гродно: Губерн. тип., 1895. – С. 33.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Гербы населеных пунктаў Віцебскай вобласці



г. Верхнядзвінск



г. Гарадок, Гарадоцкі раён



г.п. Відзы
Браслаўскага раёна



г.п. Копысь
Аршанскага раёны



г.п. Паставы



г. Міёры



г.п. Расоны



г.п. Падсвілле
Глыбоцкага раёна

дрыжыць ледзь жывая. Сямён правёў яе дадому і адтуль зноў ідзе на паляванне. Толькі не сустрэў яго ў лесе чорны сабака.

Убачыў цецерука; стрэліў, але заместа птушкі – пень гнілы ўпаў на зямлю"[113].

Падобная сітуацыя – сустрэча са Змяіным царом – сустракаецца ў вершы М. Багдановіча "Змяіны цар":

Ў полі, ў лесе нам усюды
Праляглі дарожкі!
Йстужкай рушымся між пушчы,
На сам перад – я.
Зіхацяць маёй кароны
Залатыя рожкі,
Цёмным блескам адлівае
Ўся луска мая [114].

Адной з адметнасцей верша з'яўляецца тое, што ён напісаны ад першай асобы, ад імя Змяінага цара:

Нам не трэба ні ад чога
Ноччу абароны:
А спаткаем чалавека, –
Порт рассцеле ён;
Залаты ражок яму
Я ўраню з кароны,
І па белай палатніне
Дальш мы папаўзём[115].

У дадзеных творах Я. Баршчэўскага і М. Багдановіча выкарыстана паданне пра Вужовага цара, але ў міфапаэтычнай творчасці беларусаў пашырана яшчэ адна трактоўка гэтага вобраза. Змяя выступала, з аднаго боку, як жаночы пачатак, сімвал урадлівасці, з другога – мужчынскі пачатак, які мае магчымасць апладніць. "Паводле старажытных павер'яў, змяя ажыццяўляе раз'яднанне і злучэнне неба і зямлі <...>", – адзначае М. Макоўскі [116].

У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя вобраз змяі сустракаецца ў вершах "Жанчына..." У. Някляева, "Танец з вужакамі" А. Разанава. Адна з асаблівасцей міфалагемы змяі ў названых творах – выкарыстанне дуалістычнай пары, якая сімвалізуе процілегласці:

---

[113]Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – С. 125.

[114]Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч; пад рэд. А.А. Лойкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, даследаванні, чарнавыя накіды. – С. 56.

[115]Там жа, с. 56.

[116] Маковский, М.М. Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках. Образ мира и миры образов / М.М. Маковский. – М.: Владос, 1996. – С. 179.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І будуць дзве чорных гадзюкі
За мною
Паўзці.
Дагоніць адна з іх –
Ударыць маланкаю лютай.
Дагоніць другая –
І высмакча з раны атруту.[117]
("Жанчына...")

Дзве змяі – тая, якая атручвае, і тая, якая лечыць, – сімвалізуюць сілы дабра і зла, агня і вады, сувязі і раз'яднання ў вершы "Танец з вужакамі" А. Разанава:

А з мора ўжо вынырнулі дзве вужакі – дзве неспатольныя помсты. Яны апантана накідваюцца на мяне, абкручваюць слізкімі шчыльнымі звівамі, пстрыкаюць джаламі ў самы твар <...>[118].

У душы паэта ідзе змаганне дабра са злом, як вынік гэтай барацьбы – творчасць:

Я аддзіраю іх ад сябе, я душу іх рукамі, тапчу нагамі, кручуся, уюся, крычу...[119].

Верш А. Разанава "Танец з вужакамі" дубліруе назву зборніка вершаў; у творы гучыць тэма паэта і паэзіі: "Змаганне захоплівае мяне: яно раз- // нявольвае ўсе мае здольнасці, яно абу- // джае ўсе мае сілы, яно становіцца тан- // цам, яно становіцца святкаваннем, яно // тчэ з маіх рухаў свой непаўторны ўзор. // Я ашчаджаюся ад яго. І чакаю яго. // <...> Навокал, з усіх бакоў, збіраюцца // гараджане. // Нібыта прыцягнутыя магнітам, яны // глядзяць на мой адчайны міжбой, на // мае пагібельныя вымогі... // Якое відовішча!... – у захаплен- // ні, я чую, гамоняць яны. – // Мы першы раз назіраем такі напру- // жаны рытм, // мы першы раз бачым такі выкштал- // цоны танец"[120].

Вобраз змяі прысутнічае ў творах паэтаў і празаікаў XIX – XX стагоддзяў. Такім чынам, калі ў XIX – пачатку XX ст. у творах фантастычнага кірунку выкарыстоўваўся міф пра Змяінага цара, у другой палове XX ст. вобраз змяі прысутнічае ў творах на філасофскія тэмы, сімвалізуе дваістасць асобы, пошук ісціны.

[117]Някляеў, У. Знак аховы: вершы / У. Някляеў. – Мінск: Маст. літ., 1983. – С. 50.
[118]Разанаў, А. Танец з вужакамі: выбранае / А. Разанаў. – Мінск: Маст. літ., 1999. – С. 273.
[119]Там жа, с. 273.
[120]Там жа, с. 273.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Каштоўнасць літаратурнай анімалістыкі вынікае з наяўнасці багатай сістэмы анімалістычных вобразаў. Фауна ў творчасці беларускіх празаікаў і паэтаў прадстаўлена вобразамі звяроў, свойскіх жывёл, шматлікага птаства. Пры аналізе гэтых вобразаў неабходна зрабіць гістарычна-культурны экскурс, выявіць міфалагемы дзеля таго, каб больш дакладна вызначыць іх сэнсаўтваральную ролю ў мастацкім творы.

Станаўленне мастацкай анімалістыкі ў беларускай літаратуры найперш звязана з вобразамі свойскіх жывёл. Шырока распаўсюджанымі тут з'яўляюцца вобразы каня, каровы (Я. Колас, Я. Купала, К. Чорны, Я. Сіпакоў, В. Казько і інш.), сабакі, ката, свінні (Л. Калюга, Ядвігін Ш., І. Пташнікаў, У. Караткевіч, Я. Сіпакоў, М. Арочка, В. Зуёнак, А. Глобус і інш.).

Сярод дзікіх звяроў у беларускай мастацкай свядомасці найбольш прадстаўлены вобраз ваўка: да адлюстравання гэтай жывёлы звярталіся Ф. Багушэвіч, Я. Колас, Я. Купала, У. Караткевіч, А. Жук, А. Сыс, В. Панін і інш. Не менш значнымі з'яўляюцца вобразы аленя, лася, зубра, дзіка. Беларускія аўтары (Я. Лучына, І. Пташнікаў, С. Грахоўскі, У. Караткевіч і інш.) выкарыстоўвалі гэтых прадстаўнікоў фауны ў творах на паляўнічую тэму.

Значную ролю ў беларускай мастацкай анімалістыцы адыгрываюць арніталагічныя вобразы птушак (жураваль (Я. Колас, М. Танк, А. Пысін, А.Жук, Я. Сіпакоў, М. Аўрамчык і інш.), зязюля (М. Танк, Р. Барадулін, В. Вітка, П. Панчанка, В. Зуёнак і інш.), жаўранак (У.Караткевіч, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, В. Гардзей, А. Пысін і інш.) і інш.).

Адзін з адметных вобразаў беларускай мастацкай анімалістыкі – вобраз каня. У творах Я. Коласа і К. Чорнага даюцца рэалістычныя апісанні гэтай жывёлы. Разам з тым яна з'яўляецца сімвалам сялянскай гаспадаркі, працавітасці беларуса. Даволі часта ў творах праводзіцца паралель паміж земляробчай доляй селяніна і лёсам яго памочніка. Напрыклад, у вершы "Араты" М. Ганчарыка:

З гора спяваючы песню маркотную,
Лейцы ў руках мазалістых трымаючы,
Ціха ідзе ён за сошкай сагнуўшыся,
Долю сваю тут у полі шукаючы.

Конік старэнькі чуць цягне дрыжачую,
Матку-карміліцу, сошку драўляную,
Сам жа араты наш, ею кіруючы,
Шчыра ўзрыхляе зямельку жаданую[121].

[121]Анталогія беларускай паэзіі: у 3 т. / рэдкал.: Р. Барадулін і інш. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 1: Вершы і паэмы. – С. 579.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вобраз аратага адлюстраваны ў творчасці Я. Купалы (верш "Араты"), Я. Коласа (верш "На ніве") і інш.

Між тым, вобраз каня шматзначны ў міфалогіі і фальклоры індаеўрапейскіх народаў. Так, у індаеўрапейскай міфалогіі гэты вобраз прыбліжаны і да багоў[122], а часам і да чалавека (кентаўр). У беларускай міфатворчасці вобраз каня звязаны з яго апекуном – Ярылам[123].



Мал. 15. Ярыла на кані – матыў традыцыйнай вышыўкі. XX ст. Мінская вобласць

Пра значнасць каня для беларусаў сведчыць той факт, што яму надаецца вялікая ўвага ў пахавальным абрадзе. Косткі прадстаўнікоў фауны траплялі ў курганы ў якасці ахвяр нябожчыку, не менш як рэшткі трызны. Самыя раннія і найбольш распаўсюджаныя з гэтых знаходак – захаванні каня. На тэрыторыі Беларусі фауністычныя знаходкі сустракаюцца ў старажытных курганах. Даследчык Л. Дучыц яшчэ ў 1997 адзначыла: "На тэрыторыі Беларусі ўлічаны 8 курганных пахаванняў, дзе ёсць косткі каня"[124]. Гэта сведчыць пра тое, што для абраднасці продкаў быў уласцівы культ каня, які быў адной з самых шанаваных жывёл у духоўным жыцці чалавека.

Вядома, што адной з фальклорных крыніц, дзе сустракаюцца анімалістычныя вобразы, з'яўляюцца казкі пра жывёл. У іх, паводле назіранняў І. Крука, вобраз каня сустракаецца даволі рэдка: "Конь не стаў папулярным героем казак пра жывёл, мабыць, таму, што ён быў уласнасцю не толькі земляробца, але і воіна"[125]. Вобраз каня даволі пашы-

[122] У гэтым сэнсе вобраз каня звязаны з салярным культам, вобраз бога сонца на кані з'яўляецца агульным для індаеўрапескіх народаў.

[123] Як адзначае П. Шпілеўскі, на Беларусі яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя захавалася свята ў гонар Ярылы. Дзяўчыну, апранутую ў белае адзенне, саджалі на белага каня, якога прывязвалі да слупа. Астатнія дзяўчаты вадзілі карагод і спявалі песні ў гонар Ярылы.

[124] Дучыц, Л. Жывёлы і птушкі ў пахавальным абрадзе курганоў Беларусі / Л. Дучыц // Беларусь у сістэме еўрапейскіх культурных сувязях: гіст.-археал. зб. – 1997. – № 11. – С.147.

[125] Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2000. – С. 65.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раны ў чарадзейных казках. Конь тут выконвае функцыю памочніка героя ў яго паходах, подзвігах ("Іван-дурак дванаццаць кабыліц пасвіў", "Залатое пяро").



Мал. 16. Галава каня, каля 1596 – 1597. Дж. Чззары

Прыпадабняючы адны з'явы да другіх і параўноўваючы іх паміж сабой, нашы продкі бачылі аналогіі там, дзе сучасны чалавек заўважае іх з цяжкасцю. Так, імклівы рух ветру, маланкі, грому, вады і каня ўспрымаліся аналагічнымі, здольнымі замяніць адзін аднаго. "Такое ж уражанне хуткага руху, якое парадніла стыхійныя з'явы з птушкамі, прымусіла зблізіць іх з лёгканогім канём... <...> Таму ўсе з'явы прыроды, якія ўяўляюцца птушкамі, пераніфікаваліся і ў вобразе цудоўных коней", – адзначае А. Афанасьеў[126]. Адносна мастацкай творчасці М. Эпштэйн заўважае: "Значэнне каня ў лірычнай паэзіі вызначаецца не толькі старажытнасцю міфалагічных традыцый, у якіх іншыя жывёлы – карова, авечка, змяя, воўк, мядзведзь – адыгрываюць не менш значную ролю. Галоўнае – не тыя прыродныя стыхіі, якія персаніфікуюць каня, а магчымасць лірычнага героя ўладарыць над імі пры дапамозе каня"[127]. Такое ўвасабленне вобраза каня ў дынаміцы ўпершыню сустракаецца ў беларускай класічнай паэзіі ў творчасці М. Багдановіча: "<...> У белай пене праносяцца коні, // Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць <...>" ("Пагоня"[128]).

[126]Афанасьев, И.Н. Кто восходит на Голгофу?: антивоен. идея в творчестве В. Быкова / И.Н. Афанасьев. – Минск: Маст. літ, 1993. – С. 143.

[127]Эпштейн, М.Н. Природа, мир, тайник вселенной...: система пейзаж. образов в рус. поэзии / М.Н. Эпштейн. – М.: Высш. шк., 1990. – С. 93.

[128]Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / пад рэд. А.А. Лойкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, даследаванні, чарнавыя накіды. – С. 314.



Шарыкаў. 1999. А. Смаляк



Вераб'і. 2001. А. Смаляк

Паступова вобраз каня ў беларускай літаратуры трансфармаваўся і набыў іншае сэнсавае гучанне. Гэта не проста памочнік героя ў пэўных яго гераічных учынках, а і спадарожнік беларуса-земляроба; ён разам з чалавекам-працаўніком раздзяляе яго надзённыя клопаты па гаспадарцы. Прыкладам гэтаму можа паслужыць вобраз каня ў аповесці "Адшчапенец" Я. Коласа, раманах "Бацькаўшчына" К. Чорнага, "Вязьмо" М. Зарэцкага.

Ствараючы вобраз каня, як і ўвогуле вобразы прыроды, К. Чорны праводзіў паралелі з характарыстыкай вобраза яго гаспадара. Ад матэрыяльнага становішча залежала тое, які конь быў у селяніна. Чорнаўскаму герою з рамана "Бацькаўшчына" дастаўся худы, знясілены конь, які "адбрыкаў сваю маладосць і адрабіў сваю сілу ў Сурвілы, а да Гушкі прыйшоў дажыць сваю апошнюю старасць"[129]. Леапольд Гушка на сваім шляху мала бачыў добрага. На першых старонках рамана аўтар знаёміць нас з цярплівым, цягавітым у працы чалавекам, які аддае ўсе свае сілы апрацоўцы камяністай дзялянкі. Тут жа некалькімі штрыхамі вымалёўваецца яго партрэт: відаць, што гэта высокі, моцны ў плячах чалавек, з цяжкім зямлістым голасам. Пісьменнік не канцэнтруе вялікай увагі на фізічным стане героя, яго знешнім выглядзе. У творы няма разгорнутага апісання постаці селяніна, але можна ўявіць, што гэтая постаць мае падабенства з асаблівасцямі постаці каня, схуднелага, знясіленага ад цяжкай працы. Праводзячы гэту паралель, К. Чорны выкарыстоўвае трапныя параўнанні: "Гаспадар усё цягавіта і цярпліва, як вол у ярме, пагукваў на свайго каня, конь пяўся, выцягаўся, як мокрая п'яўка"[130]. Абодва яны "запрэжаны" працаваць ад раніцы да ночы, гэтая руціна была паўсядзённай, безвыходнай. Кожны з іх мог толькі марыць пра адпачынак: "Гэтак яны ўдвух поўзалі па гэтай камяніцы, аж пакуль не прыгнуўся сашнік, скрыгануўшы аб падземны камень, і не парваўся пастронак. Конь, відаць, прывык даўно да гэтай радасці: ён адразу спрытна, не па гадах і сіле сваёй, падаўся назад, але раптам зноў звяў... Адна нага папстрыквала ў калене, сама па сабе, як на спружыне, пакуль ён не аддыхаўся"[131].

Усё жыццё Леапольда Гушкі складалася з будзённых тыдняў, месяцаў, гадоў пастаяннай працы на зямлі. Працаваў ён для таго, каб далейшае жыццё было лепш. У рамане ёсць такі момант. Пасля доўгіх перашкод Гушкаву сям'ю ўрэшце напаткалі добрыя змены: камяніца была апрацавана, у хаце з'явілася мэбля, смутак пра сына Адася прыглушвалі думкі пра шчасце дачкі. Але Гушка пачаў адчуваць, што яго шчасце ўяўнае, і гэтая трывога асабліва пачала ўзрастаць, калі раптам сканаў яго конь. У самы, здавалася, шчаслівы дзень Гушкі (дзень вяселля яго дачкі) "немагушчая жывёліна" адмовіла гаспадару ў працы і, прыплёўшыся ў перадсмяротнай агоніі з хвойніку, сканала перад

[129] Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны – Мінск: Мас. літ., 1973. – Т. 4: Аповесці і раманы. – С. 301 – 302.

[130] Там жа, с. 301.

[131] Там жа, с. 301 – 302.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ганкам. Разам са стратай каня гэты селянін аддаляецца ад мары зажыць па-чалавечы на ўласным кавалку зямлі. Апісанне смерці каня з'яўляецца прадвесцем будучага краху:

"<...> Раптам Леапольд Гушка штосьці дзіка глянуў у хвойнік: конь, блытаючыся на нагах, несучы шыю ў пярэдніх нагах, туляўся паміж каржакаватых хвояў, беручыся дадому. Да хлява ён не дайшоў, а перад ганкам кінуўся і ўжо больш не падняўся...

– Што ж ты не захацеў канаць не дома, – жорстка сказаў Леапольд Гушка... Пальцы рук яго сціснуліся, скурчыліся; ён шугануў да воза, роўны, высокі. Здаецца, камлюватасць у плячах яго раптам прапала"[132].

Сімвалічны вобраз каня-пакутніка пададзены ў другім творы К. Чорнага, у варыянце п'есы "Бацькаўшчына" (1939). Стары салдат расказвае гісторыю пра тое, як у гаспадара быў конь, худы і хворы, які за сваё жыццё так з'ездзіўся і спрацаваўся ад штодзённых земляробчых клопатаў, што "ледзьве ногі валачыў". Уладальніку хацелася, каб конь аддаваў свае апошнія сілы дзеля працы. Калі чалавек заўважыў, што жывёла пражыве не больш чым суткі, вырашыў выкарыстаць яе ў апошні раз – пагнаў за дзесяць вёрст па справах. "Я бачыў, – кажа апавядальнік, – як гаспадар на кані выехаў на вуліцу. Відно было, як у каня над скурай ходзяць косці, і ён так стагнаў, што здавалася, гэта чалавек умірае, хочучы жыць". На восьмай вярсце конь упаў, сабакі накінуліся на яшчэ жывую жывёлу і пачалі рваць на кавалкі. <...> А цяпер я стаў тым самым канём", – закончыў сваю гісторыю салдат[133].

Сярод апавяданняў, у якіх конь – адзіны памочнік чалавека ("На беразе", "Дзень", "Максімка"), у К. Чорнага ёсць творы, дзе расказваецца пра механізацыю, з якой прыходзіць у вёску новае жыццё ("Жалезны крык", "Малюнак"). Так, у апавяданні "Жалезны крык" на полі з аднаго боку працуе чалавек на трактары, з другога – "цягне маленькі плужок дробненькі конік"[134]. Конь здаецца міфічнай істотаю, якая трапіла сюды выпадкова. Усё навокал параўноваецца з машынай: "Чалавек – сам машына і знае сябе. І калі адна трубка ўсярэдзіне папсуецца – можна яе паправіць... Зямля жалезным крыкам гаворыць, што ёсць чалавек на ёй!"[135]. З канём атаясамліваецца цяжкае жыццё і знемагальная праца.

Дзядзька Павал з апавядання К. Чорнага "Малюнак" у сне бачыць каня, які схуднеў так, што былі відны прарэбіны пад скураю. Ад гэтай жывёлы герой ужо "адцураўся", бо з'яўляецца калгаснікам (твор напісаны ў 30-я гады, калі адбываўся працэс калектывізацыі). Вобраз каня ў творчасці К. Чорнага дапамагае больш глыбока і разгорнута выявіць герояў, іх пачуцці і погляды на жыццё.

---

[132]Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны – Мінск: Мас. літ., 1973. – Т. 4: Аповесці і раманы. – С. 338 – 339.

[133]Там жа, с. 115.

[134]Там жа, с. 99.

[135]Там жа, с. 94.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 17. Конь перад калёсамі, 1880 – 1890. Д. Фатторы

У беларускай літаратуры можна прасачыць трансфармацыю асэнсавання вобраза каня. У 30-я гады конь, з аднаго боку, – сябра, памочнік, з другога, – ён ужо нешта непатрэбнае, бо жывёлу ў гаспадарцы могуць замяніць машыны. Але потым у сучаснай літаратуры (А. Жук, Я. Сіпакоў) зноў гучыць сум па ім, як па "жывой істоце", па свайму сябру. "Вёска без каня як не сапраўдная. Як без душы жыве", – зазначае празаік А. Жук[136]. У частотна-тэматычным паказальніку, складзеным А. Бельскім, налічваецца звыш сямідзесяці твораў пра каня ў беларускай паэзіі. Заўважым, што колькасны паказчык выкарыстання гэтага вобраза найбольшы ў творчасці Я. Сіпакова. "У паэзіі Я. Сіпакова вобраз гэтай жывёлы займае ключавое месца", – адзначае А. Бельскі, называючы каня "сіпакоўскім татэмам"[137]. У сіпакоўскай паэзіі паўстае вобраз працаўніка з канём:

[136]Жук, А. Выбраныя творы: у 2 т. / А. Жук. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 1. Праклятая любоў: (Кн. аповесцяў). Апавяданні. – С. 153.

[137]Бельскі, А.І. Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі) / А.І. Бельскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та: Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка – 2000. – № 2. – С. 29.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мой бацька быў як зросшыся з канём
І, хоць ішоў па баразне за плугам,
Сам плуг цягнуў. Таксама і калёсы
Усцягваў на пагорак – стомлены, змакрэлы,
Ён напінаўся болей за каня,
Шукаў нагой зручнейшае апоры,
І дыхаў цяжка, і спяшаўся так,
Нібы ягонай пугай іх абодвух
Хтосьці невідомы падганяў.
З канём, здаецца, ён не разлучаўся <...>"[138].

Конь – спадарожнік чалавека па жыцці, вясковая праца непадзельна звязана з гэтай жывёлай:

Мы дзялілі з табой
Наша поле і луг,
Дапаўнялі сабой
І калёсы, і плуг[139].

Разам з тым у іншых вершах паэт сцвярджае, што паступова чалавек аддаліўся ад гэтай жывёлы, бо на пашы каня замянілі трактары, а ў горадзе – машыны:

Кажу сягоння я такое,
Бо ты – нібы ўжо госць у нас:
Перад табою, за табою
Барозніць трактар твой папас
("Ах, мілы конь, ах, мілы косю..."[140])

Або:

Па коўзкім праспекце коні непадкаваныя цокалі
У вітрыны глядзеліся,
Вывучалі шэрыя цокалі,
Абнюхвалі зводдаль
Сталоўкі
І крамы парфумныя,
Дзівіліся – ведама, коні! – на тратуары тлумныя.
А каб яны не парушылі
Руху агульныя правілы –
Імі, нібыта машынамі,
Рэгуліроўшчыкі правілі
("Коні на праспекце"[141]).

[138]Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 192.
[139]Там жа, с. 197.
[140]Там жа, с. 134.
[141]Там жа, с. 41.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, вобраз каня ў беларускай мастацкай свядомасці адлюстраваны ў двух ракурсах: як спадарожнік селяніна, беларуса-гаспадара, яго сябра і як істота, якая выклікае настальгію, бо з надыходам тэхнічнага прагрэсу сувязь паміж людзьмі і жывёлай слабее, каня замяняюць машыны. Такое адлюстраванне мастацкага вобраза паслядоўна было прадэманстравана ў беларускай літаратуры 30-х гадоў, але ў другой палове XX стагоддзя назіраецца новы віток у такой спіралі асэнсавання гэтага вобраза, яркім прыкладам чаго з'яўляецца вобраз каня ў творчасці Я. Сіпакова.



Мал. 18. Конь. 1963. В. Гаўрылюк. Салома, ніткі, пляценне. Брэст.

Станаўленне мастацкай анімалістыкі пачыналася з увагі да жывых аб'ектаў штодзённага жыцця і побыту. Бык з'яўляецца адной з сакралізаваных жывёлін у міфалогіі[142]. З гэтым вобразам звязваліся такія з'явы, як стварэнне свету, складанне календара (прыгадаем год Быка ва ўсходнім календары). Сімвалам хатняй гаспадаркі з'яўляецца карова. Са старажытных часоў яна лічылася свяшчэннай. Вобраз каровы прысутнічае ў міфалогіі народаў усходу, фінаў, нарвежцаў, немцаў. У даследаванні "Архетыпы нашай культуры" У. Конан адзначае: "Карова, бык, вол у архаічнай міфалогіі амбівалентны вобраз, увасабленне "нізу" і "верху", Хтонасу (зямля, вада) і Уранасу (неба), зааморфны адпаведнік Бога (егіпецкія Апіс, Асірыс; антычныя Зеўс, Юпітэр у вобразе быка), сімвалы ўрадлівасці і дабрабыту"[143]. У беларусаў цельная карова са старажытных

[142] Э. Зайкоўскі даводзіць: "Яшчэ ў палеаліце было заўважана, што серп маладзіка нагадвае рогі быка. У старажытнаіранскай і старажытнаіндыйскай традыцыях бык з'яўляўся вобразам месцовага божышча. <...> На тэрыторыі Беларусі культ быка прасочваецца ад часоў позняга неаліту" [Зайкоўскі, Э. Бык / Э. Зайкоўскі // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / склад І. Клімковіч; навук. рэд. С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 53].

[143] Конан, У. Біблейскія архетыпы і сімвалы ў беларускай літаратуры / У. Конан // Беларусіка: матэрыялы II Міжнар. кангр. беларусістаў, Мінск, май 1995 г. / Міжнар. асац. беларусістаў, Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны. – Мінск, 1997. - Кн. 6, ч.1: Беларусь паміж Усходам і Захадам: праблемы міжнац., міжрэлігійн. і міжкультур. узаемаадзеяння, дыялогу і сінтэзу. - С. 27.

Электронный архив ... имени А.А. Кулешова

часоў была паказчыкам дабрабыту. Старажытныя славяне верылі, што апрацоўваць зямлю іх навучылі багі, якія аралі на быках. Наяўнасць каровы ў гаспадарцы беларусаў лічылася паказчыкам жыццёвага ўзроўню, сведчанне таму – беларускі фразеалагізм "дойная карова" – "крыніца матэрыяльных даброт, якой можна несумненна карыстацца ў асабістых мэтах"[144], прыказкі "Карова на двары, <дык> і харч на стале", "была б карова, а даёнка знойдзецца". Вобраз гэтай хатняй жывёлы мае традыцыйную трактоўку (сімвалізуе дабрабытную гаспадарку) ад пачатку станаўлення беларускай мастацкай анімалістыкі; у творах жа класікаў літаратуры 20-30-х гадоў ён сустракаецца як элемент вясковага пейзажу: у творах З. Бядулі ("Цямнее. Зоркі паказваюцца над вёскай. Вароты скрыпяць. На дзядзінцах бабы дояць кароў, хлопцы адзяваюць цёплыя кажухі і выбіраюцца на начлег..."[145]), П. Галавача ("Лахматыя сялянскія каровы курчыліся, убіралі ў сябе і так худыя бакі і туліліся да вазоў, становячыся задам да ветру"[146]).



Мал. 19. Сусветная карова, 1913. Ф. Марк

Звычайна вобраз каровы з'яўляецца сведчаннем дабрабытнай гаспадаркі, адсутнасць гэтай жывёлы – паказчык становішча селяніна. Значнасць пасагу ў маладой вызначалася і падкрэслівалася наяўнасцю ў ім каровы. Так, напрыклад, К. Крапіва у рамане "Мядзведзічы" на гэта звяртае ўвагу наступным чынам: "У гаспадарцы хараством дзіркі не заткнеш.

[144] Литературные архетипы и универсалии / Рос. гос. гуманитар. ун-т; под ред. Е.М. Мелетинского. – М., 2001. – С. 493.

[145] Бядуля, З. Збор твораў: у 5 т. / З. Бядуля. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 3. Аповесці. – С. 20 – 21.

[146] Галавач, П. Спалох на загонах: аповесць / П. Галавач; прадм. А. Марціновіча. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С. 99.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вобраз сабакі – адзін з галоўных у беларускіх казках "Сабака і воўк", "Воўк, стары сабака і кот", "Вайна ваўка з сабакамі". Ва ўяўленнях славян па-першае, з вобразам сабакі звязаны добры пачатак. Гэтая жывая істота сімвалізуе адданасць, пра што красамоўна гаворыць выслоўе "сабачая вернасць". Сабака адчувае нараджэнне чалавека (паводле А. Сержпутоўскага, "як жанчына зачараваецее ды ашчэ першым дзіцём, так к ёй вельмі лашчацца каты да сабакі"[151]). Па-другое, гэты анімалістычны вобраз атаясамліваецца са злом. В. Маслава адзначае, што "сабака – архетып падману, ён фарміруе семантыку такіх славянскіх выразаў, як брахаць (ашукваць – прастамоўе), <...> ілжэ як сабака (аб ілжывым чалавеку), сабакам падшыты (ілжывы чалавек)"[152]. Аб гэтым сведчаць беларуская казка "Аткуда [*адкуль – Л. Д.*] сабака":

"Сабака быў чалавекам; у раі быў старажом, – спярва, 'шчэ да Адама. Алі нешта ўкраў, адпраштрапіўся, да й збрахаў. Тады бог кажэць:

– Ну будзь жа ты сабакам.

Дык ён і стаў сабакам.

І цяпер двара сцеражэць і брэшэць. Во й сабака"[153].

У славянскай культуры сабака з'яўляецца амбівалентным вобразам. Т. Валодзіна, Ю. Драздоў падкрэсліваюць, што "свой сабака ўспрымаўся [*беларусамі – Л. Д.*] пераважна станоўча, трывогу ці падазрэнне выклікаў чужы ці той, што сустрэўся за мяжой свайго паселішча, у абліччы якога і магла хавацца нячыстая сіла"[154].

У беларускай літаратуры вобраз сабакі сустракаецца ў асноўным у межах вясковага пейзажу ў творах Я. Коласа, Л. Калюгі, К. Чорнага. Алегарычны вобраз сабакі ў байцы Я. Коласа "Конь і сабака" мае адмоўную характарыстыку. Большая ўвага гэтаму вобразу надаецца ў літаратурных творах другой паловы XX стагоддзя, для якіх характэрны дуалістычны падыход да гэтага вобраза. З аднаго боку, сабака выступае сябрам, спадарожнікам чалавека ("Балада пра сабаку" М. Арочкі, апавяданне "Львы" І. Пташнікава, верш "Сабака" А. Глобуса). З другога боку, гэта істота выклікае насцярожанасць, нават жах у чалавека (апавяданне "Бляха" А. Федарэнкі).

Акрамя анімалістычных вобразаў свойскіх жывёл, даволі шырока ў беларускай класічнай літаратуры прадстаўлены дзікія звяры. Цікавым заам止рфным вобразам, які са старажытных часоў прысутнічае ў міфалогіі розных народаў Еўразіі і Паўночнай Амерыкі, з'яўляецца воўк. Сярод міфаў вядомы татэмічныя, у якіх продак, ад якога пачыналася племя, выступае ў выглядзе ваўка або здольны ў яго пераўвасабляцца.

---

[151]Сержпутоўскі, А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – С. 153.

[152]Маслова, В.А. Введение в лингвокультурологию: учеб. пособие / В.А. Маслова. – М.: Наследие, 1997. – С. 130.

[153]Беларускія народныя казкі (са зборнікаў Е.Р. Раманава). – Мінск: Маст. літ., 1962. – С. 234.

[154]Валодзіна, Т. Сабака / Т. Валодзіна, Ю. Драздоў // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч; навук. рэд. С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 444.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У хрысціянскай сімволіцы сярэднявечча воўк атаясамліваўся з чортам. Гэты вобраз таксама цесна звязаны з тэмай вайны: воўк – бог вайны (індаеўрапейская міфалогія); ваўкі суправаджаюць бога вайны ў якасці "псоў" (германская, грузінская міфалогіі); ваўкі – самі воіны, члены дружыны (іранская, грэчаская, германская міфалогіі). На Каўказе нават існавала традыцыя прыносіць у ахвяру богу вайны сабак, ваўкоў, а таксама людзей, якія сталі ваўкамі. Паводле агульнаіндаеўрапейскага ўяўлення, чалавек, які зрабіў цяжкае злачынства, становіцца ваўком.

Вобраз ваўка шырока прадстаўлены ў творах вуснай паэтычнай творчасці, прыкладам таму могуць быць усходнеславянскія казкі "Воўк, авечка і ліса", "Воўк-дурань", "Сабака і воўк" і інш.

Адносна гэтага вобраза У. Конан заўважае: "У беларускай народнай культуры вобраз ваўка амбівалентны: ён – часцей антаганіст, але бывае і памочнік героя"[155].

Беларускія, рускія, украінскія паданні, легенды сведчаць пра тое, што вобразы ваўка, ваўкалака з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі сярод іншых анімалістычных вобразаў. Часта сустракаецца гэты вобраз і ў творах беларускай класічнай літаратуры. Да яго звярталіся А. Абуховіч, Я. Колас, Я. Купала, А. Гарун.

Сярод твораў Я. Купалы можна налічыць некалькі дзесяткаў, у якіх паэт выкарыстоўвае вобраз ваўка. Яскравае апісанне драпежніка створана ў наступных строфах:

Топчачы верас і мох
Цёмных імшараў і лоз,
Выбрыў на сонны разлог,
На асляпнелы пакос.
Зубам ляскоча аб зуб,
Вочы палаюць агнём;
Стаў, як калода, як слуп,
Стаў і азваўся выццём
("Воўк[156]).

Для купалаўскай творчасці характэрна разнастайная семантыка гэтага вобраза. Па дадзеных "Слоўніка мовы Янкі Купалы", вобраз ваўка ў мастацкіх і публіцыстычных творах сустракаецца 93 разы ў наступных значэннях: 1. 'Як дзікая жывёліна сямейства сабачых': "Скубець скаціна, а пастыр // Пасе, пільнуе ад ваўка, // Снуе вакол, уздоўж і ўшыр, // То цёлку злае, то быка" ("Пры скаціне"[157]). 2. 'У якасці дзеючай асобы (у байках)': "Воўк: Ах, баранок мой, ах, бараночак! // Вось і настрэўся ты мне, дружочак" ("Воўк і баран"[158]).

[155]Конан, У. Архетыпы нашай культуры / У. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № . 8. – С. 39.
[156]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – Т. 2: Вершы, пераклады, 1908 – 1910. – С. 106.
[157]Там жа, с. 223.
[158]Там жа, с. 279.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Звяртае ўвагу тое, што гэты вобраз у лірыцы Я. Купалы набывае сацыяльную трактоўку. З аднаго боку, з ваўком параўноўваецца бядняк, мужык, народ:

На свет будзеш глядзець
Ашалелым ваўком;
Песні ўздумаеш пець, –
Адзавешся выццём
("Нуда"[159]).

Аўтар падкрэслівае цяжкія ўмовы існавання драпежніка. З другога боку, вобраз драпежніка асацыіруецца ў вершах Я. Купалы з пануючым класам, які супрацьстаўляецца простаму люду:

Мучыцель толькі рад, снуецца,
Як шакал дзікі па трупах, –
З ахвяр сваіх ваўком смяецца,
З ахвяр, што мруць у ланцугах
("З песень а бітвах"[160]).

Такі процілеглы падыход у выкарыстанні гэтага вобраза можна растлумачыць асэнсаваннем яго ў мастацкай свядомасці беларусаў як дуалістычнага вобраза. Гэта дваістасць праяўляецца нават у самім паходжанні вобраза ваўка ў легендах беларусаў. З аднаго боку, ваўка зрабіў чорт, а бог удыхнуў у яго жыццё, з другога, – вырабіў і ажывіў ваўка сам Гасподзь[161].

Затым у казачным эпасе гэты вобраз набыў таксама дзве трактоўкі: як даверлівага тупаватага прастачка ("Воўк, лісіца і аўца", "Звяры ў яме", "Воўк-дурань") і як нахабнага, злога крыўдзіцеля ("Святы воўк"). У вершы "Нуда" Я. Купала параўноўвае лёс ваўка і долю збяднелага народа. У вершы "З песень а бітвах" паэт выкарыстоўвае алегорыю несправядлівага мучыцеля.

У лірыцы Я. Купалы вобраз ваўка часта ўвасабляе цёмныя сілы, зло, усё нядобрае. У паэме "Адплата кахання" з ваўком параўноваюцца нядобрыя думкі:

Так чорныя думы адна за адною
Снуюць у тырана, як стада зімою
Ваўкоў згаладалых, не сытых ніколі,
Шукаючы жыру, валочацца ў полі,
Валочацца, аж дзе ахвяру спаткаюць
І выдзеруць сэрца, і вочы зглытаюць.
Эй, страшна, эй, жудка спаткацца з ваўкамі,

[159]Купала, Я. Поўны збор твораў: У 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – Т. 2: Вершы, пераклады, 1908 – 1910. – С. 58.
[160]Там жа, с. 62.
[161]Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. – М.: Индрик, 1997. – С. 122 – 123, 124.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Страшней жа з тым зверам, што ходзіць між намі,
Як мы, чалавекам, а сэрцам – пантэра;
О, гэткі звер горшы за ўсякага звера![162].

Яшчэ больш страшныя карціны рэчаіснасці паўстаюць перад рэцыпіентам з вершаў, дзе адлюстравана выццё ваўка: "Ціха дрэмле поле бітвы, // Шэпча блізкі лес малітвы; // Выбрыў воўк з сваёй бярлогі, // Выць пачаў на ўсе разлогі. // Выць пачаў у хаўтурны тон, // Зубы скалячы на плён" ("Песні вайны"[163]); "Завыюць ваўкі над курганамі, // Свет заліты крывавым агнём" ("З песень аб няволі"[164]). Разам з тым выццё ваўка выклікае спачуванне:

Не бойцеся... Ўтуліць ад холаду,
Спаўе, як пялёнкай, снег белы,
Зацягне вам песню мяцеліца,
Воўк жальбай завые скалелы
("Зімою"[165]).

Дарэчы, паводле славянскай традыцыі, выццё ваўкоў азначае: прадвесце вайны – пашчай прама каля хаты, голаду – вые ўверх, мору – да зямлі. Нярэдка вобраз ваўка сустракаецца там, дзе гаворка ідзе пра смерць: "Ваўкі па сцежках шляюцца // І ночкаю, і днём // І жудка разганяюцца // Магільніцкім выццём" ("Зіма"[166]); "Ваўкі збіраюцца // Парой зімоваю // І пяюць, выючы, // Песнь паграбоваю..." ("Над магіламі" [167]).

У купалаўскіх пейзажных замалёўках воўк сустракаецца як тыповы прадстаўнік беларускай прыроды:

На Купалле там птушка садзіцца, пяе,
У Піліпаўку воўк нема вые...
("Курган"[168])

Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор,
Ці залеў салавей, ці загагала гусь, –

---

[162]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Т. 6: Паэмы, пераклады. – С. 35.

[163]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 3: Вершы, пераклады, 1911 – 1914. – С. 216.

[164]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады, 1904 – 1907. – С. 148.

[165]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 3: Вершы, пераклады, 1911 – 1914. – С. 9.

[166]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады, 1904 – 1907. – С. 233.

[167]Там жа, с. 242.

[168]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Т. 6: Паэмы, пераклады. – С. 53.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю – Беларусь
("Гэты крык, што жыве Беларусь"[169]).

Вобраз ваўка, які вые, з'яўляецца спецыфічным для беларускай мастацкай свядомасці[170].

Творчасць Я. Купалы дае ўзор традыцыйнага погляду на ваўка і ваўкалака як на сімвал моцы, вайны, страху. Сучасная ж мастацкая літаратура выяўляе кантрастнае асэнсаванне гэтых вобразаў (вершы "Ваўчыца ў звярынцы", "Скарга прыручанага ваўка" Я. Сіпакова, паэма С. Законнікава "Чорная быль" і інш.)[171].

З вобразам ваўка ў лірыцы Янкі Купалы цесна звязаны вобраз ваўкалака. Паводле славянскай культурнай традыцыі, воўк з'яўляецца адным з таямнічых вобразаў, побач з якім стаіць не менш загадкавы вобраз ваўкалака. Здаўна на ўсходнеславянскіх землях воўк лічыўся страшным зверам, які стагоддзямі наводзіў жах на людзей, таму з ім звязаны самыя розныя нядобрыя прыкметы, павер'і: усе чулі пра ваўчыныя вяселлі ў піліпаўку; паводле рэлігійных крыніц, святы Юр'я сцярог жывёлу ад ваўкоў; у паданнях апісаны загадкавыя ваўкалакі. Матыў пярэваратня існуе і ў міфалогіі іншых народаў свету (чалавек мог ператварацца ў мядзведзя, льва і інш.). Даследаванню гэтага вобраза прысвяцілі свае працы П. Шпілеўскі ("Исследования о вовколаках на основании белорусских поверий"), А. Чарота ("Образы волка и волколака в славянском фольклоре"). У "Слове аб палку Ігаравым" сустракаюцца звесткі пра славутага князя Усяслава Чарадзея, які, паводле легендаў, мог ператварацца ў ваўкалака:

Усяслаў-князь людзям суд судзіў,
Гарадамі князёў надзяляў,
А сам поначы, свету на здзіў,
Ваўкалакам ці воўкам гуляў[172].

[169]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады, 1904 – 1907. – С. 194]

[170]Гэты вобраз адлюстраваны не толькі ў фальклоры, класічнай літаратуры, але і ў творах сучасных аўтараў. Напрыклад, у вершы А. Разанава "Воўк": "Сербскі в у к ведае навуку: у яго во- // страе вуха і чалавечы глузд. // Праславянскі в ь л к ъ валхвуе. // Беларускі в о ў к вые" [Разанаў, А. Танец з вужакамі: выбранае / А. Разанаў. – Мінск: Маст. літ., 1999. – С. 375 ].

[171]Даследчык А. Бельскі слушна кажа: "У Купалы ён [*воўк – Л.Д.*] увасабляе сілы зла, страху, цемры.

Падобная да купалаўскай трактоўка ў нашай паэзіі мела працяг. Аднак тады, калі ваўка пачалі паўсюдна знішчаць як шкодніка, раптам адносіны паэзіі да яго памяняліся. І гэта выявіла і засведчыла характэрную экалагічную рысу беларускай паэтычнай свядомасці: паэты заўсёды шкадавалі жывое, не прымалі гвалту, жорсткасці. Стала заўважным, як пачалі паэтызавацца вартасці ваўчынага роду: адвага, незалежнасць, мацярынская самаахвярнасць <...>" [Бельскі, А. Свет ад травы да зор : беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: дапам. для настаўнікаў / А. Бельскі.– Мінск: Нар. асвета, 1998. – С. 51].

[172]Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 5: Вершы, пераклады, 1930 – 1942. – С. 227.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У вершах Я. Купалы вобраз ваўкалака, як і ваўка, падаецца як інфернальны, які нясе з сабой смерць, страх: "Шыпяць, свішчуць па лугах // Вужы, скарпіякі, // А па стайнях, па хлявах // Ляцяць ваўкалакі" ("Люлі, люлі, мужычок!"[173]); "Барадой лясун ківае, // Шалы нетрай спавівае; // Ваўкалак за дамавінай // Выпаўзае на пуціну" ("Хохлік")[174]; "Жэняць ведзьму з ваўкалакам, // Сватае шынкар" ("Забытая карчма"[175]).

У суадноснасці з беларускімі павер'ямі П. Шпілеўскі вылучае дзве групы ваўкалакаў. Да першай (ваўкалакі-варажбікі) адносяцца істоты, у якіх ператварыліся варажбікі, да другой (ваўкалакі-ахвяры) – істоты, у якіх пераўвасобілі людзей чараўнікі. У беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзя вобраз першага тыпу (чалавека, які мог сам ператварыцца ў ваўкалака) адлюстраваны ў творах, у якіх закранаецца праблема свабоды асобы (напрыклад, вершы "Ваўкалак" А. Абуховіча, "Зайграй, зайграй, хлопча малы" П. Багрыма). Адным з адметных вобразаў ваўкалака-чараўніка як у паданнях, помніках старажытнай літаратуры ("Слова аб палку Ігаравым"), так і ў творах сучасных аўтараў з'яўляецца вобраз Усяслава Чарадзея ("След ваўкалака" Л. Дайнекі). Вобраз "ваўкалак-ахвяра" функцыянуе ў мастацкіх творах у асноўным як міфалагема. Напрыклад, у апавяданні "Ваўкалак" са зборніка "Шляхціц Завальня..." Я. Баршчэўскага[176], у апавяданні "Ваўкалакі" А. Кажадуба.

Даволі распаўсюджанымі ў беларускай літаратуры на працягу ўсяго яе развіцця з'яўляюцца арніталагічныя вобразы (вершы "Што птушкі казалі", "Каршун" Я. Лучыны, "Не кувай ты, шэрая зязюля..." М. Багдановіча, "Каршун", "А зязюлька кукавала", "Я не сокал...", "У вырай", "Буслы" Я. Купалы, "Гусі", "Песня ластаўкі" Я. Коласа і інш.)[177].

Вобразы птушак – пастаянныя алегорыі і сімвалы мастацкай творчасці. Прыкладам "звярынага гратэску", пашыранага ў часы барока, з'яўляюцца вершы Д. Рудніцкага "Птушыны баль", "Нязгода птаства і суд над крукам", "Апісанне птушынай хворасці".

Шырока распаўсюджаны ўяўленні пра душу чалавека ў аблічы птушкі (іншы раз птушка нясе душу ў іншы свет). Вобраз душы-птушкі прадстаўлены і развіты ў

---

[173]Купала, Я. *Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала.* – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: *Вершы, пераклады, 1904 – 1907.* – С. 208.

[174]Там жа, с. 17.

[175]Там жа, с. 153 – 154.

[176]"– Не ўсё нам у жыцці выпадае бачыць, але раскажу тое, што пачуў ад свайго суседа: пра гаротніка, якога чараўнік перавярнуў у ваўка і які шмат гадоў пакутваў, блукаючы па лясах" [Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – С. 127 ]. У ваўкалака чалавек быў ператвораны на вяселлі, вярнуцца ў чалавечы воблік яму дапамаглі чароўныя сілы.

[177]Даследчык А. Бельскі адначае: "Вельмі паказальным з'яўляецца той факт, што наступныя вобразы птушак звязаны з пэўнымі пейзажнымі рэаліямі: жураўель – з балотам, зязюля – з лесам, жаўранак – з полем" [Бельскі, А. Свет ад травы да зор : беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: дапам. для настаўнікаў / А. Бельскі.– Мінск: Нар. асвета, 1998. – С. 47].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

міфалогіі Егіпта, Грэцыі. У народаў Сярэдняй Азіі – гургонаў і іншых – з душой атаясамліваецца голуб (параўнаем вытокі вобраза голуба – вестуна смерці ў розных *традыцыях*), у якутаў – *певень*, у іншых народаў – спецыфічная для дадзенай мясцовасці птушка. Дарэчы, птушка, як паводле індаеўрапейскай міфалагічнай традыцыі, так і ў творах беларускай літаратуры, атаясамліваецца з душой чалавека, імкненнем да чагосьці высокага, вечнага. Здаецца, не выпадкова ў творчасці многіх беларускіх паэтаў існуе парадыгма: "душа чалавека – птушка", стыхіям прыпісваюцца якасці птушак і ў той жа час з птушкамі атаясамліваюцца характарыстыкі, узятыя ад стыхій. Чалавек, абагаўляючы птушак, суадносіць іх з сабою[178].

У паэзіі М. Багдановіча душа чалавека асацыіруецца з ястрабам. Птушка тут – сімвал волі і свабоды:

Мая душа, як ястраб дзікі,
Што рвецца ў неба на прастор,
Вартуе вольных птушак крыкі, –
Мая душа, як ястраб дзікі.
Учуўшы іх, страхне вялікі
Свой сон, шыбне ды вышай гор, –
Мая душа, як ястраб дзікі,
Што рвецца ў неба на прастор
("Мая душа"[179]).

"Ястраб дзікі" – птушка прастору, вышыні, высокай годнасці. У М. Багдановіча гэты вобраз рамантызаваны. Свой сімвал вольнага існавання ў Я. Купалы – сокал, які спалучаны са стыхіяй ветру:

І вецер, і сокал, і я –
Сыны адной долі-жыцця,
Наводзім маркотныя мы
І душы, і песні адны[180].

Гэта птушка ўспрымаецца як высокі ідэал для свабодалюбівай асобы:

Як сокал, і я б імкнуўся да зор:
Там сонца, раздолле, прастор;

---

[178]Даследчык М.С. Кацар адзначае: "Найбольш поўным выразнікам лірычных і паэтычных настрояў у народнай мастацкай творчасці былі птушкі. Так, голуб і галубка сімвалізавалі каханне, зязюля – жанчыну-ўдаву, салавей – песняра кахання, сокал – вобраз каханага, арол – героя. Зразумела, што гэтыя вобразы часта сустракаюцца ў тканых і вышываных вырабах, асабліва калі яны маюць досыць канкрэтнае сімвалічнае прызначэнне: падарунак каханаму, ахвяра-абярэг франтавіку і інш." [Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар; навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1996. – С. 79].

[179]Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч; пад рэд. А.А. Лойкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – С. 223.

[180]Купала, Я. Вершы / Я. Купала; уклад. А.А. Сляпцова.– Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 96.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Без жалю б пакінуў зямлю,
І хатку, і долю сваю[181].

Вершаваная стылістыка і ў М. Багдановіча, і ў Я. Купалы падкрэслена ўзвышаная.

Арніталагічныя вобразы прадстаўлены даволі шырока ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя, якая ўнаследавала лепшыя традыцыі ў паказе вобразаў птушак пісьменнікамі пачатку XX стагоддзя – М. Багдановічам, Я. Купалам.

Неаднойчы па-мастацку асэнсоўваў вобраз птушкі Я. Сіпакоў у сваіх творах. У празаічнай мініяцюры ён разважае: "У аднаго філосафа ёсць дужа цікавая думка: чым вышэй у неба ўздымаецца птушка, тым меншай яна здаецца тым, хто застаўся на зямлі.

Тым большымі, дададзім мы ад сябе, здаюцца самі сабе тыя, хто ніколі не ўзлятаў у неба"[182].

Здаецца, не выпадкова існуе ў сіпакоўскай лірыцы парадыгма: "душа чалавека – птушка". Зямныя будні звужаюць кругагляд, у адрозненне ад таго, як падаўжаецца далягляд з вышыні птушынага палёту. Таму душа чалавека павінна абавязкова быць крылатай. Рамантычна акрыленай успрымаецца асоба Сіпакова-лірыка. Крытык Л. Ламека піша: "У кожнай думцы Я. Сіпакова – сваё адметнае жыццё, знешняя абалонка, пластыка, сваё дыханне і ўзмах крылаў"[183]. Вера ў свае ўласныя крылы – зарука паспяховага палёту сярод штодзённых клопатаў:

Крылы нашы – *для радасці*, мар,
Крылы нашы – для працы і свята.
Крылы – лішнія, крылы – цяжар,
*Калі ў іх не верыш зацята*
("Варта ў крылы паверыць свае"[184]).

"Крылатай душы" чалавека, душы-птушцы, супрацьпастаўлены ў сіпакоўскай паэзіі вобраз "бяскрылых гусей". Гэта алегарычны вобраз тых, хто "патануў у быце", не хоча рухацца наперад, каго задавальняе сытае прызямленае жыццё сучасных мяшчан:

Цяпер жа яны пасыцелі
І ветразі – белыя крылы –
Што небам, палётамі трызняць,

[181] Купала, Я. Вершы / Я. Купала; уклад. А.А. Сляпцова.– Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 96.
[182] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 2: Проза. – С. 358.
[183] Там жа, с. 7.
[184] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С.190 – 191.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да звыклай зямлі апусцілі
("Бяскрылыя гусі[185]).

Арніталагічныя вобразы сустракаюцца ў творчасці беларускіх паэтаў другой паловы XX стагоддзя (вершы "Жураўлі на Палессе ляцяць..." А. Ставера, "Вясёлаю маланкаю" П.Панчанкі, "Жаўранак – звонкая ніць", "Крумкачы", "Снягір" У. Караткевіча, "Чорны воран, белы лебедзь..." С. Гаўрусёва, "Буслы" С. Грахоўскага, "На пахаванні жаўрука", "Калі парою лістападу", "Бусел" М. Танка, "Буслова нарачонка" Р. Барадуліна, "Тры жураўлі", "Ластаўкі" М. Рудкоўскага, "Жураўлік" Д. Бічэль-Загнетавай, "Буслы" Л. Геніюш і інш.).

Для мастацкай анімалістыкі ў беларускай класічнай літаратуры характэрна даволі разгалінаваная сістэма анімалістычных вобразаў, кожны з якіх мае сваю гістарычна-культурную трактоўку. Прадстаўнікі фауны знайшлі свой адбітак у свядомасці пісьменнікаў у форме адметнай мастацкай вобразнасці. Метадалагічныя напрамкі, у межах якіх адбываецца фарміраванне анімалістычных вобразаў (рэалістычны, сатырычны, фантастычны, псіхалагічны) сведчаць аб тым, што:

– выкарыстанне анімалістычных вобразаў залежыць ад іх ідэйна-эстэтычнай функцыі ў літаратурным творы;

– у анімалістычнай творчасці беларускіх класікаў адлюстраваліся традыцыйныя міфалагічныя ўяўленні, маральна-філасофскія погляды; анімалістычныя вобразы (звяры і птушкі) з'яўляюцца своеасаблівай мовай алегорый і сімвалаў;

– пераасэнсаванне вобразаў фауны звязана з пераменамі ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства.

[185]Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 114.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Раздзел 2**

# МАСТАЦКАЯ АНІМАЛІСТЫКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 2.1. Сістэма анімалістычных вобразаў у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя

Як адзначалася ў папярэднім раздзеле, беларускім класічным мастацтвам былі закладзены традыцыі літаратурнай анімалістыкі.

Літаратурная анімалістыка другой паловы XX стагоддзя вызначаецца багаццем вобразаў прадстаўнікоў фауны. Па-першае, пісьменнікі звяртаюцца да паказу рэальна існуючых жывёл, а таксама фантастычных істот, якія з'яўляюцца вынікам фантазіі аўтараў. Па-другое, творцы пашыраюць арсенал мастацкіх сродкаў пры адлюстраванні анімалістычных вобразаў. Адна з асаблівасцей мастацкай анімалістыкі другой паловы XX стагоддзя – анімалістычны псіхалагізм; прадстаўнікі фауны ў мастацкіх творах надзяляюцца магчымасцямі гаварыць, разважаць, смяяцца і інш.

Мастацкае ўвасабленне анімалістычных вобразаў у паэзіі і прозе грунтуецца не столькі на апісанні жыццёвых падзей і рэалій, колькі на фіксацыі думак і пачуццяў, навеяных рэчаіснасцю. У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя вылучаюцца наступныя тыпы анімалістычных вобразаў: жывёлы як рэаліі прыроды, вобразы-сімвалы, вобразы-алегорыі, персаніфікаваныя анімалістычныя вобразы, фантастычныя вобразы жывёл.

Што датычыцца першага тыпу – жывёлы як рэаліі прыроды – гэта адзін з традыцыйных вобразаў у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя, які ўвасоблены ў розных ракурсах.

Анімалістычны вобраз ці некалькі вобразаў выступаюць у літаратурным творы як рэаліі пейзажу. Прыкладам такога ўвасаблення з'яўляюцца анімалістычныя вобразы ў аповесці "Чазенія" У. Караткевіча. Прадстаўнікі дзікай фауны ў творы – частка агульнага пейзажнага фону, дзе разгортваюцца падзеі: "Шырокая круглая спіна мільгнула над вадою. Рыбіна даўжынёю нешта пад метр ішла ў вытокі ракі, змагаючыся з плынню. Ён [*Севярын Будрыс – Л.Д.*] здагадаўся, што гэта ідзе нераст сома. Ёй было зручна заходзіць ў раку. Вада пасля шторму і залевы, пэўна, паднялася"[186]; "Імкнулі на святло сойкі, невыказнай пяшчотнасці вясёлкавыя маліноўцы, эльцызмы Вествудзі", падобныя на кветкі архідэй. Гіганцкія, фантастычныя па афарбоўцы хвалістыя павінавочкі-брамеі і павінавочнікі-артэміды, такія пяшчотна-зялёныя, бранзаватыя, малахітавыя"[187]. Разам з тым у аповесці "Чазенія" вобразам жывой прыроды надаецца важнае значэнне. Галоўная гераіня заўважае, што жывёлы становяцца ахвярамі чалавека ў ходзе правядзення біялагічных эксперыментаў, што сведчыць пра антыэкалагічнае мысленне: "І вы

[186]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 3: Раман, аповесці. – С. 468.

[187]Там жа, с. 496 – 497.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лепей не на наш разумны гуманізм навальвайцеся, а на тых, хто труціць азёры, рэкі, лясы, хто не сёння-заўтра атруціць акіяны. Мы – усё для ўнукаў, хаця рукі ў нас часам бываюць у крыві. У тых – усё для кішэні і пуза, а рукі чысценькія"[188]. Аўтар не раз акцэнтуе ўвагу чытача на вачах жывёл, ён як бы спрабуе заглянуць у іх "душы": "Адзін вялікі васьміног неяк выблытаўся з сеці і ўпаў ля Будрысавых ног. Глядзеў вялікімі вачыма, варушыўся, мяняючы колер, то ўцягваў, то зноў выпускаў папугайскую дзюбу"[189], "Вялізны матыль сеў на грудзі Севярыну і папоўз да ягонага аблічча, буйны, нібы ў кіно; аж спалохацца можна было. Пукатыя гіганцкія вочы адбівалі святло, гарэлі барвяным агнём"[190]. Свет фауны ў творы даволі багаты: ад свойскіх жывёл (сабака) да прадстаўнікоў дзікай прыроды (змяя, бурундук), дзе не выключэннем з'яўляюцца і экзатычныя жывёлы (васьміног, японскія вароны). Жывёлы дапаўняюць жыццё людзей у творы. Выключэннем з'яўляецца вобраз леапарда, антыпода галоўнага героя, сімвала зла. Паядынак чалавека і звера – гэта сутыкненне чалавечага і драпежнага пачаткаў, змаганне не роўных у экстрэмальнай сітуацыі: "Гарлавым, страшным крыкам закрычала жанчына. Але чалавек ужо таксама быў звер. Нешта цёмнае, неразважлівае плесканулася з самых глыбіняў, калі ён пачуў гэты крык. <...> Схапіўшы крывую цяжкую ламачыну, ён грудзьмі, жыватом, усім цяжарам свайго цела ўпаў на спіну леапарду, з дзікім сладастрасцем, скручанымі пальцамі левай рукі, захапіў і выкруціў шаўкавісты карак, а правай, у якой была доўбня, абрушыў на плоскую галаву звера скрышальны ўдар. І яшчэ адзін, з нечаканай, радаснай дрыготай. І яшчэ..."[191]. Жывёла ў пэўны момант адчувае перавагу чалавека, які мусіць бараніцца і быць пераможцам. У. Караткевіч умела ствараe сюжэтную інтрыгу: "... Леапард не прыйшоў ізноў. Ён не прыходзіў і пасля. Сімвал усяго пачварнага і цёмнага, што ходзіць вакол нас, ён знік. Магчыма, пайшоў некуды ў джунглі, у нетры, у глушыню, далей ад чалавека, туды, дзе няма чалавечага жылля, дзе гэтае жыллё некаму бараніць"[192].

Прадстаўнікі жывёльнага свету – неадменная частка чалавечага жыцця і побыту. Напрыклад, працу беларускага селяніна цяжка ўявіць без прысутнасці свойскіх жывёл, і ў першую чаргу без такіх звыклых істот, як карова, конь. Гэтыя анімалістычныя вобразы даволі часта сустракаюцца ў літаратурных творах беларускіх аўтараў (У. Караткевіч, І. Пташнікаў, В. Быкаў, А. Жук, А. Кажадуб і інш.). Звяртае на сябе ўвагу, што да рэалістычнага паказу дадаецца пэўны падтэкст, гэта можа быць сімволіка або алегорыя і інш. Такое дуалістычнае адлюстраванне анімалістычнага вобраза можна назіраць у апо-

[188]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 3: Раман, аповесці. – С. 47.

[189]Там жа, с. 455 – 456.

[190]Там жа, с. 497.

[191]Там жа, с. 514.

[192]Там жа, с. 515.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

весці "Знак бяды" В. Быкава. З аднаго боку, аповед уяўляе сабой паслядоўнае адлюстраванне падзей у творы. Вобразы свойскіх жывёл паўстаюць тут як рэаліі побыту селяніна. Парсюк, куры, карова Бабоўка – неад'емная частка гаспадаркі Багацькаў. З другога боку, ідавочны ў творы сімвалічны план: так, вобраз каровы – сімвал дабрабыту, трываласці сялянскага ладу жыцця. Непажаданыя госці Петрака і Сцепаніды патрабуюць кожны раз малака, адзін з немцаў вылівае неўпадабаны сырадой на траву: "Але чацвёрты, высокі, як жардзіна, апрануты ў нейкі балахоністы камбінезон, толькі паспытаў з кварты і тут жа пляснуў малако на траву; зялёная мурава на пяць крокаў забялелася, нібы ўзялася цвіллю"[193]. Белая цвіль на траве – дэталь, якая мае сімвалічны падтэкст. У свядомасці земляроба малако з'яўляецца асноўным прадуктам харчавання, выступае сімвалам дабрабыту. Страта каровы сведчыць пра распад гаспадаркі, бяду для дома і людзей. "Надзіва сабе самой Сцепаніда не дужа ўбівалася па карове – як ні шкада ёй было Бабоўку, яна адчувала, што рушылася штосьці непамерна большае і што вялікая небяспека набліжалася да іх ушчыльную"[194]. Гібель каровы ў аповесці "Знак бяды" з'яўляецца адным з сімвалаў трагедыі, яе прадвесцем. Даследчык творчай спадчыны В. Быкава І. Афанасьеў слушна заўважае: "Сімвалічная, асвечаная амаль язычніцкай памяццю, і сцэна забойства каровы – смяротны жэст захопнікаў, якім яны быццам давяршаюць разбурэнне некай пpашаасновы"[195].

Анімалістычныя вобразы прысутнічаюць у творах на паляўнічую тэму (напрыклад, апавяданне "Паляўнічае шчасце" Э. Самуйлёнка, апавяданне "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі, верш "Ласіны след" С. Грахоўскага, апавяданне "Лоўчыя" А. Каждуба, "Балада пра дзіка і чалавека" У. Караткевіча і інш.).

Трывожнае гучанне гэтай тэмы ў беларускай літаратуры ў другой палове XX стагоддзя выклікана маральнай дэградацыяй людзей, варварскімі адносінамі да прыроды. Востра паўстае ў многіх творах праблема захавання і выратавання фауны і флоры, гаворка пры гэтым ідзе пра экалогію чалавечай душы. Жывёлы ў творах пра паляванне ў многім падобныя да людзей сваім працалюбствам, адданасцю, дабрынёй. У той жа час яны найперш паўстаюць ва ўсёй сваёй унікальнасці, значнасці і самакаштоўнасці. Дуалістычнай з'яўляецца трактоўка анімалістычных вобразаў у апавяданні "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі. З аднаго боку, дзік паказаны як звычайны жыхар лесу ("Дзік выйшаў на світанні. Тоўсты і круглы, як капа сена, ён неяк неспадзява-

[193]Быкаў, В. Зборнік твораў: у 6 т. / В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 4: Аповесці. – С. 40 – 41.

[194]Там жа, с. 70.

[195]Афанасьев, И.Н. Кто восходит на Голгофу?: Антивоен. идея в творчестве В. Быкова / И.Н. Афанасьев. – Минск: Маст. літ, 1993. – С. 115.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на выкаціўся з хмызняку і, задраўшы ўгору доўгі выгнуты лыч, абнюхаў паветра"[196]). Пісьменнік дэталёва раскрывае псіхалогію чалавека (праз рухі, думкі, адчуванні), які палюе на звера і ў якім абудзіўся "спартыўны інтарэс": "Рукі ў Анісіма зноў закалаціліся, ліхаманкава схапіліся за стрэльбу. Такога дзіка тут нават нельга ўпаляваць. Асабліва калі ўзабрацца на дрэва і праседзець там ноч. Пад раніцу дзік прагаладаецца і прыйдзе зноў на паляванне жыраваць"[197]. З другога боку, у творы заўважаецца аналогія паміж пустэльным жыццём звера і адзіноцтвам чалавека. Б. Сачанка праводзіць сувязь паміж нелюдзімым Анісімам і дзіком-адзінотнікам для таго, каб паказаць агульнасць, падабенства ў натуры чалавека і звера: "Думкі яго віліся вакол Анісіма. Не, не адзін ён, Анісім, вінаваты ў тым, што вырас такім нелюдзем. У нечым вінаваты і ён, Раман. Недзе нешта не дагледзеў, у нечым не настаяў, у нечым паспадзяваўся на добрае і даў многа волі, залішне многа. Вось хлопец і вырас такі самаўпэўнены, аднаасобны – робіць толькі тое, што падабаецца яму, на астатніх жа нават не шманае <...>"[198]. "Гэта дзік. Дзік-бадзяга, – чамусьці ўзрадаваўся Анісім. – Яму, старому, нездаляшчаму, цяжка ўгнацца за чарадою, і таму ён цураецца яе, астаецца адзін. Вылезе дзенебудзь на дубняк, наесца жалудоў ці парахні і шыецца ў непралазную заглуш. З галавою зарываецца ў мох і снег і, замкнуўшы павекі, цэлымі днямі не то спіць, не то нешта блюзніць. Яго спакой баіцца парушыць нават воўк. Раззлаваны, дзік можа сваімі вострымі разцамі-ікламі справіцца з кім заўгодна, хто толькі асмеліцца падысці блізка да



Мал. 21. Дзік, 1970. В.Альшэўскі.
Дрэва, разьба. Мінск. НММ.

[196]Сачанка, Б. Выбраныя творы: у 2 т. / Б. Сачанка – Мінск: Маст. літ., 1981. – Т. 2: Чужое неба: Раман у навелах; Палескія былі. – С. 400.

[197]Там жа, с. 392.

[198] Там жа, с. 417.



Мал. 22. Дзік, каля 1525 – 1530. Л. Кранах Старэйшы

лагва"[199] . У творы прадумана разбіўка аповеду, кампазіцыя. Гэта заснавана на чаргаванні частак, у якіх ідзе гаворка то пра жыццё звера, то пра лёс чалавека.

Даволі пашырана выкарыстанне ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя анімалістычных вобразаў-сімвалаў. Такія вобразы сустракаюцца як у паэтычных, так і ў празаічных творах.

Без арніталагічных вобразаў немагчыма ўявіць мастацкае адлюстраванне свету прыроды. Гэта пацвярджае беларуская паэзія другой паловы ХХ ст. Вобразы птушак вылучаюцца сярод усіх анімалістычных вобразаў, адлюстраваных у творчасці У. Караткевіча.

Сімвалам бацькаўшчыны часта выступае ў лірыцы паэта шпак, якому цяжка развітвацца са сваёй радзімай:

Шпак не трапеча, ён не ўзвіваецца,
Шчасцем жыццёвым не захлынаецца,
Сёння з радзімаю ён развітваецца.
Сумна,
Працяжна спявае шпак.
Песня шпака халадком цячэ,

---

[199] Сачанка, Б. Выбраныя творы: у 2 т. / Б. Сачанка – Мінск: Маст. літ., 1981. – Т. 2: Чужое неба: Раман у навелах; Палескія былі. – С. 391.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Доўгі, празрысты свіст на світанні...
Час адлятаць ад радзімы туманнай,
Светлай для кожных птушыных вачэй.
Ў сэрцы птушыным яна жыве
З дымнаю сушняй, з садамі расянымі...
("Развітальная песня"[200])

У радках паэта адчуваецца ўсхваляванасць, захапленне той парой года, калі гэтая птушка вяртаецца дадому:

О вясна! Таполі! Свеце мілы!
Сонца німб! Аблокі! Сад! Рака!
Залатая падапёка крылаў
Маладога звонкага шпака! [201]

З няменшым усхваляваннем прадстаўлены вобраз жаўранка, яшчэ аднаго прадвесніка вясны, абуджэння новага жыцця[202]. Песня гэтай птушкі ў вершы "Жаўранак – звонкая ніць..." яднае сэрца паэта з нябёсамі: "Хмары веснія цяжкія, як кентаўры, // Песня шчасця пад імі ўзахлёб звініць. // Ах, гэта жаўранак, // Жаўранак, // Жаўранак, // Срэбная, // Срэбная, // Срэбная ніць. // Над ракою, тваім зайздросцячы лаўрам, // Вадзяны бугай трубіць, як грубіць. // Не звяртай увагі, // Жаўранак, // Жаўранак, // Не парві сваю тонкую, // Тонкую ніць. // Зноў дымеюць разоры і сытая пара // На курганы былога майго бяжыць. // Працягні з майго сэрца, / / Жаўранак, // Жаўранак, // Аж да самага неба // Звонкую ніць" [203].

Яшчэ адным арніталагічным вобразам у паэтычным свеце паэта паўстае голуб. Гэтая птушка – сімвал міру, лагоды, сімвал вечнага кахання, сімвал чысціні, цнатлівасці. У. Караткевіч традыцыйна трактуе гэты вобраз у "Партызанскай баладзе". З голубам тут параўноваюцца рукі тых,



Мал. 23. Голуб і галубка – сімвал кахання

[200]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 72.
[201]Там жа, с. 177.
[202]Такую трактоўку вобраз жаўранка мае ў беларускіх песнях: "Жаваронак на небе лятае, // Вясне песеньку спявае" [Беларускія народныя песні (са зборніка П. Шэйна) / склад. К. Кабашнікаў. – Мінск: Дзяржвыд БССР, 1962. – С. 56].
[203]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 181.

Электронный архив библиотеки ГГУ имени А.А. Кулешова

хто кахае: "Ціха-ціха ўздымаюцца да бінтоў, ад крыві рабых, // Чыстыя-чыстыя рукі – белыя галубы..."[204].

Уздым рук, якія нагадвае ўзлёт галубоў, з'яўляецца своеасаблівым увасабленнем спадзяванняў, імкненняў да чагосьці высокага і вечнага. Галубіныя пер'і зрабіліся незвычайным мастом, які з'яднаў сэрцы закаханых у "Баладзе пра галубіныя пер'і":

Над каханымі лёталі галубы
І скінулі два пяры.
І хлопец дзяўчыне аддаў адно,
І яго абняла яна,
І вечар быў, і спусцілася ноч,
А ўранцы прыйшла вайна.
<...> І аднойчы ў руінах стаялі яны
Разам з сябрам майскай парой,
І да іхніх ног з высокай сцяны
Галубінае ўпала пяро[205].

Але ж не толькі з нечым пяшчотным, чыстым звязаны вобразы птушак. Так, напрыклад, голас драча асацыіруецца з рыпеннем ваенных вазоў. Разам з аўтарам нас ахоплівае трывога, насцярожанасць і міжволі мы адчуваем страх:

Драч крычыць. Туманы, як мора,
За ракой на лугах ляглі.
Прагна слухаю.
З цемры чорнай
Далятае голас зямлі.
Непакорлівы. Рэзкі. Забыты.
Крык аб помсце. Пагроза. Прызыў...
Драч крычыць, быццам недзе ў жыце,
Ледзьве чутна рыпяць вазы.
("Баявыя вазы"[206]).

Не менш жахлівым вымалёўваецца вобраз крумкача, які ў мастацкай свядомасці беларусаў звязаны з царствам мёртвых, у вершы "Крумкачы":

І раптам з Домскай вежы проста ў хмары
Узняліся з хрыплым крыкам крумкачы,
Як чорныя крыжы вякоў мінулых;

[204]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 17.

[205]Там жа, с. 73.

[206]Там жа, с. 65.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Залатая рыбка. 1997. А. Смаляк



Майскі жук. 1997. А. Смаляк

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Што год, то крыж. Яны лятуць угору...
Вышэй, вышэй.
Над шпілем.
Над Даўгавай[207].

Яшчэ адна асаблівасць беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя – ускладненне, "згушчэнне" сімволікі, што ўяўляе сабой якасна новую з'яву ў практыцы мастацкай творчасці. Сімвалічныя анімалістычныя вобразы нясуць у сабе поўную агульначалавечую ідэю. Характэрная рыса твораў гэтага перыяду – пераасэнсаванне вобразаў. Тэма захавання прыроды гучыць у лірыцы У. Караткевіча, адсюль зыходзяць драматычна-трагедыйныя вобразы: ваўка са сціснутай пасткаю лапай, застрэленага дзіка, мёртвага белавежскага аленя. Аўтар як быццам робіць спробу зразумець аленя, зазірнуць яму ў вочы:

За спакоем тваім сонца майскае радасна сочыць,
Над табою ў блакіце бязмежных лясоў палавень...
Дык чаму ж утузе твае мудрыя сумныя вочы,
Белавежскі алень?
І адказваюць вочы, рахманыя, поўныя жалю:
– Як схаваць мне тугу, і пакорлівасць лёсу, і жах,
Калі тысячы год маіх продкаў падступна хапалі,
Калі сто пакаленняў канчалі жыццё на зубах?
("Белавежскі алень"[208]).

Гэтыя вочы, поўныя смутку, жалю, нібы просяць аб адным: "Пашкадуйце мяне! // Калі ласка... // Пашкадуйце мяне..."[209] Найбольш яскрава тэма палявання, знішчэння жывёл раскрыта ў "Баладзе пра дзіка і чалавека": "Дзік, з'явіўся да снежнага бурта, // Мей адвагу адказваць, дзік. // Ён з'явіўся. Яго нарадзілі // Змрок начны і сняжынак плач. // Ён ішоў праз гурбы застылыя, // Адзінец, самотны сякач. // Узараная тушай гэтай // Баразна снегавая плыла... // *Я ударыў па ім дуплетам // І падраніў, а не паклаў. // З лютай ярасцю чорнага* тромба, // Што ламае дрэвы ў бары, // Ён ляцеў на мяне, як бомба, // Вывяргаючы кроў і рык. // Бомба з шэраню, бомба са шчэсці, // З мяса, рыку, з болю ўканец, // Бомба з ярасці, бомба са смерці // Для кахання, для зор, для мяне.. // Курта ўпялася смерці ў сцёгны, // Каб яе ад мяне адцягнуць, // Даць імгненне для стрэлу і стогну, // Даць грымотам хвіліну адну. // І дала..."[210] Забіўшы звера, чалавек не адчувае перамогі, наадварот, яго агортвае пачуццё віны, суму, трывогі:

---

[207]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 145.
[208]Там жа, с. 226.
[209]Там жа, с. 226.
[210]Там жа, с. 150.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Нерухомым пластам
Ён ляжаў, пачварны красун, –
Буры, шчэсцісты, грузлы, ікласты,
Як апошні забіты лясун.
Бы зімовы россып каліны,
Кроў апырскала снежны разор...
О якая чужая краіна!
О снягі ў зіхаценні зор!
Для чагосьці прыйшоў, скрывавіў,
Нарадзіў барвяны туман
І зямлю ад цябе пазбавіў.
А на ёй і кахання няма.
Мы дзялілі і шчасце і гора,
І лясы і спевы травы.
Што ж цяпер ты мне, дзік, падорыш?
Мне, забітаму, ты, жывы? [211]

Адным з трагедыйных вобразаў у сучаснай паэзіі выступае вобраз ваўка. У традыцыйнай трактоўцы (Я. Колас, Я. Купала і іншыя беларускія класікі) вобраз ваўка прадстаўляўся як вобраз драпежніка, аднаго з самых лютых прадстаўнікоў беларускай фауны.

У другой палове мінулага стагоддзя, калі ў літаратуры ўсё больш актыўна стала асэнсоўвацца экалагічная праблема, вобраз ваўка набыў новую ідэйна-мастацкую трактоўку. Воўк паказаны як адзін з самых бездапаможных звяроў, напрыклад, у вершы "Ваўчыца ў зверынцы" Я. Сіпакова:

Кранаў за сэрца голас яе [*ваўчыцы – Л.Д.*] слабы,
Хоць ён і з пашчы воўчае выходзіў[212] .

Ваўчыца прагне волі. У творы Я. Сіпакова створаны яркі псіхалагічны малюнак:

Нялёгка з пушчай вольнай разлучыцца
І апынуцца ў цеснакутай клетцы...
Кідаецца ва ўсе бакі ваўчыца
І на свабоду вырвацца імкнецца[213] .

У сіпакоўскім вершы ўражвае такая мастацкая дэталь, як высунутыя праз краты лапы. "Хай хоць яны пабудуць на свабодзе", – як бы ва унісон

[211]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 150 – 151.
[212] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С.12.
[213]Там жа, с.12.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жаданню ваўчыцы заўважае са шкадаваннем аўтар[214]. У лірыцы Я. Сіпакова ваўчыца ў клетцы – сімвал прагі волі; сімвал зняволенага жывёльнага свету, лёс і жыццёвыя ўмовы якога амаль поўнасцю залежаць ад чалавека і нават сімвал самога зняволенага чалавечага грамадства.

Закрануўшы тэму прыручэння дзікіх жывёл у першым сваім зборніку "Сонечны дождж" (1960), Я. Сіпакоў звяртаўся да яе яшчэ не раз. Вобраз ваўка, які апынуўся за кратамі, зноў намаляваны ў вершы "Скарга прыручанага ваўка". Толькі цяпер паэт не проста паказвае паводзіны звера, а імкнецца выявіць яго ўнутраны свет. Ён разумее, якое прыніжэнне адчувае драпежнік, апынуўшыся ў клетцы, дзе насупраць скачуць "асмялеўшыя дужа зайцы". У гэтым вершы пра ваўка Я. Сіпакоў выкарыстоўвае такі мастацкі прыём, як анімалістычны псіхалагізм. Аўтар спрабуе перадаць думкі прыручанага ваўка, пасаджанага за краты. Гэты нявольнік звяртаецца да дырэктара звярынца, каб ён адпусціў яго на волю:

Адпусці...
Не чакай маёй згубы;
Разарвецца ад крыўды сэрца;
Бо калі нават шчэру я зубы –
Вам здаецца,
Што воўк смяецца[215].

Дзякуючы такому прыёму аўтар дасягае таго, што рэцыпіент можа паглядзець на свет вачыма зняволенай жывёлы. Паэт падкрэслівае трагедыйнасць сітуацыі, у якой апынуўся прадстаўнік так званай "дзікай фауны". Вобраз ваўка тут выступае як сімвал хцівасці і драпежнасці грамадства, якое паставіла перад сабой на калені не толькі прадстаўнікоў жывёльнага свету, але і самога чалавека. Звярыныя драпежніцкія інстынкты часам бяруць верх над людскім розумам, замяняюць спагаду, добразычлівасць, беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя.

Калі традыцыйна вобраз ваўка быў сімвалам свабоды, моцы, адзінства ваеннай дружыны, рода, носьбітам жорсткасці, то ў сіпакоўскай лірыцы ён сімвалізуе бяссільнасць і бездапаможнасць, з'яўляецца сведчаннем хцівасці сучаснага грамадства. Гэты вобраз становіцца амбівалентным.

Адной з асаблівасцей беларускай літаратуры XX стагоддзя стала выкарыстанне анімалістычных вобразаў і матываў у драматургіі. Сімвалічны вобраз сабакі прадстаўлены ў п'есе У. Сауліча "Сабака з залатым зубам" і п'есе-маналогу В. Ткачова "Добрае стаўленне да сабакі". У абодвух творах вобраз сабакі дапамагае больш яскрава ўбачыць сацыяль-

---

[214] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С.12.
[215] Там жа, с.109.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ныя праблемы сучаснага грамадства. Нярэдка за тымі, хто дэманструе сваё "добрае стаўленне да сабакі", хаваюцца двурушныя асобы. Маёр Козлікаў сваю любоў да псіны выказвае тым, што ставіць жывёле залаты зуб. На першы погляд, гэта чулы чалавек, але калі чытач далей знаёміцца з творам, выяўляецца тое, што маёр не можа дачакацца смерці сваёй маці, жадае хутчэй пазбавіцца ад яе. Ахоўнікі СІЗО трымалі сабаку Грышку з адзінай мэтай, якую выказвае былы арыштант Юрась: "Каб нам, арыштантам паказаць: глядзіце, нелюдзі вы, глядзіце, як мы добра ставімся да сабакі – нераўня вам, шалудзіўцам"[216] .

Такім чынам, сімвалічныя анімалістычныя вобразы маюць значны абагульняльны сэнс.

Алегарычныя вобразы традыцыйна даволі шырока прадстаўлены ў байках. Выдатным узорам беларускай анімалістыкі сталі байкі К. Крапівы: "Ганарысты парсюк", "Дыпламаваны баран", "Саманадзейны конь", "Каршун і цецярук" і інш. Звяры і жывёлы – героі баек У. Корбана, Э.Валасевіча, М. Скрыпкі і іншых аўтараў. У баечных творах персанажы фауны надзяляюцца чалавечымі рысамі – у многіх выпадках адмоўнымі, каб высмеяць некаторыя негатыўныя сацыяльныя і маральныя з'явы. Пэўныя характарыстыкі, якія замацаваліся за анімалістычнымі вобразамі ў беларускіх байках, знайшлі ўвасабленне ў празаічных ("Прыгоды аднаго губашлёпа" П. Васючэнкі і А. Вырвіча, "Кошка і мышка", "Пагібель зайца", "Парсюк" В. Быкава і інш.) і драматычных ("Страшнік Гам" П. Васючэнкі інш.) творах. Так, у аповесці "Прыгоды аднаго губашлёпа" П. Васючэнкі і А. Вырвіча ёсць сатырычная алегорыя, звязаная з вобразам свінні. Ва ўяўленні галоўнага героя, салдата Валентага, узвод, у якім ён служыў, падзяляўся "на губашлёпаў, свіней і прапаршчыка Афоніна". У творы без прыхарошвання паказваецца побыт у казарме: "Свінарнік быў падмуркам і гонарам гаспадарчага ўзводу. Свінні згадваліся ў гутарцы вайскоўцаў не радзей, чым людзі. Прапаршчык Афонін часам і не адрозніваў першых ад другіх, сцвярджаў, што "ўсе людзі – свінні"; праўда, дзеля таго яму трэба было назюзюкацца да парасячага віску"[217]. Сатырычная скіраванасць твора мае на мэце выкрыць чалавечыя хібы і заганы.

Такім чынам, вобразы прадстаўнікоў фауны ў творах сучасных пісьменнікаў з'яўляюцца алегарычнымі, яны адлюстроўваюць характары людзей, іх норавы, сацыяльныя абставіны, служаць сродкам сатырычнага паказу і выкрыцця чалавечых недахопаў, негатыўных грамадскіх з'яў, "балявых кропак" жыцця.

[216]Ткачоў, В. Добрае стаўленне да сабакі (П'еса-маналог) / В. Ткачоў // Першацвет. – 1996. – № 12. – С. 64.

[217]Васючэнка, П., Вырвіч, А. Прыгоды аднаго губашлёпа (Аповеды пра Валентнага) / П. Васючэнка, А. Вырвіч. – Мінск: ЧП "Рэд. газ. "Част. детектив", 1999. – С. 5.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У тыпалогіі анімалістычных персанажаў вылучаюцца фантастычныя вобразы. Пісьменнікі выкарыстоўваюць гэтыя вобразы з міфалогіі (напрыклад, вобраз ваўкалака ў апавяданні "Ваўкалакі" А. Каждуба), ствараюць фантастычныя сітуацыі, у якіх дзейнічаюць людзі і жывёлы (аповесць "Цкаванне вялікага звера", раман "Літоўскі воўк" А. Наварыча). У свядомасці пісьменнікаў узнікаюць новыя, невядомыя дасюль вобразы прадстаўнікоў фауны (паэма "Одзіум" Я. Сіпакова).

У апавяданні "Ваўкалакі" А. Каждуб звяртаецца да славянскіх міфаў. У творы пададзены трагічны вобраз ваўкалака:

"Ён быў апошні.

І ён яшчэ зрэдку сустракаў якое-небудзь вяселле. Сустракаў, бо ведаў, што трэба сустрэць, трэба ўбачыць маладых і пачуць скрыпку. Але ж навошта трэба было сустракаць гаманлівае вяселле, ён даўно забыўся.

І яны сустракаліся, і ў вачах яго здранцвела стаяла цьмяна глыбокая туга стагоддзяў.

... Ён, апошні, павярнуўся і пайшоў у лес"[218].

Паводле народных уяўленняў, існуе сувязь вясельнага абраду з пярэваратніцтвам: маладыя падчас вяселля могуць быць ператвораны ведзьмаком у ваўкоў, вярнуцца ў чалавечы воблік удаецца тады, калі музыка зайграе песню, якую ігралі ў момант іх зачаравання, таму ваўкалакаў заўсёды цягнула сачыць за вясельным цягнікам. У дадзеным творы аўтар выкарыстоўвае міфалагему ваўкалака. Гэты вобраз адрозніваецца ад таго, які прадстаўлены ў аповесці "Цкаванне вялікага звера" А. Наварыча. У ім такі тып міфічнай істоты разгледжаны ў псіхалагічным ракурсе: "Ваўкалак – гэта чалавек з паводзінамі звера"[219].

Сярод цэнтральных персанажаў твора асобнае месца займае спецыфічны вобраз чалавека-жывёлы, таму неабходна звярнуцца да больш разгорнутай яго характарыстыкі. Герой твора Леўка Грыцаў у гады вайны прыслужваў немцам, пасля перамогі схаваўся ў лесе, затым не толькі прыбіўся да ваўкоў, але і стаў іх правадыром: "Цемра, страшная цемра насунулася на Леўку, і ён нема завыў у гэтай суцэльнай цемрадзі, губляючы рэшткі розуму... І ў адказ пачуў выццё ваўкоў, якіх не баяўся, бо сам зрабіўся ваўком"[220]. У творы расказваецца пра чалавека-звера, які жыве не па грамадскіх законах: "Я памру, – мыркнуў Леўка. – Я даўно памёр, даўно не жывы, ні для цябе, ні для маццеры <...>"[221].

[218]Каждуб, А. Святы калодзеж: апавяданні / А. Каждуб. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С.327.

[219]Наварыч, А. Рабкова ноч: аповесці, апавяданні / прадм. А. Карпюка; А. Наварыч. – Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 43.

[220]Там жа, с. 66.

[221]Там жа, с. 63.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Гербы населеных пунктаў Гомельскай вобласці



г. Гомель



Гомельская вобласць



г. Мазыр



г.п. Акцябрскі



г. Рэчыца,
Рэчыцкі раён



Навабеліцкі раён г. Гомеля



г.п. Парычы
Светлагорскага раёна



г.п. Лельчыцы,
Лельчыцкі раён

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У аповесці пераплецены элементы рэалістычнага і фантастычнага. Між іншым, з'ява, калі чалавек можа адчуваць сябе ваўком, у медыцынскай літаратуры мае тэрмін "лікантропія". У творы сустракаецца шэраг фактаў, якія маюць ірэалістычны пачатак. Напрыклад, тое, што чалавек, адасобіўшыся ад людзей, за некалькі год стаў правадыром у ваўкоў. На гэты конт А. Карпюк слушна заўважае: "У вядомым творы Дэфо апісаны момант, калі герой назірае, як тоне чужы парусік. Рабінзон раздзяваецца ды плыве да яго. На апусцелай палубе знаходзяцца карысныя рэчы. Доўга не думаючы, напіхвае імі свае кішэні і плыве на бераг. Дэфо так нас зачароўвае, што і не заўважае падвоху – адкуль жа ў голага героя маглі з'явіцца кішэні.

Падобнае не раз спатыкаеш і ў гэтай кнізе.

Ведаеш дасканала, што адзічэлы Грыцаў Леўка не можа гэтак бегаць за ваўкамі, бо магчымасці чалавечага арганізму абмежаваныя. Але матэрыял у аповесці так па-майстэрску пададзены, што алагізму і не заўважаеш"[222].

З самага пачатку твора і да канца прасочваецца дваістасць асобы гэтага героя. Між іншым, успрыняцце дуалістычнага вобраза абумоўлена тым, як аўтар называе свайго героя. Звер, Важак, Гаспадар, Леўка Грыцаў – усё гэта адна асоба: "Ваўкі і не думалі вылазіць з асочанага лясочку. Тут, недалёка ад рэчкі, было зацішна. Не ўпудзіліся звяры і тады, калі да лёжкі прыцёгся па іхніх слядах ваўчыны правадыр. Важак, якога яны не заўсёды слухалі. Абраслы густым валоссем, пакрыты замест шапкі дзіравай анучай чалавек апусціўся на калені"[223]. "Звер ад ваўчынага рагалосся ўстрыбушнуўся, зароў пагрозліва, пасунуўся далей аж жылля. Праз некаторы час за галаслівым зверам цяглася зграя ваўкоў. Драпежнікі прынюхваліся да настаўбуранага звера, раптоўна адскоквалі, калі той рабіў рэзкі рух, нешта адкідваючы ад сябе. Тады ваўкі смела кідаліся наперад, грызліся з-за падачкі. Звер быў іхні Важак, быў іхні Гаспадар"[224]. Выкарыстанне фантастыкі ў творы дапагае стварыць трагічны вобраз чалавека-здрадніка.

Фантастычныя вобразы падкрэсліваюць драматычнае становішча навакольнага асяроддзя і ў мастацкіх творах на тэму Чарнобыля. Яны не толькі фіксуюць псіхалагічны стан чалавека, занепад навакольнага асяроддзя, а апасродкавана нагадваюць Апакаліпсіс.

Яскравым прыкладам з'яўляюцца вобразы жывёл-мутантаў у паэме "Одзіум" Я. Сіпакова. Тут гаворка ідзе пра мутацыю, якая правакуе гігантызм і розныя анамаліі ў жывёл:

> Мутацыя...
> Яна спараджае гігантызм у дрэў і жывёл.

[222] Наварыч, А. Рабкова ноч: аповесці, апавяданні / прадм. А. Карпюка; А. Наварыч. – Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 4.

[223] Там жа, с. 21.

[224] Там жа, с. 7.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Травіна расце нібы дрэва.
Лятаюць вялізныя, як вароны, камары, а вароны – быццам цяляты.
Жабы і то што тыя львы – такія вялізныя.
То няма зусім ног, то іх не хапае, то яны
лішнія.
Жарабятка з адных толькі ног – цягнічок, ды
і годзе. А правільней – сараканожка.
То няма зусім вачэй, то іх – не злічыць.
З адных толькі вачэй сабрана галава ў цялятка
Мутацыя – дзіця радыяцыі[225].

У творы гаворыцца пра набліжэнне Апакаліпсісу, трагедыйны стан жывой прыроды пасля разбурэнне яе чалавекам.

Што датычыцца псіхалагічных анімалістычных вобразаў, то да гэтага тыпу адносяцца тыя, якім уласцівы якасці людзей: уменне гаварыць, думаць, смяяцца і г. д. Зрэшты, пра гэта ўжо гаварылася раней. Часта анімалістычныя вобразы маюць алегарычны сэнс: у іх лёсах нярэдка ўгадваюцца чалавечыя лёсы. У падобных творах мастацкая думка скіравана да псіхалогіі, падсвядомага ці ірэальнага.

У беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя ўсё больш з'яўляецца твораў, дзе мастакі слова спрабуюць пранікнуць ва ўнутраны свет жывёл. Псіхалагізаваны спосаб адлюстравання рэчаіснасці дазваляе рэцыпіенту выяўляць "думкі", "пачуцці" анімалістычнага вобраза. Гаворка ідзе непасрэдна пра анімалізм, калі мастацкая свядомасць аўтара як бы раскрывае ўнутраны стан жывёлы. Адной з адметнасцей беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя з'яўляецца тое, што псіхалагізаваныя анімалістычныя вобразы ўсё часцей пачынаюць сустракацца як галоўныя персанажы твора – вобраз ваўчыцы з аповесці "Ваўчыца з Чортавай Ямы" Б. Сачанкі, вобраз сабакі з апавядання "Львы" І. Пташнікава, вобраз ваўка з апавядання "Рванае вуха", аповесці "Луп" Ю.Станкевіча і інш.

У 1975 годзе з'явілася аповесць "Ваўчыца з Чортавай Ямы" Б. Сачанкі. Твор складаецца з дзвюх частак. У першай апавядаецца пра жыццё Івана, які прыйшоў з арміі, планаваў перасыпаць хату, затым думаў ажаніцца. Хлопец паехаў у лес па мох. Завязка твора: Іван забраў з логава ваўчанят, каб потым атрымаць за іх грошы. У гэту паездку і перакрыжаваліся лёсы чалавека і жывёлы: "Іван, едучы па лесе, ці быў бы такі бесклапотна-спакойны, каб ведаў, што ўслед за ім, хаваючыся ў лазняках зарасніках, крадзецца, бяжыць ваўчыца – маці семярых, забраных у яе, ваўчанят <...>"[226]. Але калі

[225]Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 371.
[226]Там жа, с. 365.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прывёз іх дадому і паказаў маці, тая заўважыла, што ваўчыца не даруе і будзе цяпер помсціць усяму сялу. Словы жанчыны потым спраўдзіліся.

Пра жыццё ваўчыцы гаворка ідзе ў другой частцы твора. Лёс Падгалай склаўся няўдала. Спачатку ўпадабаў ваўчыцу Палена-Хвост, адбіўшы яе ад астатніх ваўкоў; пара адасобілася ад воўчай гайні. Здаецца, усё магло скласціся добра, калі б не самаўпэўненасць ваўка ("Тады яна, Падгалая, спазнала, які Палена-Хвост самаўпэўнены: ён ніколі не лічыўся ні з чыімі жаданнямі, рабіў толькі тое, што падабалася, хацелася яму, аднаму яму"[227]). Такая залішняя саманадзейнасць паспрыяла яго гібелі: ён быў застрэлены каля вялікай аўчарні, у якую Палена-Хвост палез, не дачакаўшыся цемені. Доўгі час Падгалая жыла ў адзіноце, потым нарадзіліся ваўчаняты, якія сталі сэнсам яе жыцця. Пасля іх страты, аслепленая горам ваўчыца пачала душыць без разбору скаціну ў наваколлі, за што яе празвалі "Рыжай смерцю". Аўтар надзяляе жывёлу людскімі якасцямі, здольнасцю думаць, разважаць ("Бывалі дні, калі Падгалай не шанцавала, і тады думкі яе былі змрочныя, невясёлыя. <...> Тады Падгалая зноў і зноў успамінала Палена-Хваста і кляла, папракала яго. "Можа, з тых ваўкоў, каго ён парваў, трапіўся б лепшы <...>"[228]), рабіць вывады ("Зноў яна думала пра той час, калі падрастуць ваўчаняты, калі яна прыйдзе ў гайню разам з імі, калі за яе зноў будуць кусацца і рваць адзін аднаго ваўкі-самцы. І зноў, пэўна ж, пераможа самы дужэйшы, і зноў забярэ яе, павядзе за сабой. "Толькі цяпер я буду не такая, як была, а разумнейшая, больш разважлівая, абачлівая"[229]), а падчас і перажываць ("<...> Ваўчыца гучна, са злосцю і крыўдаю кляцнула зубамі, і... слёзы, здаецца, самі паліліся з яе вачэй <...>"[230]). Пры стварэнні гэтага анімалістычнага вобраза аўтар выкарыстоўвае наступныя дзеясловы, якія падкрэсліваюць наяўнасць розуму ў звера: "падумала", "уцяміла", "уявіла", "зразумела", "спазнала", "не разгубілася", "не заплакала", "не паверыла", "успомніла", "здагадалася".

Фінал аповесці "Ваўчыца з Чортавай Ямы" Б. Сачанкі трагічны: аблезлую і абяссіленую Падгалую забілі, бо яна стала занадта небяспечнай.

Вобраз ваўчыцы ў творы выразна псіхалагізаваны, раскрываецца пры дапамозе персаніфікацыі, "плыні свядомасці", эмацыянальна афарбаванай лексікі.

Для беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя характэрны наступныя праявы:

– з'яўляецца усё больш твораў, у якіх галоўнымі героямі выступаюць

[227]Сачанка, Б. Выбраныя творы: у 2 т. / Б. Сачанка – Мінск: Маст. літ., 1981. – Т. 2: Чужое неба: Раман у навелах; Палескія былі. – С. 372.

[228]Там жа, с. 372.

[229]Там жа, с. 372.

[230]Там жа, с. 380.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прадстаўнікі фауны. Менавіта творы такога кшталту амаль засталіся па-за ўвагай беларускай крытыкі;

– мастацкая анімалістыка вызначаецца сваім маральна-гуманістычным пафасам, актуальнай на сёння экалагічнай накіраванасцю, блізкасцю да народна-міфалагічных традыцый. Гэтыя творы якраз сведчаць пра творчыя пошукі беларускіх пісьменнікаў. На першым плане мастацкага адлюстравання знаходзіцца як прыгажосць прыроднага свету, так і жыццё беларускай фауны ў яго экалагічнай існасці. Таму пісьменнікі ўсё часцей спыняюцца не на знешнім апісанні паводзін, а спрабуюць зазірнуць у душу жывёлы, выявіць яе думкі, пачуцці;

– літаратурны анімалізм – мастацкае выяўленне прадстаўнікоў фауны праз прызму чалавечага светаадчування, наданне ім уласцівасцей чалавечага характару – набыў у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя паўнавартаснае ідэйна-эстэтычнае развіццё, духоўна-маральную канцэптуальнасць думкі;

– ствараючы рэалістычныя, сатырычныя, фантастычныя, псіхалагізаваныя анімалістычныя вобразы, аўтары вырашаюць важную мастацкую задачу: спазнаць сутнасць чалавечага, раскрыць той стан, у якім знаходзіцца жывая прырода. Беларуская мастацкая анімалістыка ўсім сваім пафасам сцвярджае, што свет прыроды і чалавека – адзінае і непарыўнае існаванне.

## 2.2. Ідэйна-мастацкія тэндэнцыі ў развіцці літаратурнай анімалістыкі другой паловы XX стагоддзя

У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя мастацкая анімалістыка выявіла сябе найперш ў лірыцы (вершы "У Белавежжы", "Крык сойкі", "Вяртанне" П. Панчанкі, "На пахаванні жаўрука", "Калі парою лістападу", "Бусел", "Чаму груган чорны..." М. Танка, "Ласіны след" С. Грахоўскага, "Развітальная песня", "Жаўранак – звонкая ніць...", "Крумкачы", "О, мой цудоўны край", "Як размаўляюць звяры і птушкі", "Снягір", "Лебедзь", "Белавежскі алень" У. Караткевіча, "Матылёк", "Павук як іншапланецянін" Р. Барадуліна, "Бусліха" Л. Тарасюк, "Сабака ў моры", "Варона" А. Пысіна і інш.) і ў малых празаічных формах ("Былі ў мяне мядзведзі" У. Караткевіча, "Арчыбал", "Браканьер", "Алені", "Львы", "Пагоня" І. Пташнікава, "Ваўчыца з Чортавай Ямы", "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі, "Бусел" А. Кажадуба, "Рванае вуха" Ю. Станкевіча і інш.). Найменш мастацкая анімалістыка прадстаўлена ў драматургіі (п'еса-прытча "Песні ваўка", трагедыя-прыпавесць "Беркуты" У. Клімовіча і інш.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Адной з асаблівасцей мастацкай анімалістыкі ў лірычных творах з'яўляецца тое, што адлюстраванне анімалістычных вобразаў, як правіла, пазбаўлена прамой рэалістычнасці. Незалежна ад разнапланавасці і ў ідэйна-тэматычных, і ў жанравых адносінах лірык у слоўным афармленні вершаваных радкоў і выкарыстанні мастацкіх сродкаў заўсёды адухаўляе анімалістычныя вобразы. Наконт асобага становішча прадстаўнікоў фауны на мяжы прыроднага і духоўнага М. Эпштэйн адзначае: "Бяроза найчасцей прыпадабняецца да дзяўчыны, воблака – да думкі, зоркі – да вачэй, але ў дачыненні да жывёл такія метафары, якія "адухаўляюць", амаль немагчымы, таму што жывёлы маюць уласную "адухоўленасць". У зорках, аблоках, раслінах і таму падобных з'явах прыроды духоўнае прадстаўлена так хістка, шырока, невыразна. Жывёлы таксама валодаюць сваім уласным відавым і нават індывідуальным характарам, настолькі дакладным, што прыкметныя да яго традыцыйныя прыёмы іншасказання, персаніфікацыі ў той жа час ператвараюцца ў алегорыю, бедную паэтычным зместам, вартую ў асноўным для павучання"[231] . На думку даследчыка, само існаванне жывёл ёсць паэзія. Такія адносіны да прадстаўнікоў фауны былі ўсталяваны яшчэ ў першабытным сінкрэтычным мысленні.

Яшчэ адзін аспект функцыянавання мастацкай анімалістыкі ў літаратуры – выкарыстанне мастацкіх сродкаў. Акрамя таго, што яны найбольш распаўсюджаны ў лірычных творах (гэта адпавядае спецыфіцы лірычных твораў), тропы дапамагаюць больш ярка і дакладна паказаць аўтарскія адносіны да прадмета адлюстравання.

Пра асаблівасці выкарыстання ў паэтычных творах анімалістычных вобразаў дае ўяўленне паэтычная творчасць Я. Сіпакова. У яго вершах "шырокім спектрам" вобразаў, матываў, параўнанняў, метафар прадстаўлена мастацкая анімалістыка. Фауна ў лірыцы паэта – гэта ваўкі і мядзведзі, зубры і коні, шматлікае птаства. Дарэчы, арніталагічныя вобразы – дамінантныя ў сіпакоўскай паэзіі. Калейдаскоп прадстаўнікоў птаства, якія сустракаюцца ў лірыцы Я. Сіпакова, разнастайны. Ёсць тут і жаваранкі, і салаўі, і лебедзі, і вароны, і дамашнія гусі. Кожны з іх у сваю чаргу замацаваў за сабой пэўную сімволіку. Шматвяковыя традыцыі спецыфічнага ўспрымання вобразаў птушак знайшлі адбітак у вершаваных радках паэта. "Салаўіная бяссонніца", "лебядзіная вернасць", "белыя вароны" – гэтыя словазлучэнні маюць сваю семантычную нагрузку, якая дапамагала тлумачыць побыт, звычаі чалавека.

Немалая колькасць вобразаў птушак уваходзіць у сіпакоўскія параўнанні: "Ах, холад! Што да сэрца прычапіўся? // Званок... Як спеў... Так звоніш ты адна... // Здалося, жаўранак з-пад купіны ўсхапіўся. // Павіс у небе... Ты –

[231] Эпштейн, М.Н. Природа, мир, тайник вселенной...: система пейзаж. образов в рус. поэзии / М.Н. Эпштейн. – М.: Высш. шк., 1990. – С. 90.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нібы вясна, // Мая каханая!" [232] Або: "Твае рукі, твае рукі нада мною, – // Нібы лебедзі над белаю зімою"[233] .

Мастак пры дапамозе эпітэтаў супрацьпастаўляе два вобразы птушкі: "бяскрылай" і "раскальцаванай".

Раскальцаваная птушка – такі лейтматыў праходзіць праз усю лірыку паэта; ён з'яўляецца сімвалам яго паэзіі, сімвалам свабоды, прагі да творчасці:

Верш!
Ляці
раскальцованай птушкаю:
У цябе –
ўвесь сусвет лад крыллямі
("Каб неба цябе не загушкала..."[234]).

Уражання свабоды, палёту аўтар дабіваецца не толькі пры дапамозе метафар, эпітэтаў, ён робіць гэта графічна, нібы малюе верш. Такая форма верша, па словах З.Санюка, "напамінае палёт самой птушкі"[235]. Вершы Я. Сіпакова – сапраўдныя гравюры, на якіх пры дапамозе рысрадкоў аўтар малюе драматычнасць сюжэта, кульмінацыйныя моманты, спакойнае апавяданне. Радкі нібы з'язджаюць уніз, калі паэт расказвае аб тым, як сяброўка лебедзя, быццам камень, імгненна кінулася уніз. Яе падзенне ў прорву паэт, нібы мастак, намаляваў накалькімі штрыхамі, спаўзаючымі ўніз радкамі:

І горкі сум па сябруку сваім
Яна ў апошнім выдыхнула стогне,
А потым склала крылы –
і за ім,
Як камень,
паляцела
ў прадонне
("Лебядзіная вернасць"[236] ).

Верш "Ты кінуў слова ў мяне" ўвогуле нагадвае кардыяграму, графік, дзе самыя гучныя радкі, на якія прыпадае значная сэнсавая нагрузка, як быццам зашкальваюць па сваёй даўжыні ў суадноснасці з іншымі радкамі:

[232] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 153
[233] Там жа, с. 153.
[234] Там жа, с. 40.
[235] Там жа, с. 7.
[236] Там жа, с. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Відаць, так
Імкліва набліжаецца і вырастае Зямля
Для птушкі,
Якая праз секунду разаб'ецца аб засохлую дарогу.
Можа, адхінуцца?
Навошта! [237]

Мастак адступае ад канонаў класічнага вершаскладання. З. Санюк робіць слушныя вывады адносна сіпакоўскага верша: "Усеахопны імпэт рассоўвае "матэрыю" самой паэзіі, вызваляе яе ад праграмна-класічнай сістэмы вершаскладання, калі знікаюць усялякія межы і каноны жанраў, стыляў і накірункаў, бо паэзія сапраўды можа ўвабраць у сябе ўсё" [238].

Немалаважную ролю ў лірыцы Я. Сіпакова адыгрывае вобраз мядзведзя, які часцей сустракаецца ў прыродаапісальных вершах. Мастак малюе вонкавую і ўнутраную карціну жыцця прыроды. Так, у вершы "Маналог мядзведзя" сама назва скіроўвае на адлюстраванне ўнутранага свету звера, які пасля першай спячкі выйшаў з бярлогі. У творы няма апісання паводзін жывёлы, яго вонкавага выгляду. Рэцыпіент разам з тым даволі яскрава ўяўляе дзеянні звера: вось ён выйшаў з бярлогі, прыслухаўся, насцярожыўся, пачуў гукі, прынюхаўся, прагнаў смагу. Гэтыя дзеянні праілюстраваны думкамі мядзведзя. У сінтаксічным плане перадаць такія думкі дапамагае прыём пастаноўкі пытанняў і адказаў (што характэрна больш для дыялога, чым для маналога). Больш яркай перадачы думак жывёлы спрыяюць асаблівасці вершаскладання Я. Сіпакова. Разарваныя радкі тут – гэта ўвасабленне прыёму "пытанне–адказ", што стварае ўражанне "ўнутранага маналогу":

Ціха!
Нейкія дзіўныя гукі?..
Уцякаць?
Але ж не! Здаецца,
Небяспекай наўколле не пахне.
Дык хто ж тады там балбоча?
Зірну!..
То вада размаўляе[239].

Выкарыстанне мастацкіх параўнанняў (ноч "доўгая, быццам пушча", "цёмная, нібы бярлога") дазваляе аўтару найбольш ярка раскрыць думкі мядзведзя. Мядзведзь любіць мёд, ён гатовы яго есці аж да гаркаты ў роце.

[237] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С.172.
[238] Санюк, З. "З душы ўвесь чалавек сабраны...": літаратурны партрэт Янкі Сіпакова / З. Санюк // Родн. слова. – 1993. – №6. – С. 7.
[239] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 34.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэтую слабасць мядзведзя аўтар паказаў і ў вершы "Трава – мядзведзь мядзведзем". У творы з добрым гумарам абмалявана сітуацыя, калі пчолы збіраюць нектар з духмяных кветак. Трава нагадвае лахматага мядзведзя, якога быццам абляпілі насякомыя за тое, што звер спакусіўся на іх мёд:

Трава – мядзведзь мядзведзем.
У яе,
Як у мядзведжую поўсць калючыя дзяды,
Паўпіваліся пчолы...[240].

На ўспрыманне Я. Сіпаковым свету фауны ў пэўнай ступені ўплывае эмацыянальны стан і эстэтычны густ мастака слова, яго творчы метад, прыналежнасць да пэўнага літаратурнага кірунку ці плыні, што абумоўлівае, да прыкладу, выкарыстанне арыгінальнай і непаўторнай метафарычнасці або іншых вобразна-выяўленчых сродкаў, а таксама мастацкіх спосабаў і прыёмаў.

У другой палове XX стагоддзя назіраецца прыкметная светапоглядная эвалюцыя грамадства, адбываецца пераасэнсаванне гістарычнага вопыту чалавецтва. У выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, камп'ютэрызацыі, новых навуковых дасягненняў лексіка актыўна папаўняецца новымі словамі, некаторыя з якіх набываюць якасна іншую семантыку.

Усё гэта знайшло адлюстраванне ў беларускай мастацкай літаратуры, у якой на пярэдні план выступілі маральна-этычныя праблемы сучаснасці. Галоўнымі з іх з'яўляюцца ўзаемаадносіны паміж чалавекам і грамадствам, паміж чалавекам і прыродай. На гэту праблему звярнулі ўвагу ў сваіх працах сучасныя філосафы, сацыёлагі, гісторыкі, эканамісты, культуролагі і інш.

З пазіцый экалагічнага гуманізму ў кожнай са звязак трыяды "Чалавек – Прырода – Грамадства" вырашаецца свой блок задач. У схеме "Грамадства – Прырода" – гэта вызначэнне экалагічнага стану навакольнага асяроддзя ў суаднесенасці з агульнапрынятымі нормамі. У звязцы "Чалавек – Прырода" – вызначэнне экалагічнага стану чалавека і яго станаўлення як асобы. У схеме "Чалавек – Грамадства" – выяўленне тэхнагеннага і сацыяльнага ўплываў, прывядзенне да нормы экалагічнага стану Прыроды і Чалавека. Пастутова ў грамадстве надаецца ўсё большая ўвага праблеме гэтага ўзаемадзеяння, узрасла таксама цікавасць і да праблемы "Чалавек – Прырода". С. Залыгін у наваміраўскім артыкуле "Літаратура і прырода" падкрэслівае: "Для літаратуры заўсёды самым блізкім бокам жыцця былі пакуты людзей, трагедыя іх існавання на зямлі. На мой погляд, і культура ўзнікла менавіта тады, калі людзьмі была

[240] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 59.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўсвядомлена іх асабістая трагедыя. Крыніцай трагедый заўсёды з'яўляюцца адносіны паміж людзьмі – асабістыя, настолькі моцна адлюстраваныя Шэкспірам, а ў рускай літаратуры Ф. Дастаеўскім, грамадскія; <...> але вось у канцы XX стагоддзя выявілася зусім іншая сфера, і прычына глабальнай трагедыі – у адносінах паміж чалавекам і прыродай. І навізна, нечаканасць гэтай трагедыйнасці застала літаратуру знянацку, зусім не падрыхтаванай да яе новай ролі. Літаратура ўсё яшчэ не ўспрыняла "праблему прыроды" як безумоўна галоўную праблему сучаснага свету"[241].

У беларускай літаратуры адносіны чалавека з усім светам жывога з'яўляюцца адной з галоўных ідэйна-філасофскіх і маральна-этычных тэм. Мае рацыю В. Козіч, якая адзначае: "Узаемапаразуменне персанажа з прыродай сведчыць пра духоўна багатую натуру, пра здольнасць адчуваць мудрасць жыцця, прыроды. Творы так званай экалагічнай тэматыкі б'юць у званы ад таго, што насоўваецца на чалавецтва экалагічная катастрофа"[242]

Беларускія пісьменнікі актыўна падключаны да асэнсавання вострасучаснай праблемы "чалавек і яго адносіны да прыроды". У творах такога зместу акурат і выкарыстоўваюцца анімалістычныя вобразы. А. Бельскі адзначае: "Свет фауны ў беларускай паэзіі – гэта ў значнай ступені люстэрка духоўнасці асобы, увасабленне яе экалагічных поглядаў і маральна-гуманістычных перакананняў"[243].

Экалагічныя матывы гучаць у лірыцы П. Панчанкі. Для таго, каб падкрэсліць трагедыйны стан прыроды, аўтар выкарыстоўвае антытэзу ў вершы "У Белавежжы":

На пушчу нацэлены
З розных бакоў фотавочы,
Ласі ды алені
Красуюцца перад табой.
А дзік не ахвочы здымацца,
І зубр не ахвочы,
Адзін – у гушчар,
А другі можа рынуцца ў бой[244].

П. Панчанка стварае адметную, каларытную метафару, персаніфікуе пушчу – перад намі паўстае жывы, адухоўлены вобраз:

І так недарэчы
У гэтых лясах непацёртых

[241] Залыгин, С. Литература и природа / С. Залыгин // Новый мир. – 1991. – № 1. – С. 10.

[242] Козіч, В.І. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе / В.І. Козіч. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 3.

[243] Бельскі, А.І. Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі) / А.І. Бельскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та: Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. 2000 – №2. – С. 29.

[244] Панчанка, П. Збор твораў: у 4 т./ П. Панчанка – Мінск: Маст. літ., 1982 . – Т. 3: Вершы (1963 – 1981). – С. 53.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І рогат турыстаў,
І бляск тых прылад рэпарцёрскіх,
Што хочацца пушчы
Зялёныя вочы заплюшчыць,
Каб тлуму эпохі не бачыць,
А быць толькі пушчай...[245].

З твораў П. Панчанкі паўстае драматычна-трагедыйны лёс "братоў нашых меншых". Паэт просіць быць спагаднымі і міласэрнымі да ўсіх тых жывых істот, якія спрадвеку з'яўляюцца знакамі-сімваламі беларускага пейзажу:

А яшчэ прашу:
Пакідайце і буслу, і чайцы
Больш вады і неба на душу
("Не люблю я слова "пакарыцель"..."[246]).

Прырода як прадмет любові і шанавання выступае ў вершы У. Караткевіча "Як размаўляюць звяры і птушкі":

Закаханы ў жыццё і ў кожную мушку,
Я іду каля хат і росных садоў.
І са мной размаўляюць звяры і птушкі
На дзесятках і тысячах розных моў[247].

Паэт заўважае: "Я, напэўна, таксама здаюся ім зверам"[248]. Ён не ўзвышае чалавека над жывёламі. У. Караткевіч па-свойму асэнсоўвае хрысціянскія погляды, сцвярджаючы роўнасць усяго жывога на зямлі. У эпіграф да свайго верша "Вышэйшыя жывёлы, або "вянец тварэння" ён выносіць словы Канрада З. Лоранца: "... у вышэйшых жывёл патрэба і здольнасць прычыняць разбурэнні і шкоду ўзрастаюць прама прапарцыянальна ступені іхняй разумнасці"[249].

Паэт уздымае пытанне, супрацьлеглае традыцыйнаму біблейскаму: "чалавек – вянец тварэння":

І тое праўда. Лемур нецікаўны:
Вісіць на галіне плюшавым мішкаю.
Капуцын (з вузканосых) гарлае песні,
Псуюць уласныя цацкі мартышкі.

---

[245] Панчанка, П. Збор твораў: у 4 т. / П. Панчанка – Мінск: Маст. літ., 1982. – Т. 3: Вершы (1963 – 1981). – С. 53.

[246] Панчанка, П. Прылучэнне: вершы і паэма / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1987. – С. 374.

[247] Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 25.

[248] Там жа, с. 26.

[249] Там жа, с. 388.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Чым вышэй, тым больш разбуральна-цікаўныя
Нібы гарыла з пачкаю сернікаў...
Натуральна ўзнікае пытанне: "А людзі?"
І ўспомніў Хатынь, Херасіму і Герніку [250].

У вершы аўтар выкарыстоўвае побач з тропамі (параўнаннем, эпітэтамі) і сінтаксічную фігуру – рытарычнае пытанне. Маўклівасць жывёл падкрэслівае бездапаможнасць прадстаўнікоў фауны. Паэт не хоча мірыцца з падпарадкаванасцю жывёльнага свету капрызам і дзеянням чалавека.

Гуманістычнае станаўленне У. Караткевіча да жывёл раскрывае глыбока духоўны змест яго паэтычнай творчасці, дапамагае ўбачыць маральныя перакананні і прыярытэты чалавека сучаснага экалагічнага мыслення. Выкарыстоўваючы высновы М. Эпштэйна, звернем увагу на тое, што жывёлы – гэта "самая наглядная для чалавека форма іншабыцця духу, якую ён можа ацаніць як звышчалавечую, але якая так або інакш вызначае яго месца ў іерархіі светабудовы"[251].

З любасцю і замілаваннем апісвае У. Караткевіч маленькага Бурыка ў апавяданні "Былі ў мяне мядзведзі": "Шчанюк быў велічынёю з рукавічку, маленькі-маленькі, светлы. І вочкі былі ці то сінія, ці то проста з блакітнай каламуццю, як то бывае ў шчанюкоў. А дурныя ж, дурныя!"[252]. Апісанне жыцця мядзведзя ў людзей у апавяданні У. Караткевіча прасякнута добрым гумарам. Далейшы лёс Бурыка пасля яго вяртання ў лес застаўся невядомым. Толькі адзін раз сустрэўся з ім галоўны герой твора і то засумняваўся, ці сапраўды гэта быў яго Бурык. Іншая сітуацыя склалася з другім мядзведзем Тупам, які таксама быў адпушчаны ў лес. Апавяданне мае трагічны фінал, бо жывёла была застрэлена людзьмі, якія палічылі яго небяспечным. Спачатку прыручыць, а потым адпусціць на волю – такі ўчынак чалавека аўтар называе здрадай: "Паляванне толькі тады паляванне, калі яно адзінаборства. То што ўжо казаць пра звяроў, якіх мы кідаем ў рабства, прывучаем любоўю, а тады забіваем толькі за тое, што яны любяць нас і шукаюць нас.

Было гэта так, як быццам я сам адвёў сябра ў камеру смяротнікаў"[253]. У творчасці У. Караткевіча прасочваецца думка, што чалавек роўны прыродзе. Пісьменнік даводзіць: праз шчырую любоў да яе людзі ўдасканальваюцца.

---

[250]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч; аўт. прадм. В. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1: Вершы, паэмы. – С. 388.

[251]Эпштейн, М.Н. Природа, мир, тайник вселенной...: система пейзаж. образов в рус. поэзии / М.Н. Эпштейн. – М.: Высш. шк., 1990. – С. 88.

[252]Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т./ У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 3: Раман, аповесці. – С. 406.

[253]Там жа, с. 425.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мацярынскія крыллі. 1974. Г.Х. Вашчанка

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Жывая прырода выконвае важную ролю пры мастацкім адлюстраванні жыцця ў творах І. Пташнікава. Сапраўды, як зазначае С. Андраюк, у творах пісьменніка адбываецца пастаяннае, шматбаковае, шматаспектнае ўзаемадзеянне чалавека з навакольным светам: "З абставінамі першага, бліжэйшага плану (прырода, побыт, асабістыя ўзаемаадносіны, праца) – непасрэднае, шырокае, асабліва моцнае і інтэнсіўнае. З абставінамі ж другога, вышэйшага плану (грамадска-сацыяльнымі) – больш апасродкаванае, дзесьці як бы выбіральнае. Пры чытанні ствараецца ўражанне, што абставіны вышэйшага плану шмат у чым нібы паглынаюцца абставінамі першага плану, якія ў выніку набываюць большую шчыльнасць, глыбіню, маштабнасць"[254].

У творчасці І. Пташнікава вялікая ўвага надаецца пытанню аховы прыроды – аднаму з аспектаў праблемы "чалавек – прырода". У сваіх творах, у якіх шырока выкарыстоўваецца анімалістыка, І. Пташнікаў кожны раз акцэнтуе ўвагу на тым, што гінуць жывёлы не самі па сабе, а па віне чалавека. Прычыны розныя: браканьерства ("Алені"), вынікі чарнобыльскай катастрофы ("Львы"), проста безадказнасць, нежаданне прытрымлівацца маральнасці ў паводзінах, той пазіцыі, пра якую гаворыць Ліс Маленькаму прынцу ў вядомай казцы А. Сент-Экзюперы: "<...> Але ты не забывай: ты заўсёды ў адказе за ўсіх, каго прыручыў" [255]("Арчыбал" і інш.).

Як у прыродзе, так і ў грамадстве існуе ўзаемасувязь усяго і ўсіх; кожная клетачка, кожная ячэйка нясе ў сабе ўласцівасці, тэндэнцыі і законы вялікага свету жыцця чалавека, свету прыроды.

Асаблівай чысцінёй, паэтычнасцю прасякнуты ўзаемаадносіны персанажаў-падлеткаў з прыродай у апавяданні "Алені". Падзеі адбываюцца ў першыя пасляваенныя гады. У цэнтры аўтарскай увагі гісторыя, якая здарылася з дванаццацігадовай дзяўчынкай Іркай, дачкой лесніка. Іх сям'я жыве ў лесе. Дзяўчынка любіць і добра ведае лес. Неяк зімою яна сустракае аленяў, узбуджаная, доўга бяжыць за імі. Пазней тыя алені панадзіліся прыходзіць да леснікавага стажка сена. Ірка пасябравала з імі, прыносіла старому аленю пачастункі. Але бацька з Язэпам, рыжым і злосным чалавекам, аднойчы забіваюць старога аленя. Алені да стажка больш не прыходзяць. Дзяўчынка шукае іх, не жадае страціць. "Ірка пачула, як яе нешта душыць, сціскаючы горла. Пракляты гузік, не адшпіліла. Яна выпусціла кійкі і хацела зняць з галавы шапку, каб можна было б адвязаць рагі ў хустцы. Але рукі не слухаліся. Падвярнула раптам пад грудзі і моцна-моцна стукнула ў галаву.

Па полі пабеглі зялёныя алені.
Ірка ўпала на снег"[256].

[254] Андраюк, С. На пераломе. Беларуская проза 1986 – 2001 гадоў / С. Андраюк // Полымя. – 2003. – № 1. – С. 11.

[255] Сент-Экзюперы, А. Маленькі прынц: казка / А. Сент-Экзюперы; пер. з фр. Н. Мацяш. – Мінск: Юнацтва, 1989. – С. 417.

[256] Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 407.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Потым "у Іркі было запаленне лёгкіх"[257]. Гэта апошні факт твора. Ён надае апавяданню, вельмі лірычнаму паводле эмацыянальнага напаўнення, моцнае драматычнае гучанне.



Мал. 24. Алень, 1985. Л. Главацкая. Салома, ніткі, пляценне. Мінск.

Такі падзейны бок апавядання. Сам па сабе ён, магчыма, і не дае асаблівых падстаў для якіхсьці больш-менш значных высноў маральна-этычнага характару. Гісторыя як гісторыя. Ці мала такіх здараецца ў жыцці? Ды і ці так ужо страшна, што ў галодны час ляснік і Язэп забіваюць аленя? Дапушчальная і такая логіка, калі пра ўсё гэта разважаюць наогул, па-за кантэкстам, безадносна да ўсёй мастацкай сістэмы твора, яго эмацыянальнага напаўнення. Але твор мастацтва заўсёды трансфармуе рэальны жыццёвы факт: надае яму іншую прастору, глыбіню, логіку і паслядоўнасць развіцця і, нарэшце, новае своеасаблівае гучанне, адметны, ужо чыста мастацкі сэнс. Менавіта гэты змест, гэты сэнс цікавіць і хвалюе чытача ў творы мастацтва.

У апавяданні І. Пташнікава гісторыя, што адбылася з дванаццацігадовай Іркай і аленямі, насычана глыбокімі і чыстымі пачуццямі, сапраўднай паэзіяй адносін да прыроды. Забойства аленя для Іркі не было б такім балючым, такім па-сапраўднаму трагічным, калі б пісьменнік не паказаў тонка і глыбока натуральнасць і паэтычнасць, высокую жыццятворнасць узаемадачыненняў дзяўчынкі з навакольным светам.

Ірка бачыць, чым і як жыве прырода. Яна заўважае, як "увосень, калі стаіць пагода, шасціць пад нагамі мох і трава сівец, гараць сіняватыя пушынкі верасу на пасецы – верас высокі, што трава ў лучках. Па ім поўзаюць мурашкі, вялікія, з крылцамі, і лётаюць пчолы. Сядзе пчолка на верасовую галінку, калышацца, пасля нахіне яе аж да самай зямлі, абдыме ножкамі, перагнецца ўся, адтапырыць крылцы і лезе з галоўкай у маленькую кветачку. Пасля застыне, не кранецца, як памерла, – п'е"[258].

---

[257] Пташнікаў І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 407.

[258] Там жа, с. 393 – 394.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У лесе для дзяўчынкі, здаецца, няма нічога невядомага. Усё яна заўважае, бачыць, жыва адчувае.

"Да імшар падкралася ліса, падняла хвост і нюхае мох – чуе мышэй. Пасля, падняўшы хвост, схавалася ў папараці – пачула, як Ірка ішла з імшары, – і зноў стала ціха-ціха. Сонца вярнулася на захад, у небе застылі ружовыя хмары, і на пасеку з балота падзьмуў халадок. Загудзеў над галавою жук, ткнуўся ў шчаку і ўпаў на мох пад ногі. І тады Ірка пачула, як за двума чырвонымі ад смалы карчамі мые лапамі вушы заяц. Пачула, а тады ўгледзела яго, шэрага-шэрага. Нацёршы вушы, заяц пакруціў мордачкай і паскакаў на горку"[259].

Так бачыць прыроду, адчуваць яе – а ў творы неяк само сабою відаць, што свет успрымаецца і бачыцца дзяўчынкай, – можна толькі тады, калі любіш яе, захапляешся ёю, калі яна – гэта ты, аснова цябе, калі ты нібы выходзіш з яе і ўсё з ёй да драбніц табе знаёмае, ды не – усё тваё. Сустрэча з аленямі, сяброўства з імі – для Іркі нешта зусім новае ў яе ўзаемаадносінах з навакольным светам. Гераіня апавядання "Алені" І. Пташнікава адчула яго даверлівасць, любоў: "Назаўтра алені зноў прыйшлі да стога. Ірка карміла рагатага буракамі – узяла з сабой з гаршка з-пад прыпечка. Рагаты браў бурак з рукі вялікімі адтапыранымі губамі і жвакаў, не адрываючы рот... Галава ў яго была зусім малая, вочы – сівыя, мутныя, поўсць блішчала, гладкая-гладкая, бы яе прычасаў хто. Грудзі ў яго ўсе аб'інелі, – відаць, дыхаў на іх.

Ірка здзівілася была: як гэта такія вялікія рогі могуць быць на малой галаве?

*Рагаты ад яе ўжо не ўцякаў. Яна гладзіла яго па гарбатым носе, па халодных рагах, па шыі, – ён стаяў і слухаў*"[260].

У гэтым апавяданні, мабыць, упершыню ў творчасці пісьменніка так этычна аголена выявіўся цэнтральны для яго творчасці (а то і для ўсёй сучаснай літаратуры) канфлікт, а менавіта – вострая, непрымірымая барацьба розных адносін да жыцця, да навакольнага свету, найперш да прыроды – прагматычна-спажывецкіх і бескампрамісных, творча-паэтычных. У гэтым выпадку духоўную каштоўнасць чалавека І. Пташнікаў бачыць у яго прыроднай чалавечай сутнасці. Узрост у Іркі такі, што яна блізкая да паэтычнага ўспрыняцця прыроды. Рэальнасць і фантазія тут як бы зліваюцца, становяцца нечым адзіным, неабходным для сапраўднага чалавечага жыцця.

Як і ў "Аленях", так і ў апавяданнях "Алёшка" і "Бежанка" адносіны да навакольнага свету па-дзіцячы светлыя і чыстыя, эмацыянальна-інтуітыўныя, акунаюць нас ў атмасферу чагосьці паэтычна-таямнічага, вылучаюцца высокай этычнасцю, чысцінёй.

---

[259]Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. . 396.

[260]Там жа, с. 403.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

Трэці аспект праблемы "чалавек і прырода" – адносіны чалавека да прыроды як паказчык людской добрасумленнасці найбольш востра абазначаны ў апавяданні І. Пташнікава "Эфка".

Твор пра пасляваенных дзяцей, якія гуляюць са зброяй, патронамі і гранатамі (з'ява для тых часоў звычайная), набыў вялікай сілы трагічнае абагульненне. С. Андраюк, даследчык творчасці І. Пташнікава, адзначае: "Кожным сваім радком, які, як заўсёды ў гэтага пісьменніка, моцна насычаны рэальным жыццём і эмацыянальным зместам, твор гэты скіраваны супраць вайны, хоць адкрыта-публіцыстычна нідзе пра гэта не гаворыцца, хоць вінаватых дарослых у трагічнай смерці дзяцей быццам і няма" [261].

Вайна дае зброю ў рукі ўсім, нават тым, хто яе і трымаць не можа, нават тым, каму браць яе ў рукі супрацьпаказана самой прыродай. А зброя мае ўласцівасць абавязкова страляць. Апавяданне называецца "Эфка" – маецца на ўвазе граната, якую так любоўна называюць героі твора. Трэба адзначыць, што для яе больш яркай характарыстыкі І. Пташнікаў выкарыстоўвае параўнанні з анімалістычнымі элементамі. Так, апісанне эфкі даецца ў пачатку твора, калі Пашка Жарскі знайшоў гранату ў разгоенай саломе ў кароўніку: "Новенькую, чорненькую, як жук, <...>"[262], "Падперазаўшыся нанава, ён хуценька сабраў за пазуху патроны, а "эфку" трымаў у руцэ, як вялікае качча яйка падняў з купіны на балоце з гнязда. Толькі не блакітнае, а чорнае..."[263]. У апавяданні аўтар звяртае ўвагу на беражлівыя адносіны да "эфкі". Але ж у самы напружаны момант, перад тым, як здарылася трагедыя, падаецца кантрастная былой характарыстыка гэтай зброі (і зноў-такі аўтар спасылаецца тут на анімалістычныя вобразы): "Але над вухам трэснуў такі востры і дзяркаты стрэл, якога ён ніколі не чуў, страляючы і з пісталета, і з вінтоўкі – здалося, сарвала з галавы чэрап, – і ён, забыўшыся на ўсё, спалохаўся і, замест таго, каб тут жа шпурнуць "эфку" ў Вір пад вербалоз, а самому ўпасці на зямлю за бугарок і ўткнуць галаву ў сівец, прарэзліва закрычаў і адкінуў яе ад сябе, як усё роўна гадзюку, якую раптам выцягнуў з-пад карча. "Эфка" пакацілася з бугарка і схавалася ў белай дзяцельніцы, як дзікае качаня, уцякаючы з гнязда"[264]. А потым сама трагедыя выпісана не менш дакладна: "Іх усіх чатырох, у яго на вачах, як усё карова на вачах злізала..."[265] Пастаянныя сутычкі, бойкі, забойствы, нянавісць правакуюць праяўленне злых і нават звярыных інстынктаў у людзей. Зло нараджае зло, часта для тых, хто вельмі далёкі ад яго.

---

[261] Андраюк, С. Чалавек на зямлі: нарыс творчасці І. Пташнікава / С. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1988. – С. 142.

[262] Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 429.

[263] Там жа, с. 430.

[264] Там жа, с. 438.

[265] Там жа, с. 439.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Толя Вайда – вобраз, які быў для беларускай літаратура ў многім новым. Пісьменнік спачатку заўважае, што Вайда Толя краў патроны ў паліцаяў, шукаў зброю, каб потым пастраляць па жывых мішэнях: "Лазіў увосень па садах і па градах; краў у хлявах з-пад курэй яйкі і піў іх сырыя; не хадзіў, а бегаў вечна з пушчалкай у руках і біў вокны. Знайшоўшы ў Віры ржавы ствол ад вінтоўкі, адрэзаў напільнікам канец і зрабіў сабе самаробны пісталет. Страляў з аўтаматных патронаў сарок, варон, бацянаў, курэй, сабак..."[266]. Кім жа быў на самой справе Толя Вайда? Відаць, пра многае ўжо кажуць яго ўчынкі. Пасялілася ў гэтым дванаццацігадовым хлопчыку нейкая дзікая прага крыўдзіць, ніцчыць, душыць. Нельга без агіднага ўзрушэння чытаць сцэну, як Вайда душыць мышэй: "Узлаваўшыся, што нічым не ўдалося пажывіцца ў двух кароўніках, Вайда Толя пачаў душыць мышэй – таптаў босымі нагамі. Згледзіць мыш, падскочыць, ступіць нагой, пакаўзнуўшыся на ёй, як на лёдзе, і, лаячыся, валіцца ў салому. Мышы кусаліся, акрывавілі яму пальцы на назе, і ён звярэў: мацюкаўся і крычаў на весь кароўнік. Цяпер усе глядзелі толькі на яго: пасталі і ўтаропіліся. Для Вайды Толі, здавалася, нічога цяпер на свеце не было: толькі мышы. Забыўся ён на патроны, якія бразгалі ў яго ў сумцы; на гранаты, якія ўсю вайну шукаў, так і не знайшоўшы; ён цяпер, як прагавіты кот, душыў мышэй – расціскаў босай пятой – і, хапаючы за хвост, кідаў іх у дзверы – дзецям пад ногі. Вялікую сівую мыш з белым, як у малацэ, вушкам ён ніяк не мог задушыць – ступаў пятой, а мыш вышмыквала з-пад яе, што ў ката з лап; ён злаваў, мацюкаўся, і ў яго з рота яшчэ больш цякла сліна"[267].

Нараджаецца трывога, чаканне нейкага няшчасця. І тут узнікае пытанне. Калі чалавек можа забіць жывёлу, гэта значыць штосьці жывое, то наступным крокам можа быць чалавек? Праз адносіны да свету прыроды, да жывёл мастак раскрывае характар персанажа. Характар жорсткі ў чалавека, які, не задумваючыся, можа забіць жывую істоту.

Апавяданне І. Пташнікава "Арчыбал" – пра неабдуманыя адносіны чалавека да прыроды. Чалавек падпарадкаваў сабе ўсё жывое, сведчаннем таму з'яўляецца лёс мядзведзя, які залежыць цалкам ад чалавека, у апавяданні яго таксама вырашыў чалавек. Спачатку той забраў звера з роднага дому (лесу), потым вырашыў лёс адзінай дачушкі Люські, а затым трагічная смерць напаткала мядзведзіцу Маргарыту: "Яго Маргарыта любіла волю, як і ён, і вырывалася з канюшні на волю як магла. Любіла яна і маленькую Люську. Але Люську любілі і людзі: дрэсіроўшчык, даглядчыкі, прыбіральшчыкі, дырэктар, адміністратар і... артысты. Усе лезлі яе пагладзіць і совалі цукеркі. А як ненавідзіла іх за гэта Маргарыта! Кожны раз хапала Люську і

[266]Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 432.

[267]Там жа, с. 435.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сціскала, ашчапіўшы ў абдымкі – хавала ад людскіх рук і воч. Сціснула была адзін раз і задушыла... Больш у іх малых не было. Пасля смерці Люські Маргарыта, парваўшы ланцуг, выбегла з канюшні днём у самую гарачыню – было гэта летам, як цяпер, – на вуліцу і трапіла пад машыну. Маргарыту прывезлі ў канюшню яшчэ жывую...

І Арчыбал зноў застаўся адзін"[268].

Арчыбал успамінае сваё жыццё. Аўтар робіць сюжэтны паварот – вяртае нас у мінулае. Рэтраспекцыя высвечвае моманты, калі Арчыбал упершыню ўбачыў гэты загадкавы і суровы свет, калі ён нават не здагадваўся, што ёсць жалезныя клеткі, у якіх – няволя. Нарадзілася медзведзяня ў глухую зімовую пару, якраз у самыя моцныя маразы. Выпаў снег, густы і чысты. Цнатлівы, нічым не крануты, ён схаваў ад чужога вока сляды ля бярлогі, быццам наўмысна накрыў іх, каб паспрыяць новаму насельніку лесу.

Свая логіка нават у тым, што першая яго часавая мяжа, дзе бярэ адлік мастацкая прастора, – ад чыстага снегу, ад святла. З ім нарадзілася медзведзяня, свабоднае, не залежнае ад чыёй-небудзь волі. Пра яго лёс і расказваецца ў апавяданні. Але, калі глянуць глыбей, у аўтарскую задуму, то гэты твор – найперш пра наша стаўленне да жывога, да братоў меншых, да іх жыцця, у якім – па нашай бязглуздай волі – непрадказальныя павароты, што прыводзяць звера да трагедыі.

Зусім не па выпадковым збегу абставін крута мяняецца доля Арчыбала. Ён, страціўшы маці, што загінула ля бярлогі пад гусеніцамі трактара, становіцца заложнікам чалавечых уцех і забаў. Тут свая наканаванасць, што трымаецца на праве дужэйшага.

Кожны круг лёсу мядзведзя побач з людзьмі выпісваецца ў мастацкіх карцінах. У іх адметная колеравая гама. Але ўсё ж больш светлых таноў, бо Арчыбал падсвядома ўсё, што адбываецца з ім і побач, звязвае з маці, а праз яе – з воляй.

Што такое для гэтай жывёлы воля? Гэта сасновы пах, багун, маліны. З воляй, нарэшце, звязвалася яго надзея пачаць усё нанава, вярнуцца ў мінулае. "Ён знойдзе яшчэ сваю Маргарыту... У яго ўсё наперадзе..." – лейтматывам праходзяць яго думкі праз увесь твор.

І вось доўгачаканая мара здзейснілася. "Ён, Арчыбал, спачатку быў ап'янеў на лініі ад волі і цёплага сасновага смалістага духу. Устаў на заднія лапы і закружыўся на месцы, сам не ведаючы чаму – ад радасці? Пасля адразу пусціўся бегчы на чатырох вузкай лініяй у той бок, куды падаўся Дзімыч. Ён не мог так адразу астацца без людзей, без

[268]Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 2: Аповесці, апавяданні. –С. 460 – 461.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзімыча і, як чуючы што, баяўся волі..."[269] Воля для мядзведзя – незалежнасць ад чалавека. Нават тады, калі Арчыбал уцякаў ад галасоў сабак і людзей, ён, канечне, не ведаў, што гэта аблава. Мядзведзь уцякаў ад чалавека. Ад чалавека! Ад таго, хто на самай справе хацеў забіць яго, пацешыўшы сябе. Аўтар нават не называе імён людзей. Існуюць проста Гаспадар і Госць. Мастак абагульняе гэтыя вобразы для таго, каб падкрэсліць, сканцэнтраваць увагу чытача на тым, што за агульнымі назвамі стаіць усё чалавецтва, кожны з тых, хто выкарыстоўвае прыроду дзеля сваіх мэт, пацех, забаў.

Зламаў, уварваўся ў саму "псіхіку" мядзведзя чалавек. Апынуўшыся ў лесе, мядзведзь Арчыбал жыве асацыяцыямі, параўноўвае свае ўчынкі і навакольнае асяроддзе з цыркам:

"Лапы пайшлі цішэй – нібы закруцілі пад сабой на манежы цяжкія педалі веласіпеда...

Ён яшчэ раз спыніўся, на мінуту, каб перавесці дух і агледзецца... Пасля зноў пабег...

У канцы лініі была паляна – чыстая і круглая, як арэна ў цырку. Яе высвеціла ядранае калючае сонца – зверху, з-за лесу, нібы цыркавымі пражэктарамі"[270]. А можа, хоць гэта ўратавала яго на той паляне, дзе павінен быў сустрэць смерць Арчыбал. На паляне, якая аднаму была пляцоўкай для стрэльбішча па жывой мішэні, а другому раптам здалася арэнай цырка, на якой з радасцю кінуўся ў прысядку: "Пасля, ступіўшы ўперад на паляну, аддаў адной лапай салют, вітаючы, як у цырку з арэны, Гаспадара і Замежнага Госця, і пайшоў, пружынячы на задніх лапах, не на Госця, як перш, а па крузе па паляне, махаючы лапамі – прыхінаў адну да грудзей – да белага гальштука, другую адкідваў набок навотліж, ківаючы ў такт сваёй пружыністай хадзе – пайшоў у танец"[271].

З аднаго боку – І. Пташнікаў супрацьпастаўляе жывёлу чалавеку. А з іншага – паказвае, як мядзведзь мае тыя ж дурныя звычкі, што і чалавек ("Мядзведзі, як і людзі, любяць курыць і любяць піць")[272]. Нават паміраe звер як зламаны чалавек: ад бессэнсоўнасці жыцця або проста ад гора становіцца алкаголікам.

"Рабочыя леспрамгаса, прыходзячы ў запаведнік, у магазін, давалі Арчыбалу спачатку акуркі – ён жаваў папяросы, і махорку, – пасля хлеб, абліты вінам. Арчыбал хутка прывык да "чарніла", і пасля, калі рабочыя не давалі яму ў лапы бутэльку, ён ламаў клетку, праціўна скрыгатаў зубамі, аж кроў ішла з рота, і роў немым голасам на ўвесь лес.

---

[269]Пташнікаў І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 468.

[270]Там жа, с. 469.

[271]Там жа, с. 472.

[272]Там жа, с. 473.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рабочыя занадта часта давалі яму "чарніла", і ён піў яго з бутэлькі з рыльца, як і яны.

Праз два гады ён "схапіў" цыроз печані і "пасадзіў" сэрца, як гаварылі рабочыя.

Памёр ён на трэці год, раніцай у глухую восень"[273].

Чалавек адчувае сябе Богам, які можа вырашаць лёс усяго жывога на Зямлі. Ён нават не задумваецца над тым, колькі шкоды стварае, прымяняючы гэтую сваю ўладу. Такую праблему падымае ў сваім творы І. Пташнікаў. Ён заклікае задумацца над жыццём звяроў і птушак, якія трапляюць у рукі чалавека. Смерць жывёлы па віне чалавека паказана на прыкладзе яшчэ аднаго прадстаўніка беларускай фауны – лася. Дарэчы, гэты вобраз – адзін з улюбёных анімалістычных вобразаў І. Пташнікава, рэцыпіент успрымае яго як рэальную істоту: "І вось пазаўчора вечарам адбылося ўсё нечакана-негадана. Лось прыйшоў да крыніцы, пад Выселцы. Прыйшоў вечарам, у вадапойны Піняў час. Прыйшоў і піў, не зважаючы на рысакоў. Малады, шыракагруды, з разгатымі рагамі" ("Браканьер"[274]). Трагічная смерць гэтага звера – адзін з лейтматываў, які праходзіць праз шэраг твораў аўтара ("Тартак", "Найдорф", "Браканьер" і інш.).

Апісанне смерці лася ў аповесці "Тартак" намалявана з рэалістычнай выразнасцю. Дынаміку падзей перадае ланцужок дзеясловаў: "Лось раптам падагнуў пад сябе пярэднія ногі, крутнуўся на бок, падняўшы галаву з рагамі, і ўстаў на задніх. Пярэднія ў яго былі цяпер сагнуты, і ён, дрыжучы, апіраўся на калені. Пастаяўшы на каленях, ён задзёр яшчэ вышэй галаву, паклаўшы на спіну рогі, што дзве шырокія лапаты, і зарыкаў. Моцна, як толькі мог, – прагалам далёка пайшлі адгалоскі; балюча і жаласна, што карова, калі ад яе адсаджаюць цяля; пасля ціха, задыхаючыся і круцячы галавой у бакі... Тады раптам асеў, грукнуўшы грудзьмі на карэнне і ўдарыўшы пысай аб зямлю, і сціх, лежачы на жываце і на падкорчаных пярэдніх нагах.

Пасля ўсхапіўся зноў на заднія ногі і скочыў уперад, дзе не было людзей, – неяк піхнуў сябе аднымі заднімі нагамі, пярэднія ў яго былі сагнуты ў каленях і цягнуліся па зямлі, і адразу ўпаў на траву ў свежым месцы і стаў біць нагамі па зямлі. З-пад яго паляцеў мокры мох і дзёран, тады сыпанула шорсткім жвірам...

Пасля лось зноў стаў на заднія ногі і, ужо не магучы падняць ад зямлі пярэднія, пачаў круціцца на адным месцы, як ушчаміўшы ў што галаву. Абваліўшыся на зямлю, ён качаўся з боку на бок і страсаўся, як ад вады, – з-пад яго зноў паляцела зямля і пырскі ад крыві. Біў заднімі

[273]Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Алавяніанні. – С. 473.

[274]Там жа, с. 368.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нагамі, рвучы з карэннем малады соснік і рыючы ля сябе яму. Ён ляжаў ужо на адным баку, не пераварочваючыся, і біў нагамі толькі ля сябе пад бокам... Памалу – ногі ў яго дрыжалі і выпростваліся, як ад сутаргі... Пасля ён зноў рвануў з зямлі, хочучы ўстаць на ногі, і ссунуўся ў яму, якую вырыў нагамі збоку... Застагнаў ціха і цяжка, што чалавек"[275].

У аповесцях "Тартак", "Найдорф" вобраз лася выконвае другасную ролю. Найбольш яскрава вобраз гэтага звера пададзены ў апавяданні "Пагоня". У цэнтры твора – праблема ўзаемаадносінаў чалавека і грамадства. Апавяданне пра жыццё лася: яго маладосць, турботы аб жыцці ласіхі і дзіцяці, адзіноцтва па віне чалавека (забілі яго сям'ю), уцёкі ад пагоні ваўкоў, перадсмяротны бой. Твору нездарма папярэднічае прысвячэнне: "Усяму жывому на свеце". У святле таго, пра што расказваецца, прысвячэнне папераджальнае. Фінал гэтага твора І. Пташнікава трагічны. Празаік працягвае сусветна вядомы сюжэт рабінзанады – барацьба за выжыванне. Закон выжывання пануе ў жывёльным свеце і дзейнічае ў свеце людзей, што і паказвае аўтар апавядання. Мастацкі свет пташнікаўскіх твораў, які "насяляюць" жывёлы, не зусім адназначны. Калі ў "Аленях" і "Львах" звяры існуюць як рэаліі прыроды, то ў апавяданні "Пагоня" анімалістычныя вобразы набываюць сацыяльную значнасць, і часам цяжка сказаць: чалавек перад намі ці жывёла? У гэтым праяўляецца язычніцкае (паганскае) уяўленне чалавека пра мадэль жыцця прыроды ў цэлым. У "Пагоні" вобразы жывёл, акрамя гэтага, утрымліваюць яшчэ і алегарычны сэнс. Жорсткія законы, якімі жывуць звяры дзеля таго, каб выжыць, нагадваюць прынцыпы ўладкавання сучаснага грамадства. "Звярыная грызня на выспе, дзе ваўкі зжэрлі лася і потым накінуліся адно на аднаго – алегарычнае адлюстраванне таго, што адбываецца вякі вякі між людзей. <...> Апавяданне, зразумела, не пра жывёльны свет, хоць дзеючыя асобы ў ім лось і ваўкі (калі можна чатырохногіх называць асобамі). Яно пра нас, людзей", – адзначае У. Мехаў[276].

Такім чынам, анімалістычныя вобразы дапамагаюць вытлумачыць сацыяльныя прыярытэты грамадства. Жывая прырода выконвае важную ролю пры мастацкім асэнсаванні жыцця ў творах І. Пташнікава.

Праблема грамадскай значнасці паказана і ў творах В. Быкава. Анімалістычныя вобразы ў яго аповесцях прадстаўлены даволі фрагментарна, але іх сэнсаўтваральная функцыя вельмі істотная для цэласнага разумення шэрагу яго твораў, у першую чаргу такіх, як аповесць "Воўчая зграя". У гэтай аповесці аўтар параўноўвае фашыстаў са зграяй ваўкоў. І такое параўнанне, думаецца, невыпадковае, бо яшчэ ў індаеўрапейскай міфалагічнай традыцыі

[275] Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 2: Аповесці, апавяданні. – С. 93 – 94.

[276] Мехаў, У. Нельга не парадавацца / У. Мехаў // ЛіМ. – 1999. – 20 жн. – С. 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зграя ваўкоў выступае сімвалам адзінай дружыны воінаў. Гэты вобраз у творы звязаны з паняццямі барацьбы, вайны, пошукамі ахвяры. У "Воўчай зграі" сустракаюцца два вобразы ваўка: як рэальнай істоты (з-за яго Ляўчук страчвае свайго сябра Грыбаеда) і як сімвала звярынай сутнасці фашызму (з-за яго галоўны герой страціў родных, блізкіх, сяброў).

Чалавек, яго экзістэнцыяльны стан, канфлікт з грамадствам – гэта цэнтральная праблема аповесці В. Быкава "Аблава", яна раскрываецца на прыкладзе трагічнага лёсу Хведара Роўбы, якога спачатку прыдашчыла, а потым цынічна раструшчыла савецкая ўлада. В. Быкаў даследуе душу чалавека, у якой, як у люстэрку, адбіваецца раздваенне новай эпохі. У дадзеным выпадку можна правесці паралель з раманам Г. Гесэ "Стэпавы воўк". Звяртае на сябе ўвагу своеасаблівая мазаічнасць структуры гэтага твора: перад намі шматслойны філасофскі раман (філасофія Ніцшэ, творчасць Гётэ, светапогляд Дастаеўскага, даследаванні Фрэйда, Юнга, ідэі хрысціянства, філасофска-рэлігійныя сістэмы Усходу і інш.).

Вобраз ваўка ў творы пададзены па-мастацку разнапланава. Упершыню ён з'явіўся ў Гесэ ў апавяданні "Воўк" (1928), а таксама сустракаем яго ў публіцыстыцы, дзённікавых запісах пісьменніка. Даследчыкі творчай спадчыны Гесэ (Р. Каралашвілі, Е. Лявонава і інш.) разглядаюць гэты вобраз у трох ракурсах: міфалагічным, філасофскім і псіхалагічным[277].

Уяўленне пра ператварэнне чалавека ў ваўка (ізгоя) і драпежніка (забойцы) яднае многія міфы, уключаючы і комплекс "чалавека – ваўка", які вывучаўся З. Фрэйдам і яго паслядоўнікамі.

У псіхалагічным плане ў асобе Гары існуюць два пачаткі: ад чалавека і ад жывёлы, дух і інстынкт, свядомасць і падсвядомасць, або, паводле Юнга, "сацыяльная скура" і "самасць".

Што датычыцца філасофскага асэнсавання вобраза ваўка, то тут ён з'яўляецца не менш чым ніцшэанскім сімвалам "дыферэнцыяванага адзінца", які супрацьстаіць натоўпу. У пэўных выпадках Ніцшэ называе яго "зверам", а іншым разам "геніем". Тут зліліся і супрацьпаставіліся адзін аднаму свет хаосу і моц розуму, духоўныя гульні і матэрыяльная рэчаіснасць, ізгой і безаблічнасць наваколля, душа Стэпавага ваўка і буржуазны свет.

Менавіта, як Ніцшэ супрацьпастаўляе асобу Звышчалавека гэтаму свету, свету людзей, у сваёй філасофскай працы "Так гаварыў Заратустра", так Гесэ супрацьпастаўляе грамадству Стэпавага ваўка. Даследчыца Е. Лявонава слушна гаворыць аб аналогіі паміж поглядамі Ніцшэ і героем Гесэ: "Абодва ўсведамляюць сваё месіянства, далучаюць да бессмяротных сваю геніяльнасць, абодвум уласціва пакутлівая хваравітасць, як

[277] Каралашвили, Р. Мир романа Г. Гессе / Р. Каралашвили – Тбилиси: Сабчота Сакартвело, 1984. – 264 с.
Лявонава, Е.А. Плыні і постаці: з гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX - XX ст.: дапам. для настаўнікаў/ Е.А. Лявонава – Минск: Рэд. часоп. «Крыніца», 1998. – 336 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

душэўна-маральная, так і фізічная; перадусім яна і ўтварае паміж Ніцшэ і героем Гесэ інтымнае, у пэўным сэнсе, падабенства"[278].

Урэшце, прыгадваючы Ніцшэ, трэба адзначыць, што па-рознаму выкарыстоўваліся яго ідэі. Ідэя Звышчалавека, цяга да волі – гэта матывы, якімі, на думку многіх даследчыкаў, карысталіся Гітлер, Мусаліні. Таму многія прыпісваюць фашызму ідэі Ніцшэ. Заратустра (а сучаснікі бачылі яго ў асобе Гітлера) – той Звышчалавек, якога чакала чалавецтва дзеля ўтварэння новай сусветнай дзяржавы.

Блізкароднасныя ідэі яднаюць фашызм і сталінізм. У прыватнасці, абедзве ідэалогіі многае бяруць ад Ніцшэ. Нездарма зараз параўноваюць гэтыя дзве з'явы. У сваім артыкуле "Магістрал" С. Дубавец, закранаючы тэму падзей 30-х гг. у кантэксце з распаўсюджанай у творчасці Быкава тэмай вайны, піша: "Адсутнасць вайны надзіва незаўважная. Таксама і аўтарава вернасць сабе не выклікае сумлеву. Інакш кажучы, вайна і фашызм тут цалкам саступілі месца давайне і сталіншчыне, і падмена не цвеліць вока"[279]. Далей даследчык абгрунтоўвае факт ідэнтычнасці фашызму і сталінізму, цытуючы словы самаго В. Быкава пра раман В. Гросмана "Жыццё і лёс": "Менавіта з гэтага рамана мы зведалі падабенства страшэнных рэчаў, што да дзіўнага падабенства дзвюх, як здавалася, цалкам процілеглых сістэм улады ў найбуйнейшых дзяржавах Еўропы. Высвятляецца, імперскі рух у Германіі намінальна з'яўляўся таксама і сацыялістычным, ставіў на мэце збудаванне германічнае народнае дзяржавы, што, праўда, на расавым грунце; гітлераўская партыя афіцыйна насіла назву "нямецкая нацыянал-сацыялістычная рабочая партыя"; фактычнай асновай улады і тут і там быў адкрыта выяўлены аўтакратызм; абедзвюм дзяржавам, хоць, можа, і ў рознай ступені, былі ўласцівы такія з'явы, як культурны нігілізм, улада ўсемагутнае тайнае паліцыі, разгалінаваная, беспрацэнтная ў гісторыі зямной цывілізацыі сістэма канцлагераў, поўная зняважа элементарных правоў чалавека" [279].

Чым падобныя і чым адрозніваюцца Хведар Роўба В. Быкава і Гары Галер Г. Гесэ? Яны адзінотнікі, ахвяры пэўных абставінаў, абодвух яднае думка аб доме. Абодва героі падобная на ваўкоў. Для Хвёдара Роўбы было галоўным дайсці да роднага кутка. Гары Галер – адзінотнік, які блукае ў пустэчы. Герой прабіраецца па вялікай, бязмежнай прасторы, спрабуючы знайсці тут прытулак, або... сябе. Ён звонку глядзіць на людзей, успрымае іх як натоўп, з якога немагчыма вылучыць ні твару, ні постаці. Гэтыя людзі, нібы маленькія пясчынкі, аднолькавыя, падобныя адна да адной, якія за-

---

[278]Лявонава, Е.А. Плыні і постаці: з гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX – XX ст.: дапам. для настаўнікаў / Е.А. Лявонава – Мінск: Рэд. часоп. "Крыніца", 1998. – С. 169.

[279]Дубавец, С.І. Практыкаванні: проза, эсэ, крытыка / С.І. Дубавец. – Мінск: Маст. літ., 1992. – С. 165.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Галава каня. 1885. Ю.М. Пэн



На купанне. 1958. Г. Гажэнка-Злотнік

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сыпалі ўсю зямлю. І толькі сапраўдная Асоба можа паўстаць з гэтай масы. Яна здольная сама супрацьстаяць віхурам жыцця, якім без усялякай разважлівасці падпарадкоўваюцца гурбы пяску, уздымаючыся ў паветра, а потым паступова ўладкоўваючыся ў дзюнах. Яны поўнасцю аддаюцца свайму лёсу. І толькі галоўны герой адчувае ў сабе моц, здольнасць самому рэгуляваць сваё жыццё (на яго думку ён сам можа выбраць дзень сваёй смерці і здзейсніць задуманае). Гэта нялёгкае выпрабаванне – супрацьставіць сябе навакольнаму свету. Такое выпрабаванне з'яўляецца цяжэй удвая ад пачуцця адзіноты. Галоўны герой адчувае сябе адзінокім ваўком сярод стэпу. Адсюль і назва твора – "Стэпавы воўк". Сімвалічная і назва твора В. Быкава "Аблава". Воўк – дужы, моцны звер, якога не так проста перамагчы. Чалавек, як правіла, не ідзе адзін на адзін на паядынак з гэтай істотай. Ён бярэ з сабою на аблаву іншых людзей, выкарыстоўвае шэраг сродкаў (гукавыя сігналы), каб акружыць ваўка, загнаць у тупік, а потым ужо забіць. Толькі так яго можна адолець. Загнаным ваўком адчувае сябе чалавек-ізгой, якога не прымае грамадства. Матыў гэты мае карані ў старажытнагерманскіх юрыдычных тэкстах, законах хетаў, а таксама ў Платона, дзе сэнсавая формула "чалавек – воўк" засведчана ў адносінах да злачынцы. Злачынцамі, дакладней "ворагамі народа", лічыла савецкая краіна тых, хто не хацеў прыстасавацца да яе ўкладу жыцця, ідэалогіі, хто не захацеў думаць, меркаваць, дзейнічаць "па-савецку". Гэтыя людзі з'яўляліся той перашкодай, якая нібыта "псавала" дзейнасць "агульнадзяржаўнага млына", які імкнуўся ператварыць усё і ўсіх у аднолькавую масу. Таму звычайных працаўнікоў трэба было зламаць, вылавіць, зацкаваць. Матыў аблавы на чалавека, асобу гучыць у творах рускай літаратуры: у вершах "Нобелеўская прэмія" Б. Пастэрнака, "Ідзе паляванне на ваўкоў..." У. Высоцкага і інш. Назва "Аблава" ў В. Быкава дакладна выяўляе трагізм паказаных падзей. Час прымусіў Хведара Роўбу хавацца ад людзей, мець ваўчыную маску на жудасным карнавале смерці. Па-рознаму складваюцца адносіны галоўных герояў В. Быкава і Г. Гесэ з грамадствам. Гары Галер – адзінотнік, які сам адасабляе сябе, сваё ўнутранае жыццё ад дамаганняў знешняга свету. Хведар Роўба хоць і жадаў быць бліжэй да людзей, побач з імі, але яны вымушаюць яго стаць ізгоем. Матыў жыцця і смерці гучыць у абодвух творах. Хведар Роўба, загнаны, як воўк, у багну, заканчвае сваё жыццё самагубствам. Для Хведара смерць – самае лепшае выйсце з тых абставінаў, у якія ён трапіў. Для Гары Галера смерць – выхад у вечнасць, бессмяротнасць.

Героі Г. Гесэ і В. Быкава, як мы пераконваемся, маюць трагічныя маскі. Гэтае ператварэнне дае шмат матэрыялу для роздуму і параўнанняў. Узнікае шэраг пытанняў: чалавек хоча жыць або існаваць на гэтай зямлі? Ён гатовы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пайсці на гібель за ідэю або ад ідэі? Па-рознаму інтэрпрэтуюць вобраз ваўка пісьменнікі. Хведар Роўба і Гары Галер адчуваюць сябе чалавекам і ваўком адначасова. Герой В. Быкава – "воўк", які адбіўся ад сваёй зграі, стаў адзінотнікам. Герой Г. Гесэ быў "загрызены" сваімі ж "родзічамі" – так нішчаць ваўкі параненых і слабых жывёл. Абодва героі знаходзяцца ў безвыходным становішчы, якое прыносіць цяжкія пакуты. Драматызм іх перажыванняў вынікае з адчування раздвоенасці асобы. Мастакі слова шляхам ідэйна-вобразных параўнанняў і сэнсава-змястоўных аналогій выявілі трагізм існавання чалавечай асобы ва ўмовах несвабоды.

Так, асэнсаванне сацыяльна-філасофскіх, маральна-этычных пытанняў звязана з выкарыстаннем анімалістычных вобразаў, якія набываюць важную ідэйна-сэнсавую ролю пры раскрыцці разнастайных тэм і праблем, у паэтыцы розных мастацкіх кірункаў (рэалізму, экзістэнцыялізму і інш.). Гуманістычная экалогія зрабілася асновай сучаснага пісьменніцкага светапогляду, неад'емнай часткай пазнання быцця і свету. Драматычна-трагічны лёс жывёл у творах такіх аўтараў, як І. Пташнікаў, у першую чаргу сведчыць пра сутнасць чалавечай псіхалогіі, стан чалавечай маралі. Свет анімалістычных вобразаў – крыніца для сэнсава значных аналогій і параўнанняў, звязаных з жыццём грамадства. Як правіла, пісьменнікі, звяртаючыся да мастацкай анімалістыкі, ствараюць сацыяльныя алегорыі, па-філасофску канцэптуальныя карціны рэчаіснасці і гістарычнага часу ("Воўчая зграя", Аблава" В. Быкава і інш.).

Такім чынам, праблема чалавека і прыроды адлюстроўваецца ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя ў некалькіх аспектах: прырода як прадмет любові і шанавання; неабходнасць аховы прыроды; адносіны чалавека да прыроды – паказчык людской добрасумленнасці; прырода як філасофія духоўнага быцця асобы.

У другой палове XX стагоддзя адбыўся паварот літаратуры да тэм маральна-гуманістычнай, духоўнай значнасці – прыроды, кахання, чалавека і сусвету, сэнсу зямнога жыцця і інш. Стала найбольш актуальнай экалагічная праблема, якая адлюстравана ў творчасці П. Панчанкі (вершы "У Белавежжы", "Крык сойкі, "Вяртанне", "Не люблю я слова "пакарыцель"..."), У. Караткевіча ("Балада пра дзіка і чалавека", вершы "Белавежскі алень", "Калі паміраюць...", "Вышэйшыя жывёлы, або вянец тварэння"), Я. Сіпакова (вершы "Ваўчыца ў звярынцы", "Скарга прыручанага ваўка", паэма "Одзіум") і інш.

Такім чынам, для беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя характэрны наступныя мастацкія праявы:

– узрастанне экалагічнай трывогі, абвастрэнне праблемы чалавек і прырода (апавяданні "Арчыбал", "Браканьер", "Львы" І. Пташнікава, апавяданне "Бляха" А. Федарэнкі і інш);

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

– ідэя гуманізму, пафас абароны ўсяго жывога на зямлі (апавяданне "Алені", "Пагоня" І. Пташнікава, аповесць "Ваўчыца з Чортавай ямы" Б. Сачанкі і інш.);

– маральна-філасофскія шуканні; пошукі адказу на хвалюючыя пытанні чалавечай душы (апавяданне "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі, "Воўчая зграя" В. Быкава, "Цкаванне вялікага звера" А. Наварыча, апавяданне "Бусел" А. Кажадуба, аповесць "Прыгоды аднаго Губашлёпа" П. Васючэнкі і А. Вырвіча і інш.);

– суадносіны гомацэнтрызму і прыродацэнтрызму; ідэя духоўнасці, высокамаральных паводзін чалавека (аповесці "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько, апавяданне "Былі ў мяне мядзведзі", аповесць "Чазенія" У. Караткевіча і інш.).

## 2.3. Свет фауны пасля Чарнобыля ў беларускай літаратуры 80 – 90-х гадоў XX стагоддзя

Тэма ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды набыла асаблівую актуальнасць у 80-я гады мінулага стагоддзя, калі беларускую зямлю напаткала страшная чарнобыльская трагедыя – пятая частка краіны была забруджана радыяцыяй. На сёння занатавана шмат фактаў, якія сведчаць пра вялікія людскія страты. Вынік чарнобыльскай аварыі – катастрафічны стан, у якім апынулася прыроднае асяроддзе. Зразумела, што беларускія пісьменнікі не маглі абысці ўвагай гэтую праблему. Мастацкая анімалістыка ў творах пра Чарнобыль прадстаўлена вобразамі фауны, якія асэнсоўваюцца сучаснымі мастакамі слова ў розных ракурсах: рэалістычным, псіхалагічным, сімвалічным, фантастычным. У рэалістычным свеце прадстаюць анімалістычныя вобразы ў апавяданні В. Казько "Сенакос у канцы красавіка". Бездапаможнымі, нікому не патрэбнымі істотамі выглядаюць сабакі: "Хаця гэта мяжа і ёсць, яна і ў часе: ноч з 26-га на 27 красавіка 1986 года. Яна і ў прасторы, куды дасягнула тая ноч. І усё ж чалавечаму воку яна нябачна. <...> Пэўна, больш выразна ўбачыў яе толькі адзіны чалавек. Акадэмік Лягасаў, што іменна ў той дзень развітаўся з жыццём... Паведамленне аб гэтым яны пачулі з машыннага радыё ўжо ў дарозе. Акадэмік Лягасаў, якога ўразіла не сама зона, а паводзіны сабак, што жылі ў ёй, імкненне сабак да чалавека і ўцёкі чалавека ад іх"[280].

[280] Прайсці праз зону: проза, паэзія, публіцыстыка / уклад. І. Бутовіч; прадм. І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С. 46.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Шэраг анімалістычных вобразаў-сімвалаў прадстаўлены ў аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел". Гэта і бусел, і кабаны, і вароны, і адзічэлыя сабакі і іншыя істоты. Жыццё іх паказана ў кантэксце чарнобыльскай бяды, праз прызму духоўна-экалагічных поглядаў аўтара. Твор В. Казько мае розныя планы (рэалістычны і фантасмагарычны), ён успрымаецца як сучасная казка для дарослых і твор-малітва. Адна з мастацкіх форм рэагавання на чарнобыльскую трагедыю – малітва. Здаецца, у гэтай цяжкай безвыходнай сітуацыі чалавеку застаецца адно – маліцца, спадзявацца на цуд, які можа вывесці з лабірынтаў трагедыйнага становішча. Паэты і празаікі даволі часта звяртаюцца да малітоўна-хрысціянскіх матываў і інтанацый пры мастацкім раскрыцці гэтай трагедыі, выкарыстоўваюць іх у творах розных жанраў: у аповесці ("Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько), у вершах ("Вячэрняя малітва" А. Пісьмянкова, "Малітва наступнасці" Р. Барадуліна, "Атамная малітва" В. Зуёнка), у паэмах ("Галгофа" К. Жука, "Аварыя сумлення" А. Зэкава) і інш. Гэтым прыёмам карыстаюцца аўтары, у творах якіх анімалістычныя вобразы набываюць сімвалічнае ўвасабленне. Малітоўны заклік гучыць у назве твора В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел".

Адным з галоўных вобразаў аповесці з'яўляецца бусел, гэты вобраз шматаспектны, сімвалічны. Па-першае, гэта сімвал беларусаў як народа. Птушка разглядаецца як татэмная. Раней, у дабіблейскія часы, не чалавек, а прырода ўзвышалася над чалавекам. Людзі абагаўлялі жывёл, пакланяліся ім, лічылі іх сваімі продкамі, тлумачачы сваё паходжанне ад буслоў. У аповесці В. Казько бусел – тая птушка, ад якой пайшлі беларусы: "А спачатку ўсё белае было, як у катка твайго грудка, светлыя белыя птушкі вольна хадзілі па нашай зямлі з даўняй пары і па сённяшні дзень. Ад першага бусла, які і паклаў пачатак усяму нашаму буслінаму роду-племені"[281]. Па-другое, гэты вобраз нясе адчуванне святасці і ахвярнасці. Па-мастацку ярка і запамінальна малюе В. Казько бусла, калі птушка разгортвае ў палёце свае крылы: у такі момант яна нагадвае крыж: "У сінім небе распнутым белым крыжом, выразна акропленым кроўю, ляцеў бусел і нёс у дзюбе жывую галінку, абуджанага вясной крывавага чырвонага ракітніку"[282]. Крыж – знак Божы, але ж кроў на ім – сведчанне і напамін пра пакуты і ахвяры Ісуса. Вобраз бусла тут асацыіруецца з хрысціянскай сімволікай.

У творы апавядаецца пра два віды буслоў: белага і чорнага. Першыя сяляцца каля чалавечага жытла. Чорны ж бусел, наадварот, жыве пераважна ў старых, глухіх лясах, далей ад людзей. У прыродзе гэтыя птушкі не

[281]Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 52

[282]Там жа, с. 83.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сябруюць адна з адной, у большасці трымаюцца паасобку. "Чорны бусел баіцца ці не давярае чалавеку, хаваецца ад яго, а белы цягнецца да яго і любіць прыгажосць. Птушка, птушка, а разбіраецца"[283].

Увогуле, у творы падзеі паказаны праз прызму паганскага і хрысціянскага светаразумення. Паводле казак, якія расказвае бабуля ўнучцы, чорны бусел таксама быў некалі белым, але, перазімаваўшы на радзіме, "жывучы ў цёмным лесе, поўзаючы па балоце, дыхаючы закураным дыханнем Змея Гарыныча"[284], стаў чорным: "<...> ён увесь спрэс чорны. Так родная зямля аддзячыла бусла за яго вернасць"[285]. Ён блукае па балоце, шукае Змея Гарыныча, каб той не атруціў паветра новым "чыхам". "Чарната гэтая сімвалічная. Але насуперак звыклай для нас традыцыі сімволіка тут не адмоўная, а станоўчая. Яна знак вернасці роднай зямлі, палескім балотам", – даводзіць Д. Бугаёў[286].

Чорны бусел – загадкавы і таямнічы персанаж аповесці. Ён выступае сімвалічным вобразам адраджэння Радзімы, Белай Русі, якая ўчарнела ад атруты Чарнобыля. Трактоўка вобраза чорнага бусла, які асацыіруецца з атручанай радзімай, сустракаецца і ў лірыцы Э. Акуліна:

– Ад чаго ты самотны, бусел,
у гняздзе над знямелай вёскай?
– Я сумую па Белай Русі,
дачарнобыльскай, чыстаросай.
– Ад чаго пачарнеў ты, бусел,
у палескім бары атрутным?
– Ад жалобы па Белай Русі,
зганьбаванай і шматпакутнай[287].

Або:

Чорны бусел – як крык з-пад хмары,
Як пракляцце жывому роду.
Кожны першы – такую кару
Бог прыдумаў народу...
("Балада пра кожнага першага")[288]

Разам з тым пра яго расказваецца як пра рэдкага прадстаўніка птушынага царства, які занесены ў Чырвоную кнігу. З ім сустрэўся на балоце Лазар

[283] Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 105.
[284] Там жа, с. 118.
[285] Там жа, с. 118.
[286] Бугаёў, Д. Спавядальнае слова: літаратурная крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – С. 225.
[287] Прайсці праз зону: проза, паэзія, публіцыстыка / уклад. І. Бутовіч; прадм. І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С.169.
[288] Акулін, Э Крыла анёла: вершы / Э. Акулін – Мінск: ПаліБіг, 2000. – С. 71.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кагановіч, калі прыйшоў туды па ясень для вясельца. Пісьменнік уключае ў сюжэтную канву твора вобраз чорнага бусла, каб чалавек шляхам назіранняў за прыродай, параўнанняў сваіх і яе законаў жыцця, праз аналіз уласнага і яе побыту здолеў лепш зразумець сябе, удакладніць сваё месца ў іерархіі светабудовы. Як толькі дакрануўся Лазар да кроны ясеня, то "нібыта ўвайшоў у тое дрэва"[289]. Яго рука не здолела загубіць дрэва. Сякера, якой ён замахнуўся, адскочыла і трапіла па назе, палілася кроў (адсек мезенец). Закапаўшы частку сябе самога на гэтым жа самым месцы, Лазар звяртаецца да чорнага бусла: "Ну вось, пабраталіся, парадніліся крывёй, акураціст. Да сустрэчы"[290]. Гэты эпізод скіроўвае да асэнсавання чалавека як часткі прыроды: ён – проста імгненне ў яе вечным жыцці: "Баліць веданне, што цябе, такога, якім ты прывык сябе бачыць, ужо больш ніколі не будзе. І твой заяц, твая рыбіна, грыб і дуб пераживуць цябе. Дуб мо пралапоча лістотай, ахопленай вольным ветрам. Язь варухне плаўніком, пахітае цёмным хвастом. І знікне ў глыбіні ці ўдыхне ружовымі жабрамі паветра ў руках некага іншага; заенчыць, заскуліць заяц-русак, затроплены не табой, а тым, іншым..."[291]. Чалавек – унікальная адзінка ў прыродным асяроддзі і яе жывая часцінка. Асабліва ўражальна гучыць гэтая думка ў канцы аповесці: "Клён здрыгануўся. Неба хіснула гняздо бусла, клён пайшоў на яго. Лазар падняўся яму насустрач і ўвайшоў у дрэва"[292]. Што азначае гэтая смерць? Трагічная гібель? Выхад у бессмяротнасць? Ахвяра дзеля выкуплення ўласнага і агульначалавечага граху? Гэта смерць звязана з пэўнымі сімваламі. Па-першае, з дрэвам. Галоўны герой двойчы "ўваходзіць у дрэва". У творы гучыць матыў "дрэва жыцця", якое ў аповесці сімвалізуе вяртанне да пачаткаў, абсурднасць быцця, асабліва пасля Чарнобыля і перабудовы. Па-другое, у творы ў другім вымярэнні паўстае чорны бусел. Нават Аўгуст Серада пазайздросціў смерці Лазара: "Калі падбег Аўгуст Серада, усё ўжо было скончана. Ён успрыняў усё, што адбылося тут, як належнае. Таму што сам быў не супраць увайсці, увабрацца ў такі клён. Схавацца ў гняздзе чорнага бусла. Жыць так, як жыў ён раней, Аўгуст больш быў няздольны і не жадаў"[293]. Падчас смерці герой згадвае, як яго завуць на самой справе – Янка Каганец. У аповесці ён называецца Лазарам, імя з вядомага біблейскага сюжэта пра ўваскрашэнне Хрыстом Лазара. Лазар як бы апынуўся ўнутры прыроды, стаў яе непадзельным цэлым: "З напаўрасцятага кулака Лазара сыпаўся на зямлю чорны радыяктыўны пясок і змешваўся, набрынькваў крывёю"[294]. Так ядналася душа чалавека з прыродай. І не

[289]Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 147.
[290]Там жа, с. 44.
[291]Там жа, с. 25.
[292]Там жа, с. 147.
[293]Там жа, с. 147.
[294]Там жа, с. 147.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

проста ядналася, а ўлівалася ў яе вялікую душу, паколькі, паводле Бібліі, імення кроў ёсць душа ўсяго жывога: "Если кто из дома Израилева и из пришельцев, которые живут между вами, будет есть какую-нибудь кровь, то обращу лице Мое на душу того, кто будет есть кровь, и истреблю её из народа её, потому что душа тела в крови, и Я назначил её вам для жертвенника, чтобы очищать души наши, ибо кровь сия душу очищает"[295]. Гэта быў другі раз, калі Янка Каганец парадніўся з прыродай (першы, калі закапаў мезенец каля гнязда чорнага бусла). Дарэчы, паводле Левіту, чалавек, які жадае прынесці ахвяру за грэх, частку крыві яе павінен пакласці на ахвярнік, астатнюю яму трэба выліць на зямлю. Б. Сачанка ў сваіх "Запісках аб радыяцыі" зазначыў: "Навука патрабуе ахвяр, у тым ліку і чалавечых", – сказаў, выступаючы па тэлебачанні, адзін з кіраўнікоў атамнай энергетыкі. Але ж мы ўсе сталі ахвярамі, заложнікамі не навукі, а невуцтва"[296].



Мал. 25. Павук, які смяецца, 1881. А. Рэдон

Шмат ахвяр у гэтай аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел", якія выкупляюць грахі чалавецтва: Лазар, павук-крыжавік, дзікі і інш.

Павук-крыжавік сканаў і рассыпаўся ў труху. Аўгуст Серада рашыў, што "нібыта не павук сядзеў у шклянцы, а жыхар неба нейкі"[297], бо "не было ў празрыстай цямніцы ніякіх адыходаў паднявольнага жыцця"[298]. З гэтай прычыны і не забіваў насякомае, хоць і чуў пра тое, што таму, хто заб'е павука, даруецца сорак грахоў. Мабыць, кожны з сарака дзён жыцця павука – адзін даравань грэх чалавеку. За вар'яцтва і сапсаванасць людскую павук пакутаваў і мучыўся, носячы на сваёй спіне вялізны крыж.

[295] Библия. Кн. Свящ. Писания Ветхого и Нового Завета. – М.: Междунар. издат. центр православ. лит., 1995. – С. 115.

[296] Прайсці праз зону: проза, паэзія, публіцыстыка / уклад. І. Бутовіч; прадм. І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С.353.

[297] Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 63.

[298] Там жа, с. 63.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэты вобраз павука мае даволі арыгінальную трактоўку ў аповесці, набывае хрысціянскую сімволіку. Няцяжка правесці паралель з біблейскім крыжавым лёсам, які яму выпаў, і пакутлівай смерцю.

Прынеслі сябе ў ахвяру, загінулі, закончылі сваё жыццё самагубствам дванаццаць дзікоў, што патапіліся ў канаве. Які ў гэтым сэнс? Такое пытанне ставіць В. Казько ў сваёй аповесці "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел": "Звяры ж – вольныя людзі, нікому не служаць, і ідзі няма ў іх такой, за якую можна вечна пакутаваць і наважыцца страціць сябе..."[299]. Чалавек і жывёла. Дык хто ж з іх аказаўся ў трагічнай сітуацыі вышэй? Чалавечая думка здолела прыдумаць танк для забойства. Дзік падобны на гэтую машыну. Толькі ён сам здольны загубіць сябе: "<...> дзік – жывы танк са сталі і брані мышцаў. І ён для жыцця. Што яму гэтая застойная канава, пяць-шэсць метраў у шырыню. Адзін толькі раз рохкнуць і не азірнуцца"[300]. Аўгуст Серада пашкадаваў, што даў дазвол праклaсці меліярацыйную канаву: "<...> апаганіў зямлю, а карысці ні на грош"[301]. Дзікі з'яўляюцца ў творы невыпадкова, аўтар узвышае іх да дванаццаці апосталаў. Яны паўсталі супраць бяздумных адносінаў чалавека да акаляючага асяроддзя.

Не менш трагічнай здаецца доля, якая выпала ў творы "ваўкам" – здзічэлым сабакам. Яны засталіся пакінутыя людзьмі ў зоне: "Некалі яны былі сябрамі і вернымі служкамі людзей і не цураліся нічога чалавечага. І нічога звярынага таксама не цураліся. Звер, што прайшоў навуку ў чалавека, які потым здрадзіў яму, ірве, разбурае, пэўна, нешта асноватворнае ў сабе і назаўсёды пазбаўляецца ад міласэрнасці. Толькі інстынкт, помста і разбурэнне рухаюць ім"[302]. Сабакі маглі адказаць злом на здраду чалавека, з якім адвеку яны былі лепшымі сябрамі. Сюжэтныя падзеі, звязаныя з гэтымі істотамі, з'яўляюцца трагедыйнымі і напружанымі ў аповесці. Напал звярынай нянавісці да людзей гатовы праявіць сябе ў любы момант. У аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" сабакі толькі на пэўны час прымушаюць чалавека задумацца пра долю пакінутых жывёл. Калі прапалі з вёскі ўсе дзеці, дарослыя падумалі, што іх знішчылі сабакі (на самай справе яны пабеглі на бойку ў суседняе сяло, вярнуліся ўсе жывыя).

Розум чалавека і інстынкт звера спрачаюцца, супрацьстаяць адзін аднаму. Бог даў чалавеку ўладаранне над усімі жывымі істотамі. Што значыць адносіцца да ўсяго па-гаспадарску? Берагчы і ахоўваць або рабіць усё, што надумаецца? Праз увесь твор чырвонай ніткай праходзяць гэтыя пытанні. Па людской віне пакутуе ўсё навокал: жывёлы дзікія і дамашнія, расліны і найперш ён сам, чалавек. Думка яго здолела расшчапіць атам. "Хай жыве

[299]Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 70.

[300]Там жа, с. 70.

[301]Там жа, с. 71.

[302]Там жа, с. 27.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Чарнобыль!" – іранічна зазначае аўтар пры апісанні корму варон "нябеснай маннай" – зернем з зоны, якое сыплецца з неба. Яно для птушак – і знаёмы ласунак, і невядомая ім яшчэ атрута. "Думкі да дабра не даводзяць, скарачаюць чалавеку яго век, – піша мастак слова. – Выкрый іх, свет у тую ж мінуту перавярнуўся б"[303]. Сам сябе прымусіў пакутаваць чалавек, сам сябе пакараў зоркай Палын. "Думка людская – сабака шалёны. І на ланцуг яе не пасадзіш, не ўтрымаеш на ланцугу"[304]. Усё самае пачварнае, непрыемнае, паводле слоў аўтара, нарадзілася з думкі: "Узяць таго ж камара ці жабу. Іх жа спачатку прыдумаць трэба, толькі тады яны з'явяцца"[305]. Увогуле, з такой істотай, як жаба, у творы асацыіруецца ўсё цёмнае, ганебнае. Выратаваць ад вар'яцтва, бессэнсоўнасці жыцця чалавека можа толькі чорны бусел. Гэта істота унікальная, рэліктавая: "Чорны бусел – птушка неразгаданая, незразуметая чалавекам. Нейчы цень, што прыбіўся і заблукаў на зямлі, мо з іншай нават планеты трапіў у палескае балота. Ёсць у ім высокае, нябеснае – крылы і здольнасць лятаць, лунаць. Ёсць і зямное ганебна-нізкае, змяіна-паўзучае. Вытыркне з травы чорную, як галавешка, галаву – гад паўзучы, і цябе пекануць цікуе. Кожная сустрэча з ім знак і перасцярога нейкая чалавеку, і нечаканасць чалавеку" [306].

Чорны бусел – гэта адзіная птушка, якая, здаецца, сапраўды можа ўратаваць лес, бо занесена ў Чырвоную кнігу, і дзе яна гняздуецца, там забараняецца вынішчаць лясы. На яе ўскладаюць усе свае спадзяванні мясцовыя жыхары, калі размова ідзе пра высечку лесу. І яна ж – тая рэліктавая істота, у якую вераць, да якой моляцца і бабуля, і Лазар... "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел", – даносіцца ад агульнага малебнага хору. Назва твора гучыць ва унісон гэтаму маленню.

Элементы малітвы сустракаюцца як у эпічных, так і ў ліра-эпічных творах. У паэме Я. Сіпакова "Одзіум" сустракаем алюзію на адну з самых галоўных хрысціянскіх малітваў "Ойча наш". Солам гучыць яна на фоне харавога выканання, гарманічнага шматгалосся аўтарскіх разважанняў.

Пэўныя паралелі можна правесці паміж структурай паэмы і асноўнымі часткамі кананічнай малітвы. Умоўна "Одзіум", як і "Ойча наш", можна падзяліць на тры часткі: 1) заклік ("Ойча наш, калі ты ёсць на нябёсах!"); 2) сем просьбаў; 3) славаслоўе ("Калі ёсць царства, сіла і воля Твая з веку ў век. Амінь"). У першай частцы аўтар апісвае сітуацыю, якая склалася на Беларусі пасля чарнобыльскай катастрофы. Ён гаворыць пра выпрабаван-

[303]Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 84.

[304]Там жа, с. 84.

[305]Там жа, с. 84.

[306]Там жа, с. 42.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не веры, бязмежную цярплівасць беларускага народа. У звароце да Бога аўтар просіць не за сябе, а за сваю Бацькаўшчыну: "Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне на- // ша, о Божа, бязмежнае!" [307]

Забруджанымі аказаліся зямля і паветра. "Божа наш літасцівы, – вярні ранейшае значэнне гэтым спрадвечным паняццям!" – гучыць першая просьба паэта. Наступная – "Хлеб наш надзённы, дай нам днесь..." Радкам з малітвы супрацьстаяць словы з паэмы Я. Сіпакова: "А мы сеем на мёртвых землях мёртвым насеннем"[308]. Даравацъ даўгі – трэцяя просьба "Ойча наш". Прычым у малітве гаворыцца: наколькі мы можам дараваць іншым, настолькі Бог можа дараваць нам. Дабро нараджае дабро, а зло – зло. Аўтар сцвярджае, што Чарнобыль – вынік людской бяздумнасці і абыякавасці:

Дзякуй табе, родны мой народ, за дабрыню,
за міласэрнасць і спачуванне дзякуй!
За высакароднасць дзякуй.
Дзякуй за спагаду да чужой бяды.
Але нехта мог бы і падказаць табе: "Памажы і сваім нівам і птушкам, рэкам і дрэвам, хатам і людзям".
Дзецям сваім памажы!!! [309]

Хто вінаваты ў трагедыі? Каму дараваць? І ці можна такое дараваць? На гэтыя пытанні адказу ў аўтара няма.

Наступная просьба – "І не ўводзь нас, Божа, у спакусу"[310]. Спакусай з'яўляецца хлеб, малако, яблык, асвечаныя Чарнобылем: "Не заўважаюць прайдзісветы разгубленасці // народа, не чуюць яго роспачы. // Яны не бачаць – а каб і бачылі, дык што ім // да таго! – як нараўлянскія ці брагінскія // маці кормяць сваіх дзяцей. // Даюць дзеткам хлеб, а самі дрыжаць ад стра- // ху, даюць малачко, а ў саміх слёзы на // вачах, даюць яблык, а ў саміх аж да // спазмаў сціскаецца сэрца: колькі ж бэ- // раў ці кюры з'есць малое з тым хлебам, // малачком ці яблыкам?! // Яны даюць, а хочацца адабраць. // Яны ўгаворваюць есці, а хочацца закры- // чаць: "Не еш!" // Даюць ежу, а разумеюць, што даюць атруту"[311]. Ад хлеба, малака, яблыка, атручанага радыяцыяй, трэба цяпер устрымацца.

У сваёй апошняй просьбе – "І ўратуй нас ад нячысціка" аўтар кажа аб тым, што радыяцыйны бруд распаўсюджваецца па ўсёй краіне: "Кажуць,

[307]Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 358.
[308]Там жа, с. 364.
[309]Там жа, с. 366.
[310]Там жа, с. 369.
[311]Там жа, с. 369.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чарнобыль – гэта дзесяць такіх // бомбаў, што скінута на Хірасіму. // Кажуць, сем з іх упала на Беларусь"[312]. "Разумны чалавек заўсёды ратуе свой народ, // а дурны яго забівае. // Калі ёсць у нас хоць адзін хібакусі, трэба // каб у Беларусі былі ўсе хібакусі. // І мы робім усё, каб так яно і было. // Памагаем растоптваць па ўсёй рэспубліцы // радыяцыю"[313].

У трэцяй частцы прыгадваецца тройца, "але не святая, а клятая":

Нахабна спраўляюць свой жуд, раскашуюцца.
на тутэйшай зямлі два браты і сяст-
ра з нетутэйшымі імёнамі – Катаклізм,
Апакаліпсіс і Катастрофа – а за імі аж
скуголіць ад задавальнення іхняя мутна-
вокая спадкаемка з быццам бы тутэй-
шым імем – Бяда... [314]

---

У нашыя дні чалавечая цывілізацыя знаходзіцца паміж двума палюсамі. З аднаго боку, востра стаіць праблема эканамічнага развіцця, а з другога – татальная гібель усяго жывога ў выніку разбурэння навакольнага асяроддзя. Гаворка ідзе пра экалагічную катастрофу. Чарнобыльская бяда, як у фокусе, засведчыла трагедыйнасць стану навакольнага свету. Менавіта гэта і адлюстраваў у сваёй паэме Я. Сіпакоў.

Выкарыстанне шматлікіх сімвалаў, метафар і іншых мастацкіх сродкаў скіравана ў творы на раскрыццё чарнобыльскай тэмы. Анімалістычныя вобразы дапамагаюць убачыць усю катастрафічнасць жыцця чалавека і яго побыту.

Бо звычайная птушка з зоны – гэта ўжо рэактар.
Няма калючага дроту для крыл,
як няма агароджы для выпраменьвання:
радыёнукліды таксама, паганцы,
крылатыя.
А колькі такіх птушак разляцелася па ўсёй
Беларусі![315]

І "цялятка", і "кароўку" Святоху аўтар называе рэактарам, бо ўсё, што забруджана радыяцыяй, уяўляе небяспеку для чалавека: "Калі ёсць бяда, трэба, каб была і надзея. // У бабкі Параскі ёсць надзея. // Дачка прывезла з горада моднага мыцельні- // ку – індыйскага, ці што, парашку. // "А давай-тку я ім памыю цялятка", – пры- // думвае старая. // Тое цялятка, якое нарадзі-

---

[312]Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 364.
[313]Там жа, с. 372 – 373.
[314]Там жа, с. 375.
[315]Там жа, с. 362.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лася ад чыстай- // чыстай кароўкі Святохі. // Тое цялятка, якое падбрыквала на чыстай- // чыстай траўцы. // Тое цялятка, якое піло чыстуючыстую ва- // дзіцу. // І бабуля закасвае рукавы і доўга шаруе // дэфіцытным парашком такую цёпленькую // ад чыстага сонца поўсць цялятка. // Пыску яму шаруе, спінку яму шаруе, ножкі // яму шаруе, хвосцік яму шаруе... // Хоча змыць усе бэры і кюры, усе нукліды. // Хоча адмыць ад яго цэзій і стронцый, радые- // актыўны ёд і плутоній. // У згубленай між лясоў беларускай вёсачцы // індыйскім парашком мые бабка Параска // атамны рэактар – звычайнае беларус- // кае, з белаю зорачкай на лобе, цялятка. // А колькі такіх рэактараў бегае і лятае, хо- // дзіць і поўзае, цячэ і ездзіць па роднай // нашай Беларусі!"[316]

Паэт скарыстоўвае прыёмы сэнсавага кантрасту і парадоксу: "Карова – рэактар, сцежка – рэактар, і на- // ват кучка памёту ад бабкіпарасчынага // цялятка – зноў жа небяспечны рэактар. // І чалавек абпрамянены – рэактар [317].

Слова "рэактар" гучыць як прысуд, які ставіць крыж на існаванні ўсяго жывога. Меншыя браты чалавека ператварыліся ў тых, хто ўяўляе небяспеку для яго ж самога. Чарнобыльская трагедыя падштурхнула да пераасэнсавання традыцыйных вобразаў фауны. Вобраз пчалы ў народных павер'ях усходніх славян выступае сімвалам урадлівасці, памнажэння роду. Разам з тым пчала выступала зброяй бога Ярылы, які абуджае зямлю. У сіпакоўскім творы пчала – гэта бомба (такое мастацкае вызначэнне для класічнай літаратуры было непрымальным):

Была пчала – пацешная такая, выпацканая
ўся ў жоўты дзьмухаўцовы пылок, а
стала маленька-вялікаю атамнаю бомбаю[318].

Здаўна чалавек мае пэўную залежнасць ад хатніх жывёл. Так, карова была асновай уласнай гаспадаркі (гэтак, як і конь, хата, зямля). Нацыянальная кухня ўключае вялікую колькасць страў з выкарыстаннем малака. Сырадой – напой, які беларусы пілі і ў будні, і ў святы, – Чарнобыль зрабіў атрутай, і гэтую анамальнасць паэт перадае праз антыномію колераў:

Белае малако – чорнае. І бруднае: яно забруджана невідочнымі радыёнуклідамі"[319].

---

[316]Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 374 – 375.

[317]Там жа, с. 362.

[318]Там жа, с. 358.

[319]Там жа, с. 367.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Са старажытных часоў карова лічылася свяшчэннай. Я. Сіпакоў выкарыстоўвае гэты анімалістычны вобраз для таго, каб узмацніць трагедыйнае гучанне паэмы. У творы паказаны крах гаспадаркі, без якой немагчыма ўявіць нармальнае жыццё беларуса-працаўніка. Выкарыстоўваючы анімалістычныя вобразы, аўтар перадае трагізм існавання жывых істот. Так, карова, якая сведчыла пра дабрабыт у хаце, спакойнае і размеранае жыццё чалавека, у паэме паўстае як сімвал краху, заняпаду гаспадаркі, жыцця людзей, бо яе малако, мяса з'яўлецца атрутай:

Ціхамірна пасуцца каровы, скубуць сабе
траву, а разам з ёю і мірны наш атам
Траву бачаць, расу на ёй бачаць, а кюры –
не бачаць[320].

Гаспадарка прыйшла ў заняпад. Разам з тым абвастрылася і праблема экалагічнага выжывання. Пад пагрозай існавання апынуўся не толькі чалавек, але і прадстаўнікі фауны. "Чалавеку радыяцыя не да спадобы, а прыро- // дзе яна, здаецца, спадабалася", – не без горкай іроніі заўважае Я. Сіпакоў у паэме "Одзіум"[321]. Аўтар апісвае становішча, у якім апынуліся жывёлы падчас катастрофы. Іх мышцы і косці, кожная клетка, кожная кропля крыві насычана той самай каварнай, нябачнай і непрыкметнай атрутай, дзеянне якой у поўнай меры будзе адчувацца праз дзесяткі і сотні гадоў, праз мноства пакаленняў:

Ці можа мінулае забіваць будучыню?
Вось, к прыкладу, клетка – надзейная схова
для будучыні[322].

Іншыя прадстаўнікі фауны ў паэме Я. Сіпакова "Одзіум" – жывёлы-мутанты – тамсама ахвяры чалавечай бяздумнасці, бездухоўнасці, абыякавасці.

Паэт апавядае пра мутацыі сярод людзей. Але вядома, што развіццё чалавека і развіццё жывёл адбываецца па адной схеме. Ім абодвум даводзіцца прайсці праз Чарнобыль. І невядома, чым яшчэ адгукнецца ён у будучыні. Але, зразумела, што гэта слова ("Чарнобыль") застанецца ў людзей прадметам нянавісці і нараканняў – "одзіумам" – як казалі старажытныя рымляне. Невыпадкова, што паэма на чарнобыльскую тэму мае такую назву – "Одзіум".

Такім чынам, у паэме Я. Сіпакова "Одзіум" выяўляецца трагедыйная канцэпцыя існавання жывога свету пасля Чарнобыля. Вобразы фауны ў творах на чарнобыльскую тэму паўстаюць перад намі як сімвалы бяды, небяспекі,

[320] Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – С. 370.
[321] Там жа, с. 371.
[322] Там жа, с. 371.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

смерці; яны дапамагаюць паэту глыбей раскрыць разбурэнне адвечнага народнага побыту, катастрафізм нацыянальнага быцця.

Адно з найбольш значных дасягненняў мастацкай анімалістыкі – выяўленне ўнутранага свету жывёлы. Нярэдка анімалісты пры гэтым выкарыстоўваюць такі мастацкі прыём, як анімалістычны псіхалагізм, спрабуючы раскрыць думкі-адчуванні жывёлы. Адным з лепшых твораў такога кшталту з'яўляецца апавяданне "Львы" І. Пташнікава. Аблезлымі, падобнымі да экзатычных жывёл – львоў – паўстаюць перад намі сабакі ў чарнобыльскай вёсцы. Сабакі ўяўляюць небяспеку для чалавека ва ўмовах Чарнобыля: "І скаціна, і сабакі... зашкальваюць. А ваш брат рухавы, на адным месцы не сядзіць – разносіць усё гэта, – звяртаецца да Д'жукі шафёр, які ўратаваў яго ад адстрэлу. – Вось і спусцілі на вас загад. Усіх да аднаго ў зоне..."[323].

Усё, што адбываецца ў апавяданні, чытач успрымае і ацэньвае праз светабачанне сабакі Д'жукі. Гэта істота надзелена здольнасцю перажываць, разважаць, любіць: "Змораны, Д'ужкі сядзеў на пагорку ля шашы пад Стралічавам і глядзеў на поўдзень, дзе несціхана гулі ў небе самалёты і далёка, недзе ўжо на Украіне, падымалася і стаяла, як і ўсе гэтыя дні, густое бурае воблака. Ён не ведаў чаму, але яму раптам захацелася завыць, і ён, задзёршы галаву і гледзячы на рудое воблака, над якім кружылі дробныя чорныя мушкі – самалёты, зацягнуў, як воўк. Раз, другі, цягнуў доўга, як выліваючы з душы і страх, і бяду, і самому яму ад таго рабілася жудасна – уставала на хібе поўсць"[324]. А. Бельскі заўважае: "Д'жукі паўстае з твора як істота з адкрытай і відушчай душой, якой вельмі цяжка, балюча, трывожна"[325]. Пісьменнік дае магчымасць "самавыявіцца" гэтаму герою апавядання, ад якога мы даведваемся пра яго гаспадароў ("Джукі глядзеў праз акно ў хату, дзе былі параскіданы на падлозе лыжкі і дзіцячыя чырвоныя лялькі, і чакаў. Вот выйдзе на ганак малады гаспадар, высокі, стройны, чорна-кучаравы, у чорных штанах і белай рубашцы"[326]), пра таксіста з Кіева, які перахрысціў Жука ў Д'жукі ("Высокі, вышэй маладога гаспадара, ценкі, цяней за гаспадара, з доўгімі, аж на плечы, кучаравымі чорнымі валасамі, даўжэйшымі, чымся ў маладога гаспадара, з чорнымі вусамі, большымі, чым у гаспадара, хадзіў ён заўсёды ў белых штанах, чырвонай рубашцы, пад чорным, як у яго, Д'жукі, хвост, доўгім гальштукам і ў чорных, такіх бліскучых туфлях, што на іх не было як глядзець – слеплі сабачыя вочы"[327]), пра чалавека "ў клятчатай рубашцы з закасанымі рукавамі, з белай шапачкай на галаве і з ружжом у руках"[328], які фактычна ўратаваў Д'жукі, вывезшы яго ў кабіне самазвала за межы радыеактыўнай "зоны".

---

[323]Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 458.

[324]Там жа, с. 449.

[325]Бельскі, А. Сучасная літаратура Беларусі: дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі. – Мінск: ТАА "Аверсэв", 2000. – С. 81.

[326]Пташнікаў, І. Збор твораў: у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 1: Раман; Апавяданні. – С. 446.

[327]Там жа, с. 446 – 447.

[328]Там жа, с. 457.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Гербы населеных пунктаў Гродзенскай вобласці



г.п. Вялікая Бераставіца, Бераставіцкі раён



г. Воўкавыск, Ваўкавыскі раён



г.п. Воранава, Воранаўскі раён



г. Гродна



г. Ліда



г. Мір Карэліцкага раёна



г.п. Краснасельскі Ваўкавыскага раёна



г. Слонім



г. Смаргонь, Смаргонскі раён

Падобны падыход да асэнсавання праблемы ўзаемаадносін чалавека і прыроды прадэманстраваны ў аповесці рускага пісьменніка Г. Траяпольскага "Белы Бім Чорнае вуха". Адносіны людзей да сабакі Біма – паказчык людской добрасумленнасці. Г. Траяпольскі падводзіць чытача да высновы, што чалавек, які добра адносіцца да жывёлы, не можа быць злым, прырода выхоўвае чалавека.

У абодвух творах вобраз сабакі дапамагае творцам паказаць сацыяльныя праблемы сучаснага грамадства. Недастатковасць "чалавечага элемента" і прыводзіць да драматычнага, сумнага выніку ў вырашэнні дылемы "чалавек – прырода". Людзі ў творы І. Пташнікава знаходзяцца на другім плане, яны ствараюць агульны фон дзеяння, хаця менавіта іх пакуты, іх трагедыя, нягледзячы на спецыфічную форму мастацкага паказу рэчаіснасці, выяўлены не менш выразна. Баліць жывой істоце – значыць баліць і чалавеку. Галоўная ідэя твора – "жывому жыць!" Падобны падыход да асэнсавання Чарнобыля лёг у аснову твораў М. Мятліцкага (вершы "Жураўлі", "Пчала", "Ластаўкі"), С. Законнікава (верш "Тыя коні не пасвяцца ў травах мурожных") і шматлікіх іншых.

Шчэбет ластаўкі гучыць ва унісон ціканню дазіметра ў вершы М. Мятліцкага "Ластаўкі". Аўтар адзначае, што птушкі працягваюць жыць у пакінутай вёсцы, яны, як заўсёды, баяцца драпежнікаў, але не падазраюць, што іх сапраўдны вораг – радыяцыя:

Чорную рызу
Кідае з вымот,
Быццам паблізу
З'явіўся кот.
Толькі ці тая
Пыса-бяда
Блізка ступае
Каля гнязда?[329]

Паказ трагічнага становішча прадстаўнікоў жывёльнага свету ў зоне радыяцыйнага забруджання пабудаваны на кантрасце, які можна прасачыць амаль ў кожнай страфе: "цененькі шчэбет" – "дазіметра піск", "вёска пустая" – "шумны віхор", "ціўканне ваша" – "у сенцах пустых"[330]. На гэтым жа прыёме пабудаваны і верш "Матыль". Гаворачы пра зямлю, забруджаную радыяцый, паэт выкарыстоўвае характарыстычныя эпітэты "здзічэлая", "бязлюдная".

Метафарай "вястун вясны жывой" аўтар падкрэслівае прагу да жыцця матыля, у вобразе якога паэт прадуцыруе ўсё жывое:

Адкуль сюды ён заляцеў,
Вястун вясны жывой,
Якая

[329]Мятліцкі, М. Бабчын: Кніга жыцця / М. Мятліцкі. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С. 163.
[330]Там жа, с. 163.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У кронах пладаносных дрэў
І сёння завязі чакае? [331]

Нярэдка, калі гаворка ідзе пра выбух на Чарнобыльскай атамнай станцыі і яго наступствы, у свядомасці сучаснікаў гэта трагедыя ўспрымаецца як здзейсненае адно з біблейскіх прароцтваў. Так, у Адкрыцці апостала Іаана Багаслова ёсць наступныя радкі: "Третий Ангел вострубил, и упала с неба большая звезда, горящая подобно светильнику и пала на третью часть рек и на источники вод. Имя сей звезде "полынь"; и третья часть вод сделалась полынью, и многие из людей умерли от вод, потому что они стали горьки[332]. У паэме С. Законнікава "Чорная быль" гэта цытата з Бібліі ў трансфармаванай форме ўплецена ў канву твора:

Пад нос бабуля Біблію чытае:
"І трэй-ці Ан-гіл за-тру-біў,
і зва-лі-ла-ся зь не-ба вя-лі-ка-я гвяз-да,
га-ру-чы, як лян-па,
і па-ла на трэй-цю-ю часць рэ-каў
а на жа-ро-лы во-даў.
А і-мя та-е гвяз-ды Па-лын;
і трэй-ця-я часць во-даў ста-ла па-лы-ном,
і шмат із лю-дзёў па-мер-ла з во-даў,
бо я-ны ста-лі гар-кі-я"[333].

Дарэчы, цытаванне Бібліі – нярэдкая з'ява ў творах беларускіх аўтараў на чарнобыльскую тэму. У сувязі з гэтым Д. Бугаёў даводзіць: "У творах жа пра Чарнобыль біблейскія матывы і стылістыка наогул здаюцца вельмі арганічнымі і, бадай, непазбежнымі. Асабліва часта самыя розныя пісьменнікі звяртаюцца да евангельскага прароцтва пра зорку Палын <...>. Гэтае прароцтва цяпер непасрэдна звязваецца з чарнобыльскай катастрофай – з-за яе глабальнасці і з-за таго, што адзін з відаў палыну завецца чарнобылем"[334].

У паэме С. Законнікава падзеі тых страшных дзён пададзены ў храналагічным парадку: выбух на станцыі і як вынік – чорныя хмары над беларускай краінай; мірны парад, дзе ўдзельнікі – дзеці, якія нічога не ведаюць пра бяду, з-за якой нельга выходзіць на паветра; жудасная навіна становіцца аб'ектам абмеркавання вучоных, перасяленне з забруджаных мясцін. Гэта бяда стала пагрозай не толькі для чалавека, але і для ўсяго жывога, што апынулася на тэрыторыі, забруджанай радыяцыяй.

[331] Мятліцкі, М. Бабчын: кніга жыцця / М. Мятліцкі. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С. 160.
[332] Библия. Кн. Свящ. Писания Ветхого и Нового Завета. – М.: Междунар. издат. центр православ. лит., 1995. – С. 132.
[333] Законнікаў, С. Лістам дарога запала...: выбранае. / С. Законнікаў – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 169.
[334] Бугаёў, Д. Спавядальнае слова: літаратурная крытыка, успаміны / Д. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – С. 224.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

С. Законнікаў рэалістычна апісвае ваўка, які ўцякае з зоны небяспекі, у паэме "Чорная быль". На гэты раз драпежнік выклікае ў чытача пачуццё шкадавання, хоць у іншых творах гэты звер наводзіў на людзей жах:

Так ляжаў ён, знясілены,
болей нічога –
Ані плоці жывой, ані свежай крыві.
Так ляжаў,
распластаны натугаю нейчай,
Што сціскала,
душыла люцей і люцей.
Не звярынай слязой,
а святой, чалавечай
Плакаў той, кім палохаюць людзі дзяцей[335].

Смерць ваўка, якая апісана ў паэме "Чорная быль", таксама недарэчная, наступіла па віне чалавека: звер загінуў пад коламі "КрАЗа". Вадзіцель не захацеў мець нават скуру з гэтага ваўка:

Ды ўбачыў ён плешы,
На якіх запяклася счарнелая кроў.
"Не, з такое здыхляці мне шкуры не трэба..."
Злосна дзверцамі ляснуў і рушыў у шлях[336].

У паэме аўтар праз лёс жывой істоты раскрывае трагізм чарнобыльскай бяды. Ён паказвае, як адбываецца дэградацыя знешняга асяроддзя.

Жывёлы як рэаліі прыроды па-мастацку ўвасоблены ў паэме "Чорная быль" С. Законнікава, апавяданнях "Сенакос у канцы красавіка" В. Казько, "Эвакуацыя" Н. Рыбік, вершы "Пчала" М. Мятліцкага і інш. У гэтых творах закранаецца таксама праблема чалавечых узаемаадносін.

Па віне чалавека жывёлы апынуліся ў драматычным становішчы. Відавочна, звяры і птушкі выклікаюць спачуванне. У апавяданні Н. Рыбік "Эвакуацыя" ахвярамі чарнобыльскай бяды з'яўляюцца каровы. Паводле рашэння ўлады, гэтых хатніх жывёл, як адных з разносчыкаў радыяцыі, трэба знішчаць. Гаспадары прыводзяць сваіх "рагуль" да машыны. Пачуццё жалю выклікаюць жывыя істоты ў чытача: "І сапраўды: каровы, што яшчэ стаялі на прывязі і чакалі сваёй чаргі, суцішыліся, і з вачэй іх ручаём цяклі слёзы, пакідаючы на мордах мокрыя сцежачкі..."[337].

[335]Законнікаў, С. Лістам дарога запала...: выбранае. / С. Законнікаў – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 184.

[336]Там жа, 185.

[337]Там жа, с. 14.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сцэны развітання вяскоўцаў са свойскімі жывёламі напісаны ў мінорных танах: "Затаптаўшы акурак, Пятро прысеў ля сабакі:

– Рэкс, я цябе прашу – ідзі назад. Хату трэба вартаваць. Ідзі. Мы хутка вернемся.

Сабака ўткнуў морду ў рукі гаспадара і ціхенька заскуголіў. Пятро ўстаў, адвярнуўся, каб не бачыць гэтых умольных вачэй:

– Рэкс, я каму сказаў? Дадому!

Сабака лёг на зямлю, паклаў морду на лапы і працягваў жаласна скуголіць"[338].

Чарнобыльская трагедыя настолькі нечакана ўварвалася ў лёсы, што героі не раз параўноваюць яе з надыходам вайны[339].



Мал. 26. Карова, якая ляжыць. 1883. В. Ван Гог

Многім жыхарам вёскі Уласы проста не верыцца ў непазбежнасць развітання са сваёй малой радзімай. Так, Вольга падаіла карову і паставіла гладыш з малаком у склеп ("Ат, хай яго, – падумала разгублена, – мо хто-небудзь вып'е". І пастаралася найхутчэй адаганаць думкі, што піць салодкае, смачнае Зорчына малако больш не будзе каму"[340]); яна насыпала, не шкадуючы, курам проса ("Дзён на колькі хопіць. А там, можа, і вернемся. Казалі ж..." – падумала без асаблівай надзеі"[341]); жанчына не спяшаецца збірацца ў дарогу, бо ёй не верыцца, што свой дом яна пакідае назаўсёды.

[338]Рыбік, Н. Права на адсяленне: апавяданні / Н. Рыбік. – Мінск: Маладосць, 2001. – С19.
[339]Там жа, с. 14, 18, 23.
[340]Там жа, с. 20.
[341]Там жа, с. 21.

Электронный архив ... А. Кулешова

Спеў пеўня ў пакінутай людзьмі вёсцы гучыць для Вольгі, якая адной з апошніх пакідала сваю хату, як гімн: "Раптам гарласта, задзіраста заспяваў певень, яму адгукнуўся суседскі, яшчэ адзін... Вольга апамяталася. Як музыку, слухала яна гэтае шматгалосае кукарэканне і лавіла ротам паветра, бы тапелец, які, страціўшы ўжо надзею, раптам вынырнуў і адчуў пад нагамі цвёрдую зямлю"[342].

Разам з тым, звяры, адзічэлыя ў зоне, забруджанай радыяцыяй, нібы выносяць прысуд чалавеку – яны могуць яго знішчыць. Такая сітуацыя паказана ў апавяданні "Бляха" А. Федарэнкі. Спрадвечныя сябры чалавека – сабакі – паўстаюць некіруемымі і жорсткімі. Гэтыя істоты наводзяць жах не толькі на іншых жывёл (загрызлі сабаку Туза), а і на людзей. Як вынік здзічэласці – трагічны фінал апавядання, калі ад сабачых зубоў загінуў галоўны герой твора: "Ён паспеў яшчэ адскочыць, але паслізнуўся, упаў ракам, махнуў упустую нажом... паспеў нават падумаць "Ды ці не сабакі?!!" – а яго ўжо грызлі за ногі і рвалі на плячах, падступаючыся да твару і да горла, лёгкі балонь курткі... Ён спрабаваў яшчэ адмахвацца, уцякаць, хоць бы неяк дапаўзці да дзвярэй калідора, крычаў, – але крыкі гэтыя патаналі, упляталіся ў дзікае яўкатанне, у звар'яцелы віскат узбуджанай, распыталай крыві гайні, якая быццам на паляванні, аблукаўшы з усіх бакоў ненавіснага звера і не чакаючы знаку паляўнічага, наскоквала, і рвала, і грызла, і старалася ўпіцца ў самае горла..."[343]. Фінал апавядання трагічны і ўспрымаецца чытачом як папярэджанне: зло заўсёды нараджае зло. Так, злодзей выкраў мяса, але з накрадзеным яго насціглі здзічэлыя сабакі і траўмавалі. Бляха пайшоў да фельчара, але таксама трапіў на сабак, якія яго загрызлі. У творы чарада шкодных дзеянняў паўстае ў сваёй узаемазалежнасці: па віне чалавека адбылася чарнобыльская трагедыя, перасяляючыся з забруджаных месцаў, людзі пакінулі хатніх жывёл, якія адзічэлі і сталі небяспечнымі для чалавека.

Такім чынам, мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя мае экалагічную і гуманістычную скіраванасць. Радыяцыйны Чарнобыль пакінуў глыбокі след у чалавечай душы і свядомасці, пра што яскрава сведчаць творы Я. Сіпакова, С. Законнікава, І. Пташнікава і інш. Аналізуючы іх, можна адзначыць наступнае:

– сучасныя аўтары пасля чарнобыльскай катастрофы ў зусім іншым святле паказваюць анімалістычныя вобразы, з драматызмам выяўляюць прагу жывёл да жыцця, гавораць пра трагічную наканаванасць няўмольнага лёсу;

– вобразы фауны ў мастацкіх творах выконваюць важную ідэйна-эстэтычную ролю – падкрэсліваюць трагічнасць сітуацыі, у якой апынулася ўсё жывое ў выніку чарнобыльскай аварыі;

– беларускія пісьменнікі паказалі ўсю небяспеку экалагічнага Чарнобыля, яго разбуральныя наступствы для чалавека і прыроды.

---

[342]Рыбік, Н. Права на адсяленне: апавяданні / Н. Рыбік. – Мінск: Маладосць, 2001. – С. 20.

[343]Прайсці праз зону: Проза, паэзія, публіцыстыка / уклад. І. Бутовіч; прадм. І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С. 71.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Гербы населеных пунктаў Мінскай вобласці



г. Слуцк



г. Нясвіж



г. Любань



г. Чэрвень



г.п. Івянец Валожынскага раёна

# Гербы населеных пунктаў Магілёўскай вобласці



г. Мсціслаў, Мсціслаўскі раён



г. Клімавічы, Клімавіцкі раён

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзенае даследаванне станаўлення і развіцця мастацкай анімалістыкі ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1. Мастацкая анімалістыка – разгалінаваная і своеасаблівая сістэма вобразаў і матываў фауны, якая грунтуецца на пэўных эстэтычных спосабах і прынцыпах функцыянавання. Анімалістыка ўключае ў сябе і *падсістэму* – *анімалізм як спосаб* мастацкага асэнсавання рэчаіснасці.

Анімалістычныя вобразы адыгрываюць важную сэнсаўтваральную ролю ў ідэйна-мастацкай сістэме твора, яго канцэпцыі і філасофскім змесце. Зварот да адлюстравання жывёльнага свету дапамагае пісьменнікам тлумачыць розныя з'явы і ў чалавечым жыцці, дае магчымасць выяўляць маральна-этычныя праблемы грамадства. Мастацкае раскрыццё лёсу жывых істот у творах экалагічнай тэматыкі адлюстроўвае драматызм і скіроўвае на ўсведамленне трагедыйнасці сітуацыі, у якой апынуліся чалавек і прырода ў XX стагоддзі.

2. Анімалістычныя вобразы і матывы ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя маюць архетыпічныя вытокі. Выкарыстанне міфа пры стварэнні мастацкіх вобразаў прадстаўнікоў фауны мае два выяўленчыя варыянты: 1) прамое, непасрэднае выкарыстанне анімалістычнага вобраза ў традыцыйным міфапаэтычным кантэксце; 2) выкарыстанне анімалістычнага вобраза ці матыву, які функцыянуе як архетып, калі мастак слова надае вобразу-матыву і матыву пэўную сімволіку (яна фарміруецца ў мастацкім мысленні пісьменніка як вынік калектыўнага вопыту папярэдняга пакалення).

Прыклады матываванага выкарыстання архетыпічных значных форм культуры можна знайсці ў творах беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя (вершы "Жаўранак – звонкая ніць...", "Крумкачы", "Як размаўляюць звяры і птушкі", "Белавежскі алень" У. Караткевіча, аповесць "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько, апавяданне "Львы" І. Пташнікава, паэма "Одзіум" Я. Сіпакова, апавяданне "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі, вершы "Птах", "Танец з вужакамі" А. Разанава, аповесць "Цкаванне вялікага звера", раман "Літоўскі воўк" А. Наварыча і інш.).

Мастацкая анімалістыка другой паловы XX стагоддзя вызначаецца разнастайнасцю і шматаспектнасцю адлюстравання. Выяўленне гісторыка-культурнай семантыкі архетыпаў дазваляе вытлумачыць функцыянальнасць анімалістычных вобразаў у літаратуры. Вобразы каня, каровы, птушак (бусел, жораў, жаваранак, голуб і інш.), ваўка з'яўляюцца характэрнымі для беларускай мастацкай свядомасці.

3. Беларуская мастацкая анімалістыка мае глыбокія карані. Яна даволі шырока прадстаўлена як у фальклоры (напрыклад, казках), так і ў літаратурных творах старажытнага перыяду ("Слова пра паход Ігаравы"), XVIII стагоддзя (творы Д. Рудніцкага і інш.). Пачынаючы з XIX стагоддзя, адбываецца больш дынамічнае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

станаўленне беларускай літаратурнай анімалістыкі, якая развівалася ў чатырох кірунках. – А. *Рэалістычны*, у творах якога адлюстраваны рэальныя ўзаемаадносіны чалавека з прыродай. Найбольш значнымі з'яўляюцца творы на паляўнічую тэму "Песня пра зубра" М. Гусоўскага, "Паляўнічыя акварэлькі" Я. Лучыны. Акрамя таго, у беларускай літаратуры часта выкарыстоўваюцца вобразы свойскіх жывёл. Пісьменнікі рэалістычна адлюстроўваюць іх у межах вясковага пейзажу (вобраз каня ў рамане "Бацькаўшчына", п'есе "Бацькаўшчына", апавяданнях "На беразе", "Дзень", "Максімка" К. Чорнага). – Б. *Алегарычны*, для яго характэрны анімалістычныя вобразы іншасказальнага характару, якія вельмі праўдападобныя, скапіраваныя ў многім з чалавечых паводзінаў і якія маюць характар мастацкага ўвасаблення. Вобразы жывёл у сваёй алегарычнай форме знайшлі выкарыстанне ў беларускай байцы: "Ястраб, лісіца і певень" (1913), "Груган і салавей" (1914) Я. Купалы, "Варона і чыж" (1915) М. Багдановіча. Алегарычныя вобразы жывёл прысутнічаюць у апавяданнях Я. Коласа (зборнік "Казкі жыцця"), Ядвігіна Ш. ("Павук", "Вяселле", "Сініца") і інш. – В. *Фантастычны* кірунак, у межах якога адлюстраваны ў асноўным анімалістычныя вобразы, мае міфапаэтычныя вытокі (вобраз ваўкалака ў зборніку "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" Я. Баршчэўскага, вершах "Люлі, люлі, мужычок!", "Хохлік", "Забытая карчма" Я. Купалы і інш.). – Г. *Псіхалагічны кірунак*, які склаўся ў беларускай класічнай літаратуры і пачаў больш інтэнсіўна развівацца ў другой палове XX стагоддзя. Псіхалагізаваныя анімалістычныя вобразы набылі шматгранную распрацоўку ў творах, дзе ўздымаюцца сацыяльныя праблемы (аповесці "Ваўчыца з Чортавай ямы" Б. Сачанкі, "Луп" Ю. Станкевіча і інш.). У 80 – 90-х гадах анімалістычны псіхалагізм выяўляецца ў творах з экалагічным зместам (апавяданне "Львы" І. Пташнікава, паэма "Чорная быль" С. Законнікава і інш.).

4. Літаратурная анімалістыка другой паловы XX стагоддзя прадстаўлена багаццем вобразаў. *Пісьменнікі ў* сваіх творах звяртаюцца як да паказу рэальна існуючых жывёл, так і фантастычных істот. Творцы пашыраюць арсенал мастацкіх сродкаў пры адлюстраванні анімалістычных вобразаў, актыўна выкарыстоўваецца такі прыём паказу жывёльнага свету, як анімалістычны псіхалагізм.

У беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя мэтазгодна вылучыць пяць тыпаў *анімалістычных вобразаў*. – А. *Жывёлы як рэаліі прыроды*. Па-першае, анімалістычны вобраз ці некалькі вобразаў выступаюць як элементы пейзажу (аповесць "Чазенія" У. Караткевіча і інш.). Па-другое, прадстаўнікі жывёльнага свету з'яўляюцца неад'емнай часткай побыту беларускага селяніна (У. Караткевіч, І. Пташнікаў, В. Быкаў, А. Жук і інш.). Па-трэцяе, анімалістычныя вобразы прысутнічаюць у творах на паляўнічую тэму (апавяданне "Дзік-бадзяга" Б. Сачанкі і інш.). – Б. *Анімалістычныя вобразы-сімвалы*, якія выкарыстоўваюцца як у паэтычных (лірыка У. Караткевіча, Я. Сіпакова і інш.), так і ў празаічных (раман "Птушкі і гнёзды" Я. Брыля і нш.) і драматургічных (п'еса "Сабака з зала-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тым зубам" У. Сауліча, п'еса-маналог В. Ткачова "Добрае стаўленне да сабакі" і інш.) творах. – В. *Анімалістычныя вобразы-алегорыі.* Традыцыйна даволі шырока яны прадстаўлены ў байках (творы К. Крапівы, Э. Валасевіча, У. Корбана і інш.), празаічных (аповесць "Прыгоды аднаго губашлёпа" П. Васючэнкі і А.Вырвіча, "Кошка і мышка", "Пагібель зайца", "Парсюк" В. Быкава і інш.) і драматургічных ("Страшнік Гам" П. Васючэнкі інш.) творах. Вобразы прадстаўнікоў фауны як у паэтычных, празаічных, так і драматургічных творах з'яўляюцца алегорыямі на характары людзей, сацыяльныя абставіны, дапамагаюць выкрываць чалавечыя заганы і выяўляць "балявыя кропкі" грамадства. – Г. *Фантастычныя вобразы.* Пісьменнікі выкарыстоўваюць фантастычныя вобразы з міфалогіі (напрыклад, вобраз ваўкалака ў апавяданні "Ваўкалакі" А.Кажадуба), ствараюць фантастычныя сітуацыі, у якіх дзейнічаюць людзі і жывёлы (аповесць "Цкаванне вялікага звера" А. Наварыча"). У свядомасці пісьменнікаў узнікаюць новыя, невядомыя дасюль вобразы прадстаўнікоў фауны (паэма "Одзіум" Я. Сіпакова). – Д. *Псіхалагізаваныя анімалістычныя вобразы.* Да гэтага тыпу адносяцца вобразы, якім уласцівыя якасці людзей: здольнасць гаварыць, думаць, смяяцца і інш. Часта яны маюць алегарычны сэнс: у іх лёсах нярэдка лазнаюцца чалавечыя лёсы (апавяданне "Пагоня" І. Пташнікава).

Ствараючы рэалістычныя, сатырычныя, фантастычныя, псіхалагізаваныя анімалістычныя вобразы, беларускія пісьменнікі другой паловы ХХ стагоддзя вырашаюць важную мастацкую задачу: імкнуцца спазнаць сутнасць чалавечага, раскрыць той стан, у якім знаходзіцца жывая прырода.

5. Анімалістычныя вобразы маюць вельмі істотнае значэнне ў мастацка-вобразнай сістэме твора, яго канцэпцыі і філасофскім змесце.

Беларускія пісьменнікі актыўна падключаны да асэнсавання вострасучаснай праблемы ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды. Гэтая праблема адлюстроўваецца ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя ў некалькіх аспектах: прырода як прадмет любові і шанавання; неабходнасць аховы прыроды; адносіны чалавека да прыроды – паказчык людской добрасумленнасці; прырода як філасофія духоўнага быцця асобы. У творах з такім зместам М. Танка, П. Панчанкі, А. Пысіна, У. Караткевіча, І. Пташнікава акурат і выкарыстоўваюцца анімалістычныя вобразы, якія дапамагаюць тлумачыць розныя з'явы прыроды, асэнсоўваць чалавеку сябе самога, сваю маральную сутнасць, глыбей разумець духоўныя працэсы ў грамадстве.

Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя мае экалагічную і гуманістычную скіраванасць. Для яе характэрны завастрэнне хвалюючых пытанняў чалавечай душы, узрастанне экалагічнай трывогі, разважанні пра суадносіны антрапацэнтрызму і прыродацэнтрызму, пафас абароны ўсяго жывога на зямлі.

Адной з асаблівасцей, характэрных тэндэнцый у беларускай літаратуры з'яўляецца маральна-філасофскае паглыбленне чарнобыльскай тэмы. Пісьменнікі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адлюстравалі ўсю небяспеку радыяцыйнага Чарнобыля, яго разбуральныя наступствы для чалавека і прыроды. Раскрыццю трагічнага стану і адчування жывёл ва ўмовах радыяцыі садзейнічаюць выяўленчыя прыёмы і сродкі: анімалістычны псіхалагізм, гіпербалізацыя, біблейская сімволіка, характарыстычныя эпітэты, антытэза, парадаксальныя па сваёй змястоўнай напоўненасці метафары, кантрастнасць колераў і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Аверинцев, С. "Аналитическая психология" К.Г Юнга и закономерности творческой фантазии / С. Аверинцев // Вопр. лит. – 1970. – № 3. – С. 113 – 143.

2. Агапкина, Т. Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. / Т. Агапкина. – М.: Индрик, 2002. – 816 с.

3. Адамовіч, Г. Разважанні пра сучаную формулу чалавека: Жывёліна, імя якой – чалавек, ці чалавек, імя якому – жывёліна? / Г. Адамовіч // Родн. слова. – 2005. – № 7. – С. 3 – 5.

4. Адамушко, В.И. Гербы и флаги Беларуси / В.И. Адамушко, М.М. Елинская. – Минск: Беларусь, 2006. – 256 с.

5. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі: тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак з архіваў, кафедр, збораў, рэд. выд. XIX – XX стст. / А. Аксамітаў. – Мінск: Бел. навука, 2000. – 320 с.

6. Акулін, Э Крыла анёла: вершы / Э. Акулін – Мінск: ПаліБіг, 2000. – 136 с.

7. Андраюк, С. Чалавек на зямлі: нарыс творчасці І. Пташнікава / С. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 254 с.

8. Андраюк, С. На пераломе. Беларуская проза 1986 – 2001 гадоў / С. Андраюк // Полымя. – 2003. – № 1. – С. 175 – 176.

9. Андреев, А. Литература и архетип / А. Андреев // Міфалогія – фальклор – літаратура: праблемы паэтыкі: зборнік навуковых прац. Выпуск 3. – Мінск: РІВШ, 2004. – С. 3–10.

10. Андреев, Ю.А. Человек, природа, общество в современной прозе / Ю.А. Андреев – Л.: Знание. 1981. – 36 с.

11. Андрэй Смаляк. Жывапіс. – Мінск: Мінская фабрыка каляровага друку, 2006. – 256 с.

12. Анталогія беларускай паэзіі: у 3 т. / рэдкал.: Р. Барадулін і інш. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 1: Вершы і паэмы. – 622 с.

13. Арочка, М.М. На парозе 90-х: літаратур. агляд / М.М. Арочка, П.К. Дзюбайла, С.С. Лаўшук. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 208 с.

14. Арлоў, У. Фаўна сноў: вершы / У. Арлоў. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 95 с.

15. Афанасьев, А.Н. Древо жизни: избр. ст. / А.Н. Афанасьев; подг. текста и коммент. Ю.М. Медведева. – М.: Современник, 1982. – 464 с.

16. Афанасьев, А.Н. Происхождение мифа: статьи по фольклору, этнографии и мифологии / А.Н. Афанасьев; сост., подгот. текста, статья, коммент. А.Л. Топоркова. – М.: Индрик, 1996. – 630 с.

17. Афанасьев, И.Н. Кто восходит на Голгофу?: антивоен. идея в творчестве В. Быкова / И.Н. Афанасьев. – Минск: Маст. літ, 1993. – 160 с.

18. Ахрыменка, А. Беларуская літаратура і фальклор / А. Ахрыменка. – Мінск: Выд-ва м-ва вышэйш., сярэд. спец. і праф. адукацыі БССР, 1962. – 142 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

19. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч; пад рэд. А.А. Лойкі – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 752 с.

20. Байковский, К.Ю. Природа в житиях святых русской Фиваиды / К.Ю. Байковский // Русское Средневековье. 200-2001 годы. – М., 2002. – С. 23 – 39.

21. Балады: у 2 кн. / уклад. Л.М. Салавей, рэд. К.Л. Калашнікаў, В.І. Ялатаў – Мінск: Навука і тэхніка, 1977 - 1978. – 2 кн.

22. Барабаншчыкава, Т.Л. Бусел у творах Віктара Казько / Т.Л. Барабаншчыкава // Пятыя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу: матэрыялы навук. канф.: у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т; рэд. кал.: А.А. Станкевіч (адк. сакр.) [і інш.]. – Гомель, 2001. – Ч. 2: Фальклор. Мастацкая літаратура. Методыка выкладання літаратуры. – С. 16 – 21.

23. Барабаншчыкава, Т.Л. "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" Віктара Казько і "Сто год адзіноты" Габрыеля Гарсіа Маркеса (спроба тыпалагічнага параўнання) / Т.Л. Барабаншчыкава // Terra alba I. Праблема беларускага літаратуразнаўства: да 85-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова / рэд. С.І. Даніленка і Я.Я. Іваноў; рэдкал.: Я.І. Клімуць (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Маладзёж. навук. тав-ва, 2000. – С. 302 – 312.

24. Барабаншчыкава, Т.Л. Праблема міфалагізму ў сучаснай беларускай літаратуры / Т.Л. Барабаншчыкава // Родн. слова. – 2001. – № 8. – С. 11 – 12.

25. Бараг, Л.Г. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак: сіст. паказ. / рэд. Г.У. Саламевіч; Л.Г. Бараг. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 246 с.

26. Бараноўская, Л. Анімалістычная тэма ў беларускай літаратуры / Л. Бараноўская // Беларус. мова і літ. – 2002. – № 1. – С. 59 – 64.

27. Бараноўская, Л.Г. Асаблівасці функцыянавання арніталагічных вобразаў у паэтычных і празаічных творах Я. Коласа / Л.Г. Бараноўская // Материалы научно-практической конференции преподавателей и сотрудников по итогам научно-исследовательской работы в 2007 г., 7-8 февраля 2008 года / Могилевс. госуд. ун-т им. А.А. Кулешова; под ред. А.В. Иванова. – Могилев, 2008. – С. 174 – 177.

28. Бараноўская, Л.Г. Асаблівасці функцыянавання фантастычных анімалістычных вобразаў у беларускай літаратуры XX ст. / Л.Г. Бараноўская // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук. канф., 26 – 27 красав. 2006 г. / Магілёўс. дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова – Магілёў, 2006. – С. 22 – 26.

29. Бараноўская, Л.Г. Архетып бусла ў творчасці В. Казько і А. Кажадуба / Л.Г. Бараноўская // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук. канф., 11 – 12 снеж. 2003 г.: тэз. дакл.: у 2 ч. / Магілёўс. дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова; рэдкал.: М.І. Вішнеўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў, 2004. – Ч. 2. – С. 216 – 218.

30. Бараноўская, Л.Г. Архетыпічная аснова і ідэйна-мастацкая трактоўка анімалістычных вобразаў у беларускай літаратуры XX стагоддзя / Л.Г. Бараноўская // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та. – 2004. – № 4. – С. 98 – 101.

31. Бараноўская, Л.Г. Беларуская мастацкая анімалістыка: асаблівасці станаўлення і развіцця / Л.Г. Бараноўская // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А.А. Куляшова. – 2007. – № 1. – С. 133 – 139.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

32. Бараноўская, Л.Г. Васіль Зуёнак / Л.Г.Бараноўская // Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / А.М.Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. – Мінск: Выш. шк., 2007. – С. 606 – 627.

33. Бараноўская, Л. Вобраз ваўка ў вершах Я. Сіпакова / Л.Г Бараноўская // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук. канф. "Творчасць А. Куляшова и адукац.-асветніц. праблемы сучаснасці", 6 – 7 лютага 2002 г. / Магілёўс. дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова; рэдкал.: М.І. Мушынскі. (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў, 2002. – С. 22 – 24.

34. Бараноўская, Л.Г. Вызначэнне тэрміна "мастацкая анімалістыка" / Л.Г. Бараноўская // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2005. – № 1. – С. 101 – 105.

35. Бараноўская, Л.Г. Выхаванне пачуцця эмпатыі ў дзяцей пры вывучэнні мастацкай анімалістыкі ў VI класе (на прыкладзе апавядання "Алені" І. Пташнікава) / Л.Г. Бараноўская // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе: новыя падыходы і тэндэнцыі: зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 16 – 19.

36. Бараноўская, Л. З любоўю і спагадай!: Ідэйна-мастацкая трактоўка вобразаў фауны ў паэзіі Янкі Сіпакова / Л.Г. Бараноўская // Родн. слова. – 2003. – № 6. – С. 21 – 23.

37. Бараноўская, Л.Г. Іван Навуменка – пісьменнік-анімаліст / Л.Г. Бараноўская // Творчая асоба І. Навуменкі і праблемы беларускай філалогіі і адукацыі: зб. навук. арт. / рэдкал.: Т.І. Шамякіна (гал. рэд.) [і інш.]; уклад. А.І. Бельскі. – Мінск: РІВШ, 2006. – С. 114 – 118.

38. Бараноўская, Л. Мастацкі анімалізм у прозе Кузьмы Чорнага / Л.Г. Бараноўская // Да 100-годдзя Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі, Кузьмы Чорнага: зб. навук. арт. / рэдкал.: У.В. Рагойша (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2001. – С. 66 – 69.

39. Бараноўская, Л. Мастацкая анімалістыка І. Пташнікава ў школьным вывучэнні / Л. Бараноўская // Традиционное и новаторское в преподавании литературы в школе и вузе: материалы Междунар. науч. конф., 20 – 21 нояб. 2001 г.: в 2 ч. / Брест. гос. ун-т; под общ. ред. Н.И. Мищенчука. – Брест, 2002. – Ч. 1. – С. 10 – 13.

40. Бараноўская, Л.Г. Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя: аўтарэф. ... дыс. канд. філал. навук: 10.01.01 / Л.Г. Бараноўская; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2005. – 22 с.

41. Бараноўская, Л.Г Мастацкая анімалістыка ў школьным вывучэнні / Л.Г. Бараноўская // Акадэмік М.А. Лазарук і праблемы літаратурнай адукацыі ў Беларусі: матэрыялы рэсп. мемар. навук. чытанняў "Навук.-пед. і літаратуразнаўчая спадчына акад. М.А. Лазарука", Мінск, 4 кастр. 2001 г. / Нац. ін-т адукацыі; рэдкал.: А.І. Бельскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 128 – 134.

42. Бараноўская, Л. Міфалагічны анімалізм як сродак мастацкага пазнання свету / Л. Бараноўская // Пятыя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу: матэрыялы навук. канф.: у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т; рэд. кал.: А.А. Станкевіч (адк. сакр.) [і інш.]. – Гомель, 2001. – Ч. 2: Фальклор. Мастацкая літаратура. Методыка выкладання літаратуры. – С. 21 – 23.

43. Бараноўская, Л. Міфапаэтычныя вытокі беларускай літаратурнай анімалістыкі / Л. Бараноўская // У ракурсе сучаснага асэнсавання: міжкафед. зб. навук.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прац. / рэдкал.: А.М. Макарэвіч [і інш.]. – Магілёў: Магілёўс. дзярж. ун-т ім. А.А. Куляшова, 2004. – Вып. 2. – С. 53 – 60.

44. Бараноўская, Л. Пазнанне цэльнасці асобы праз трансфармацыю анімалістычных вобразаў / Л. Бараноўская // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: матэрыялы V Міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю Беларус. дзярж. ун-та, Мінск, 16 – 18 кастр. 2001 г.: у 3 ч. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: С.Я. Ганчарова-Грабоўская [і інш.]. – Мінск, 2001. – Ч. 2. – С. 144 – 149.

45. Бараноўская, Л.Г. Поруч з чалавекам: сістэма анімалістычных вобразаў у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя / Л.Г. Бараноўская // Роднае слова. – 2008. – № 3. – С 18 – 20.

46. Бараноўская, Л. Свет фауны пасля Чарнобыля ў аповесці В. Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" / Л.Г. Бараноўская // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та. – 2002. – № 1. – С. 78 – 82.

47. Бараноўская, Л. Сістэма анімалістычных вобразаў у паэзіі У. Караткевіча / Л. Бараноўская // Кулешовские чтения: тез. докл. научн.-практ. конф. "Творчество Аркадия Кулешова и ист.-культ. процесс", 7 февр. 2001 г. / Могилев. гос. ун-т; ред. совет.: Я.И. Климуть [и др.]. – Могилев: Могилевс. госуд. ун-т им. А.А. Кулешова, 2001. – С. 59 – 62.

48. Бараноўская, Л.Г. Сэнсавая аб'ёмнасць вобразаў ваўка і ваўкалака ў творчасці Янкі Купалы / Л.Г. Бараноўская // Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе: матэрыялы рэсп. навук. канф. 30 кастр. 2002 г. / Гродзен. дзярж. ун-т; пад рэд. У.І. Каялы, Т.І. Тамашэвіча. – Гродна, 2003. – С. 156 – 160.

49. Бараноўская, Л. Сэнсавая аб'ёмнасць паэмы "Одзіум" Я. Сіпакова / Л. Бараноўская // Родн. слова. – 2003. – № 12. – С. 21 – 22.

50. Бараноўская, Л.Г. Увасабленне анімалістычных вобразаў у творчасці Я. Коласа (на прыкладзе верша "На ніве") / Л.Г. Бараноўская // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навук.-практ. канф., Магілёў, 26 – 27 крас. 2007 г. / Магілёўс. дзярж. ун-т ім. А.А. Куляшова; рэд. сав. В.І. Рагаўцоў [і інш.]. – Магілёў, 2007. – С. 59 – 61.

51. Бараноўская, Л.Г. Якуб Колас як пісьменнік-анімаліст / Л.Г. Бараноўская // Каласавіны: матэрыялы навук. канф. "Праўду сэрцам правяраючы...": Погляд на творчасць Якуба Коласа на пачатку XXI ст. / Дзярж. літаратур.-мемар. музей Я. Коласа; склад.: Г.І. Зайцава, І.С. Курбека. – Мінск, 2002. – С. 44 – 47.

52. Барташэвіч, Г.А. Веснавыя абрады і песні / Г.А. Барташэвіч // Веснавыя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей; склад. муз.ч. В.І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – С. 4 – 35.

53. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча; Я. Баршчэўскі – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

54. Бахтин, М.М. Вопросы литературы и эстетики: исследования разных лет / М. Бахтин. – М.: Худож. лит., 1975. – 502 с.

55. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин; сост. С.Г. Бочаров. – 2-е изд. – М.: Искусство, 1986. – 445 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

56. Белорусская акварель / автор-составитель А.А. Беспалый. – Мінск: Беларусь. – 180 с.

57. Беларуская балада: анталогія / уклад. Я. Саламевіч. – Мінск: Маст. літ., 1978. – 512 с.

58. Беларуская міфалогія: дапам. / уклад. У.А. Васілевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. – 208 с.

59. Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / склад І. Клімковіч; навук. рэд. С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

